Г. В. ШТЫХАЎ
У. К. ПЛЯШЭВІЧ В.У. ФЯДУТА

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

5



# КАМЕННЫ ВЕК НА БЕЛАРУСІ



**Самы старажытны перыяд у развіцці чалавецтва. Прылады працы выраблялі з каменю (крэменю). На Беларусі скончыўся ў пачатку II тысячагоддзя да н. э.**

УДК 947.6(0.75.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
Ш 94

Штыхаў Г. В.
Ш94 Гісторыя Беларусі старажытных часоў: Падруч. для 5-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / Г. В. Штыхаў, У. К. Пляшэвіч, В. У. Фядута; Пад рэд. Г. В. Штыхава.— Мн.: Нар. асвета, 2001.— 174 с.: іл., карт.
ISBN 985-12-0395-5.

УДК 947.6(0.75.3)
ББК 63.3(4Беи)я721

ISBN 985-12-0395-5

© Штыхаў Г. В., Пляшэвіч У. К., Фядута В. У., 1997
© ВДП «Народная асвета», 1997
© УП «Народная асвета», 2001

## *Слова да вучняў*

Юныя сябры! Вы трымаеце ў руках падручнік «Гісторыя Беларусі старажытных часоў».

Ваша першае знаёмства з узнікненнем чалавечага грамадства ўжо адбылося пры вывучэнні гісторыі старажытнага свету. Вы знаёміліся з першымі дзяржавамі Старажытнага Усходу, антычнымі Грэцыяй і Рымам.

А што адбывалася ў далёкім мінулым на той зямлі, дзе мы з вамі жывём? Калі тут з'явіліся людзі? Як былі арганізаваны іх грамадства і праца? Якімі яны былі, як жылі? Ці мела свае асаблівасці іх жыццё на Беларусі? Узнікае шмат пытанняў.

Гісторыя Беларусі — навука, якая даследуе развіццё чалавечага грамадства на тэрыторыі сучаснай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Вывучайце, ведайце гісторыю Беларусі! Без гэтага немагчыма быць патрыётам сваёй Радзімы.

Пачынаючы з гэтага падручніка, вы крок за крокам будзеце спасцігаць старонкі айчыннай гісторыі. Жадаем вам поспехаў у цікавай высакароднай справе ў 21-м стагоддзі!

## *Асаблівасці падручніка*

Крыніцамі для напісання гісторыі Беларусі старажытных часоў з'яўляюцца розныя даныя (археалагічныя, этнаграфічныя, міфалагічныя). Іх знаходзяць і вывучаюць навукоўцы.

У падручніку разглядаюцца найбольш важныя падзеі. Гэта першыя спробы пранікнення чалавека на тэрыторыю Беларусі ў ледавіковы перыяд. Паступовае ўдасканаленне прылад працы, развіццё гаспадаркі. Утварэнне родавай абшчыны. Змяненні ў побыце людзей, звычаях і абрадах на беларускіх землях у старажытныя часы. З'яўленне славян. Народныя вераванні і святы. Вусная народная творчасць і мастацтва.

Падручнік падзяляецца на раздзелы, тэмы і параграфы. Кожны параграф пачынаецца з пытанняў для паўтарэння, звароту да ўжо вывучанага.

Параграфы падзелены загалоўкамі на невялікія часткі — пункты. Яны абазначаны літарамі А, Б, В, Г... У параграфах некаторыя пункты дадаткова адзначаны зорачкай. Гэты матэрыял выкарыстоўваецца вучнямі па прапанове настаўніка.

У гістарычнай навуцы ёсць свае паняцці. Гэта агульныя думкі аб з'явах, рэчах. Напрыклад, *родавая абшчына, каменная сякера* і інш. Новыя гістарычныя паняцці, даты, усё тое, на што неабходна звярнуць увагу, выдзелена ў тэксце асобным чорным шрыфтам або курсівам (нахіленымі літарамі).

У канцы параграфа змешчаны пытанні і заданні. Уважліва папрацуйце з імі. Падрыхтуйце свае адказы. Некаторыя пытанні носяць краязнаўчы характар. Можа стацца, што яны абудзяць вашу цікаўнасць да гісторыі роднага краю. Значна дапамогуць вам схемы, малюнкі, карты, фотаздымкі.

Спадзяёмся, што кожны з вас імкнецца атрымаць па гісторыі Беларусі старажытных часоў трывалыя веды. Аднак не ў кожнага гэта атрымліваецца. Парады, як пераадолець цяжкасці, што, магчыма, узнікнуць у час працы з падручнікам, вы знойдзеце ў памятцы «Як вывучаць гісторыю».

Звярніце ўвагу на спіс літаратуры для пазакласнага чытання. З названых кніг вы даведаецеся шмат цікавага і карыснага. Аднак узнікае пытанне: дзе знайсці гэтыя кнігі? Не заўсёды яны ёсць у бібліятэцы. Некаторыя кнігі сталі, як кажуць, бібліяграфічнай рэдкасцю. Але гэтай бядзе можна даць рады.

У падручніку змешчаны «Матэрыял для чытання». Гэта ўрыўкі з найбольш цікавых апавяданняў навукоўцаў і пісьменнікаў. Каля загалоўка пастаўлены нумар параграфа, да якога можна аднесці гэтыя апавяданні. Настаўнік заўсёды параіць, што вам прачытаць.

У падручніку вы знойдзеце таксама «Матэрыял для арганізацыі пазакласнай работы». Ён прызначаны для тых, хто будзе ўдзельнічаць у пазакласнай рабоце, у конкурсах-віктарынах, ранішніках і іншых мерапрыемствах.

Застаецца пажадаць, каб нашы прапановы дапамаглі вам наблізіцца да вучнёўскай мары — атрымаць выдатную адзнаку за веды па гісторыі Айчыны.

### *Як вывучаць гісторыю*

#### А. Як працаваць з падручнікам

Школьны падручнік — адна з галоўных крыніц ведаў для вучняў. Тут змешчаны асноўны матэрыял праграмы. Праца з падручнікам забяспечвае дасканаласць і канкрэтнасць ведаў, прывівае навыкі самаадукацыі.

**1.** Перш чым пачаць працаваць з падручнікам, пазнаёмцеся з ім. Даведайцеся па зместу, якія раздзелы ці часткі ёсць у ім, у якой паслядоўнасці яны размешчаны. Падручнік мае два вялікія раздзелы, кожны з якіх падзелены на дзве тэмы, а тэмы — на параграфы.

**2.** Звярніце ўвагу на табліцы, ілюстрацыі, схемы, паўтаральна-абагульняючыя пытанні, заданні для самастойнай работы, тлумачэнне новых па-



**Неандэртальцы — першыя людзі, якія пранiклi на тэрыторыю Беларусі ў каменным веку**

няццяў, фармуліроўкі, вывады. Памятайце, што пытанні мэтанакіроўваюць вас на галоўнае. Асноўныя вывады і тлумачэнні, якія трэба добра ведаць, выдзелены ў тэксце дадаткова тлустым (чорным) шрыфтам або светлым курсівам.

**3.** Падручнік не варта чытаць толькі з мэтай запамінання матэрыялу. На ўроку падручнік заўсёды знаходзіцца на парце.

**4.** Працаваць пажадана творча. Па прапанове настаўніка можна самастойна вывучаць асобныя тэмы, параграфы, пункты. Неабходна знайсці адказы на пастаўленыя пытанні, выпісаць фармуліроўкі, вывады, запоўніць табліцу, скласці план, зрабіць выпіскі.

**5.** Навучыцеся выкарыстоўваць усе віды ілюстрацый і схем. З іх дапамогай магчыма паўтарэнне матэрыялу без дадатковага чытання тэксту, пераказ яго зместу.

**Б. Як працаваць з параграфам**

**1.** Прачытайце ўвесь параграф, каб мець агульнае ўяўленне аб апісаных у ім падзеях. Уважліва разгледзьце карты, схемы, іншыя ілюстрацыі.

**2.** Звярніце ўвагу на тое, што выдзелена чорным шрыфтам або светлым курсівам. Гэта асноўныя факты, вывады, даты.

**3.** Складзіце разгорнуты план параграфа. Ён аблегчыць падрыхтоўку дамашняга задання.

**4.** Звяжыце з матэрыялам параграфа тое, што вы пачулі і ўбачылі на ўроку, што занатавана ў сшытку.

**5.** Успомніце, што вы чыталі па вывучаемай тэме, што бачылі ў музеі.

**6.** Калі ёсць патрэба, звярніцеся да параграфаў, якія вывучалі раней.

**7.** Калі што-небудзь незразумела або пытанне асабліва зацікавіла вас, звярніцеся да слоўніка, энцыклапедыі і іншых даведнікаў.

**8.** Праверце, ці ведаеце вы матэрыял тэмы. Перакажыце яго, спачатку карыстаючыся планам, а потым без яго.

### В. Як скласці план

**1.** Уважліва прагледзьце тэкст.

**2.** Падзяліце тэкст на часткі, закончаныя па сэнсу, вызначце ў кожнай з іх галоўную думку.

**3.** Дайце часткам загалоўкі. У загалоўках паспрабуйце перадаць галоўную думку.

**4.** У кожнай частцы вылучыце некалькі меркаванняў, якія развіваюць галоўную думку.

**5.** Упэўніцеся, ці ёсць сувязь паміж кожным наступным пунктам і папярэднім, ці звязаны яны па сэнсу.

**6.** Праверце, ці ўсе асноўныя ідэі, выкладзеныя ў тэксце, знайшлі адлюстраванне ў плане.

**7.** У заключэнне праверце, ці можна, карыстаючыся складзеным планам, раскрыць асноўны змест усяго тэксту.

### Г. Як рыхтаваць урок

**1.** Перш за ўсё неабходна набыць трывалыя веды, гэта значыць добра зразумець новы матэрыял, у строгім парадку размясціць яго ў сваёй памяці. Даты запамінайце з дапамогай «стужкі часу», а гістарычныя і геаграфічныя мясціны — па карце.

**2.** Рыхтуючы ўрок, не забывайце, што вы павінны не толькі зразумець і запомніць матэрыял, але і быць гатовым да адказу. Таму прагледзьце кантрольныя пытанні і прадумайце свой адказ. Ён павінен складацца з асноўнага палажэння (тэзіса, меркавання), фактаў і вывадаў. Лепш скласці план адказу на кожнае пытанне.

**3.** Будзьце ўважлівымі да пытанняў настаўніка. На пытанне: «Хто такія...?» — адказ павінен быць кароткім. На пытанне: «Чаму...?» — патрэбен разгорнуты адказ. Калі вас запытаюць: «Раскажыце пра...» — то ў гэтым выпадку неабходны пераказ усяго матэрыялу па тэме.

**4.** Калі ў вас добрая зрокавая памяць, то запамінаць матэрыял можна, карыстаючыся малюнкамі, выявамі. Аднаўляючы ў памяці вобразы, перадавай-

це вучэбны тэкст сваімі словамі. Не трэба імкнуцца да даслоўнага ўспаміну тэксту падручніка.

**5.** Здараецца, што добраму замацаванню матэрыялу перашкаджае збяднеласць мовы. Тады, як кажуць, «не хапае слоў». У такіх выпадках неабходна паступова павялічваць слоўнікавы запас, больш чытаць, рабіць запісы тлумачэнняў настаўніка, падбіраць да слоў сінонімы (блізкія па значэнню словы).



Раз'юшаная слонападобная жывёла — мамант. Выкапнёвыя маманты знойдзены ў розных раёнах Беларусі

6. Рыхтуючы ўрок, бярыце за прыклад лепшыя адказы. Лепшым прыкладам з'яўляецца расказ настаўніка. Сачыце не толькі за тым, што ён гаворыць, але і як ён гэта робіць, за пабудовай і выразнасцю яго мовы.

7. Да адказу будзьце гатовы заўсёды. Не спадзявайцеся, што на ўроку могуць не выклікаць.

### Д. Як вывучаць развіццё гаспадаркі

Неабходна звярнуць увагу на найбольш важныя пытанні тэмы:

1. Якія былі асноўныя заняткі людзей?
2. Якія выкарыстоўваліся прылады працы? Як яны прыводзіліся ў рух?
3. Якімі былі вынікі працы: а) па памерах; б) каму належалі; в) хто працаваў; г) ці існаваў падзел працы?
4. З якой мэтай вялася гаспадарка: а) для патрэбы калектыву; б) для асабістай патрэбы; в) для абмену?

### Е. Як вывучаць развіццё духоўнай культуры

Трэба ўмець адказваць на пытанні:

1. Якія былі народныя вераванні, святкаванні, абрадавыя песні?
2. Якія існавалі бытавыя звычаі і абрады: радзінныя (хрэсьбінныя), вясельныя, пахавальныя?
3. Якім было мастацтва: а) стварэнне аб'ёмнага вобраза (скульптура); б) арнамент; в) аздобы для адзення; г) музычныя інструменты?
4. Якія існавалі міфы: а) пра навакольны свет; б) пра Перуна; в) пра фантастычных істот?
5. Якія элементы старажытнай духоўнай культуры захаваліся ў вашым краі?

# УВОДЗІНЫ

*Успомніце: 1. Што азначае слова «гісторыя»? 2. Што вывучае гісторыя старажытнага часу? 3. Што азначае слова «археалогія»?*

**А. Помнікі далёкай мінуўшчыны.** Ці ведаеце вы, што такое помнік? Вы не памыліцеся, калі скажаце, што гэта скульптура, аб'ёмны вобраз з каменю, металу, дрэва ці іншага матэрыялу. Напрыклад, помнік Янку Купалу.

Але паняцце *помнік* мае яшчэ другое значэнне. Гэта ўсялякі старажытны прадмет (рэч), які захаваўся, дайшоў да нас. Старажытныя рукапісы называюць *помнікамі пісьменнасці*. Існуе шмат іншых помнікаў.

Звычайна ў кожным музеі можна ўбачыць каменную сякеру. Адны сякеры бываюць у выглядзе кліна, другія — маюць прасвідраваную адтуліну для больш зручнага прымацавання да ручкі.

Здараецца, каменныя сякеры знаходзяць на полі, і школьнікі прыносяць іх у школу. Так аднойчы было на Гомельшчыне.

Вучні разглядалі сякеру, якая дайшла да нас з каменнага веку. Раптам пачуўся чыйсьці голас:

— Камень як камень! Што ў ім цікавае?

— А хоць бы тое, што гэта сякера — адна з вельмі старажытных прылад, зробленых чалавекам,— адказаў настаўнік.

Гэта не проста сякера. Гэта адзіны след, які пакінуў пасля сябе наш далёкі-далёкі продак. Дык хіба ж не цікава даведацца пра тое, як жыў наш продак? Калі ён з'явіўся ў нашым краі? Як здабываў сабе ежу? Дзе хаваўся ад снегу і дажджоў? Як і чаму чалавек мог выстаяць супраць іклоў і кіпцюроў усяго звярынага свету?

А хто пра гэта паведаміць?

Ды вось такія старажытныя рэчы. Яны захоўваюцца ў музеях. Краязнаўчыя музеі, якія вывучаюць гісторыю і прыроду роднага краю, ёсць у кожным горадзе нашай краіны.




Каменныя прылады працы: *а)* сякера; *б)* долата

Усялякі след, пакінуты чалавекам, няхай гэта будзе каменная сякера, гліняны гаршчок, попел ці вуголле, што засталося на месцы колішняга паселішча, лічыцца *гістарычным*, ці *археалагічным*, *помнікам*, бо ён захоўвае памяць аб мінулым.

**Б. Як гістарычныя помнікі апынуліся ў зямлі.** Зямля, па якой мы ходзім, захоўвае незлічоную колькасць помнікаў сівой мінуўшчыны. Для вучоных яны з'яўляюцца каштоўнейшымі гістарычнымі крыніцамі.

На тым месцы, дзе жывуць людзі, утвараюцца наслаенні зямлі. Вось, напрыклад, у старажытным паселішчы збудавалі новае жыллё. Пакуль будавалі, усё вакол засыпалі трэскамі. А на вясну ўжо нічога каля жылля не відаць — усё ў гразь затапталася.

Здарылася бяда — згарэла хата ці ўсё паселішча. Але ў попеле засталося сёе-тое: каменныя вырабы, прылады і ўпрыгажэнні з косці — тое, што агонь не ўзяў. Міне час, і ніхто не пазнае, што тут было жыллё. Даследаваць яго можа толькі вучоны-археолаг.

Рэчы часоў першабытнага грамадства можна

знайсці на старажытнай стаянцы. Наслаенні зямлі, якія ўтварыліся на паселішчы, вучоныя называюць ***культурным слоем.*** Ён утрымлівае рэшткі былой культурнай дзейнасці чалавека. Вядома, чым больш жылі людзі на адным месцы, тым слой быў таўсцейшы. Ён нават дасягаў некалькіх метраў.

Вывучаючы культурны слой, археолагі як бы гартаюць старонку за старонкай своеасаблівую кнігу, у якой расказваецца, як жылі і працавалі, ваявалі і гандлявалі нашы продкі.

Важнымі сведкамі мінулага з'яўляюцца старажытныя пахаванні. Яны рабіліся ў курганах (магільных пагорках) або проста ў ямах, выкапаных у зямлі.



**Культурны слой і яго расчыстка ў час археалагічных даследаванняў**

У старажытныя часы людзі верылі, што чалавек пасля смерці працягвае жыць — харчуецца, ходзіць, палюе. У магілу клалі розныя прадметы, якія маглі спатрэбіцца: зброю, упрыгажэнні, нават ежу ў гаршках. Раскопкі пахаванняў даюць шмат каштоўных археалагічных матэрыялаў, дапамагаюць вывучаць вераванні і звычаі нашых продкаў.

Кожнае лета ў розныя куткі Беларусі выязджаюць вучоныя-археолагі. Яны знаходзяць і даследуюць старажытныя помнікі на берагах рэк, у балотах, лясных гушчарах. І ўсюды, куды б ні трапіў археолаг, ён знаходзіць верных сяброў і памочнікаў — вучняў мясцовых школ.

*** В. З якой мэтай этнографы вывучаюць культурна адсталыя народы.** *Этнаграфія* (народазнаўства) апісвае жыццё розных народаў, іх матэрыяльную і духоўную культуру ад старажытнасці да нашых дзён.

Пад паняццем *матэрыяльная культура* разумеюць прылады працы, жыллё, адзенне, ежу і многае іншае. *Духоўная культура* — гэта вераванні, звычаі, абрады, погляды, сямейны побыт, вусна-паэтычная творчасць і інш.

Археалогія і этнаграфія — роднасныя гістарычныя навукі. Этнографы часта звяртаюцца да археалагічных матэрыялаў, а археолагі — да даных этнаграфіі або этналогіі (навукі, якая вывучае паходжанне народаў).

Вы ўжо ведаеце, што чалавецтва праходзіла ў сваім развіцці *каменны, бронзавы* і *жалезны* вякі. Аднак адбывалася гэта ў розных месцах не адначасова. Мяркуйце самі. На Старажытным Усходзе каменны век скончыўся каля 4 тыс. гадоў да н. э., а ў лясах Усходняй Еўропы, дзе знаходзіцца Беларусь, каля 2 тыс. гадоў да н. э.

У Аўстраліі, некаторых раёнах Афрыкі і Амерыкі амаль да нашага часу існавалі культурна адсталыя плямёны. Некаторыя дагэтуль жывуць (ці яшчэ нядаўна жылі), як першабытныя людзі.

Вучоныя вывучалі такія плямёны, падоўгу жылі сярод іх, рабілі падрабязныя запісы ў дзённікі.

Гэтак збіраліся матэрыялы па гісторыі старажытнага грамадства.

Рускі вучоны ***Міклуха-Маклай*** ажыццявіў шэраг падарожжаў у Новую Гвінею і Аўстралію. Ён некалькі гадоў жыў сярод карэннага насельніцтва — ***папуасаў.***

Вось як апісвае сваю першую сустрэчу з папуасамі Міклуха-Маклай у 1871 г.:

> «Пакуль мы стаялі сярод пляцоўкі, з-за дрэў і кустоў пачалі паказвацца дзікуны... У многіх на плячы вісела каменная сякера, а некаторыя трымалі ў руках лук значных памераў, амаль што ў рост чалавека, і стрэлы, большыя за метр даўжынёй... Не ўмеючы здабываць агонь, туземцы (папуасы) бяруць з дому запаленыя галавешкі, асабліва накіроўваючыся ў далёкія экскурсіі».

*(Адкажыце на пытанні: якія прыметы жыцця першабытных людзей тут назіраюцца? Чаму папуасаў больш правільна аднесці да культурна адсталых народаў, чым да першабытных людзей?)*

Вывучэнне побыту культурна адсталых народаў дапамагае вучоным *асэнсаваць і ўявіць тое, як жылі нашы продкі* пры першабытнаабшчынным ладзе многія тысячагоддзі назад.

**Г. Правілы вывучэння гісторыі.** Гісторыя Беларусі старажытных часоў ахоплівае дзесяткі тысяч гадоў існавання нашых продкаў. Гэта вялікая колькасць падзей — значных з'яў у жыцці чалавека.

Гістарычная навука прызвана адказваць на чатыры асноўныя пытанні: ***што*** адбылося (якая падзея была)? ***Дзе*** адбылося? ***Калі*** адбылося? ***Чаму*** адбылося?

Адсюль вынікае чатыры правілы вывучэння гісторыі.

*Правіла першае.* Што? Усякая гістарычная падзея мае сваю назву (напрыклад, каменны век). Неабходна імкнуцца зразумець назву, запомніць і ўмець яе растлумачыць. Гістарычныя веды не могуць быць безыменнымі.

*Правіла другое.* Дзе? Кожная гістарычная падзея мае месца свайго ўзнікнення і межы распаўсю-

джання. Іх неабходна ведаць, каб не блукаць у прасторы.

*Правіла трэцяе.* Калі? Любая гістарычная падзея мае час свайго ўзнікнення, можа мець перыяд існавання. Усё гэта вызначаецца датамі. Цвёрда запомніць асноўныя даты вельмі неабходна, інакш можна згубіць арыенцір у часе.

*Правіла чацвёртае.* Чаму? У гісторыі не бывае падзей, якія б не мелі вынікаў. Вывучэнне падзей прыводзіць да разумення іх вынікаў.

Каб больш грунтоўна зразумець гэта, неабходна авалодаць курсам «Гісторыя Беларусі старажытных часоў». Кніга знаходзіцца ў вашых руках. Чытайце і вывучайце яе.

**Д. Датаванне падзей.** Гістарычная навука немагчыма без выкарыстання дат. *Дата* (датаванне) — гэта час, калі адбылася падзея. ***(Падумайце, як трэба разумець дату 26 тыс. гадоў назад.)***

Вы ўжо ведаеце, што сучасная сістэма летазлі-



Дапытлівыя вучні разглядаюць пасудзіну, якую знайшлі ў час археалагічных раскопак каля в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна на Віцебшчыне

чэння заснавана на паняцці *наша эра*. У ёй за пачатак адліку ўзята «нараджэнне Хрыстова» (1-ы год н. э.).

Тыя падзеі, якія адбываліся раней «нараджэння Хрыстова», былі *да нашай эры* (да н. э.). Цяпер наша эра налічвае ўжо 2 тыс. гадоў. Адсюль вынікае, што 26 тыс. гадоў назад (ад нашых дзён) адпавядае часу 24 тыс. гадоў да н. э.

Людзі навучыліся здабываць жалеза. Адбывалася разлажэнне першабытнаабшчынных адносін

Паяўляюцца вырабы з бронзы. У родзе і сям'і пануючае становішча належыць мужчыну

Існаваў першабытнаабшчынны лад. Каменны век пачаўся са з'яўленнем чалавека і закончыўся, калі чалавек стаў карыстацца металічнымі прыладамі




Стужка часу «Тры вякі на Беларусі»

У падручніку, які ляжыць перад вамі, даты каменнага веку прыблізныя і даюцца ад нашых дзён назад. Але тое, што адбывалася ў бронзавым і жалезным вяках, патрабуе больш дакладнага датавання з улікам паняцця *да нашай эры*. Напрыклад, 4 тыс. гадоў назад закончыўся каменны век на тэрыторыі Беларусі. Значыць, гэта было 4 тыс.— —2 тыс.=2 тыс. гадоў да н. э.

**Гістарычная даведка.** Вывучаючы гісторыю Беларусі старажытных часоў, мы падзяляем яе на тры вякі — каменны, бронзавы і жалезны. Гэтыя вякі павінны былі замяняць адзін аднаго ў пэўным парадку. Нашы продкі не сталі б выкарыстоўваць камень для вырабу прылад працы, калі б яны мелі бронзу. У сваю чаргу бронза саступіла месца жалезу. Гэту гістарычную паслядоўнасць вучоныя называюць «сістэмай трох вякоў». Яна была прапанавана ў сярэдзіне XIX стагоддзя пасля вывучэння ў музеях шматлікіх старажытных прылад працы. Сістэма трох вякоў была значным крокам уперад ў даследаванні старажытнага грамадства. Яна дагэтуль выкарыстоўваецца ў гістарычнай навуцы многіх краін.

**Пытанні і заданні**

1. Чаму старажытныя рэчы называюць археалагічнымі помнікамі? 2. Як утвараецца культурны слой на паселішчах?* 3. З якой мэтай этнографы вывучаюць культурна адсталыя народы? 4. На якія чатыры асноўныя пытанні адказвае гісторыя? 5. Выпішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: *культурны слой, папуасы.*

Раздзел I

# КАМЕННЫ ВЕК НА БЕЛАРУСІ
## (100—2 тыс. гадоў да н. э.)





## Тэма 1. ГЭТА БЫЛО Ў КАМЕННЫМ ВЕКУ

### § 1. ЧАЛАВЕК У ЛЕДАВІКОВЫ ПЕРЫЯД

*Успомніце: 1. Што такое ледавік? 2. Як ледавіковы перыяд адбіўся на жыцці старажытных людзей? 3. Якім быў клімат Беларусі ў час абледзянення Зямлі? (Для адказу выкарыстоўвайце веды, назапашаныя пры вывучэнні ў 4-м класе курса «Мая Радзіма — Беларусь» і ў 5-м класе «Гісторыя старажытнага свету».)*

**А. Абледзяненне Зямлі.** На працягу існавання Зямлі перыядычна адбываліся пахаладанні, утвараліся ***ледавікі.*** Таўшчыня лёду на поўначы Усходне-Еўрапейскай раўніны, уключаючы Беларусь, дасягала 2 кіламетраў.

Разрастанні ледавіка змяняліся яго адступленнямі. На абшары, з якога сходзілі ледавікі, утвараліся азёры, аднаўляліся рэкі.

На ледавіковых адкладах выраставі бярозавыя, асінавыя і яловыя лясы. Тут пасвіліся жывёлы. Яны прыстасоўваліся да халоднага клімату, які паступова цяплеў.

Але потым, праз шмат гадоў, з новым наступленнем ледавіка пачыналася новае пахаладанне. Зноў змяняўся раслінны і жывёльны свет. Здаралася, што холад і вечная мерзлата ахоплівалі нават поўдзень Беларусі.

Ледавікі, што рухаліся са Скандынавіі, зрывалі і раструшчвалі велічэзныя абломкі скал. Яны неслі з сабой камяні, жвір, пясок і гліну на тэрыторыю сучаснай Беларусі.

**Геаграфічная даведка.** Паняцце тэрыторыя азначае прастору зямлі з пэўнымі граніцамі (межамі). Тэрыторыя Беларусі размешчана на захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны і працягваецца з поўначы на поўдзень на 560 кіламетраў, з захаду на ўсход — на 650 кіламетраў.

**Сведчанне вучонага.** На думку большасці спецыялістаў, на працягу апошняга мільёна гадоў пяць разоў суровыя ледавіковыя эпохі змяняліся цёплымі міжледавіковымі перыядамі... Аднойчы здарылася так, што халодны панцыр ледавіка

сваім буйным языком ледзь не дасягнуў Чорнага мора. Тады пад лёдам апынулася ўся тэрыторыя Беларусі. У астатніх выпадках ледавікі спыняліся на нашай зямлі.

**Б. Пранікненне людзей.** Першая спроба чалавека пранікнуць на тэрыторыю Беларусі датуецца перыядам **100—35 тыс. гадоў назад.** Тады чалавек мог рабіць прылады працы з крэменю і карыстацца імі.

***Крэмень***, як усялякі камень, належыць да карысных выкапняў. У Беларусі ёсць радовішчы крэменю. Крэмень лёгка расшчапляецца на вострыя кавалкі. Адшчэпы выкарыстоўваліся першабытным чалавекам для вырабу прылад працы.

Каля вёскі *Абідавічы* Быхаўскага раёна на Магілёўшчыне пад абрывам берага Дняпра вучонымі быў знойдзены масіўны адшчэп крэменю, апрацаваны рукой чалавека. Адшчэп мог выкарыстоўвацца як скрэбла. ***Скрэбла*** — каменная прылада працы для апрацоўкі шкур.

Другое скрэбла раней было знойдзена каля вёскі *Свяцілавічы* Веткаўскага раёна на Гомельшчыне. Недзе паблізу гэтых месцаў часова пабывалі першабытныя людзі. А потым яны рухаліся некуды далей.

Гісторыкі лічаць, што чалавек стаў пранікаць на беларускія землі з поўдня. У той час ён асвоіў некаторыя землі ў Прыкарпацці.

Людзей тых далёкіх часоў называюць *неандэртальцамі*. Такую назву яны атрымалі ад даліны Неандэрталь у Германіі, дзе былі выяўлены ўпершыню рэшткі іх шкілетаў. Ёсць таксама назва «чалавек разумны».



Апрацоўка крэменю, скалванне ад яго пласцінак




Найстаражытнейшыя крамянёвыя прылады, якія знойдзены на Беларусі: *а)* скрэбла з Абідавіч; *б)* скрабок са Свяцілавіч; *в)* востраканечнік з Бердыжа

Неандэртальцы былі невысокімі каржакаватымі людзьмі з добра развітой мускулатурай. Яны былі моцнымі, дужымі і вынослівымі. Першымі з людзей прыстасаваліся да жыцця ў вельмі халодным клімаце.

**В. Прылады працы.** У канцы ледавіковага перыяду звычайнай прыладай працы былі ***востраканечнікі.*** Іх рабілі з кавалкаў крэменю. Адзін канец быў старанна завостраны. Процілеглы тупы канец служыў як бы ручкай.

Востраканечнікам можна было лягчэй пракалоць і разрэзаць тоўстую шкуру жывёлы. Ім можна было свідраваць адтуліны ў костках і драўніне.

Часам востраканечнікі прымацоўвалі да палкі з дапамогай сухажылляў і смалы. Атрымліваліся прымітыўныя *дзіды* (коп'і).

Першабытныя людзі выкарыстоўвалі таксама ***скрабок*** з вострым краем. Скрабком апрацоўвалі шкуру жывёл. Па памерах ён меншы, чым скрэбла.

У той час сустракаліся прылады працы з дрэва і костак. Гэта былі *драўляныя дубіны* — палкі з патаўшчэннем на канцы. Такія прылады працы (даў-

бешкі) рабіліся і з костак буйных жывёл. «Чалавек разумны» мог вырабляць шмат розных прылад працы.

Гэта дазваляла яму выжыць у суровых умовах прыледавіковай, амаль бязлеснай, зоны.

---

*Старажытныя людзі карысталіся найбольш часта каменнымі прыладамі працы — скрэбламі, вастраканечнікамі, скрабкамі і інш. Таму час, калі гэта адбывалася, называецца **каменным векам**.*

**Пытанні і заданні**

1. Якім было прыроднае асяроддзе ў час апошняга абледзянення? 2. Разгледзьце малюнкі, змешчаныя ў гэтым падручніку, і апішыце аблічча неандэртальца. Чым ён адрозніваўся ад чалавекападобных малпаў і ад чалавека сучаснага тыпу? (Пры гэтым выкарыстайце веды, набытыя вамі па курсу «Гісторыя старажытнага свету».) 3. Пакажыце на карце, дзе былі знойдзены найбольш старажытныя прылады працы неандэртальца на Беларусі. 4. Назавіце асноўную сыравіну для вырабу прылад працы, якую выкарыстоўвалі першыя насельнікі Беларусі. 5. Назавіце прылады першых наведвальнікаў беларускіх зямель. 6. Дайце тлумачэнне паняццю *каменны век*. 7. Параўнайце вядомыя вам па падручніку «Гісторыя старажытнага свету» самыя першыя ў свеце прылады з тымі, якія змешчаны на малюнках у падручніку «Гісторыя Беларусі старажытных часоў». Чым гэтыя прылады адрозніваюцца паміж сабой? Аб чым сведчаць гэтыя адрозненні? 8. Запішыце і растлумачце дату: **100—35 тыс. гадоў назад**. 9. Запішыце і растлумачце паняцці: *ледавік, неандэрталец, крэмень, вастраканечнік, скрабок.*

## § 2. ПЕРШЫЯ СТАЯНКІ ЛЮДЗЕЙ І ІХ ПОБЫТ

*Успомніце з курса сусветнай гісторыі: 1. Што вы ведаеце пра паходжанне чалавека? 2. Хто такія неандэртальцы?*

**А. «Новыя людзі».** Вучоныя лічаць, што сучасныя (новыя) людзі з'явіліся ў Паўднёвай Афрыцы. Нашчадкі новых людзей прыкладна **35 тыс. гадоў назад** перасяліліся ў Еўропу і выцеснілі неандэртальцаў, якія зніклі зусім. У Францыі рэшткі нова-



Жыллё першабытнага чалавека

га чалавека знайшлі ў пячоры Кра-Маньён. Адсюль, як вы ўжо ведаеце, назва ***краманьёнец.*** Яго называюць таксама «чалавек разумны разумны».

Новыя людзі былі першымі людзьмі на Зямлі, якія мелі тую ж форму чэрапа і ўсяго цела, як і сучасны чалавек. Новыя людзі — нашы непасрэдныя продкі. Яны пачалі рассяляцца на поўдні Беларусі яшчэ ў ледавіковы перыяд.

**Б. Паселішчы і жыллё.** Чалавек навучыўся прыстасоўвацца да суровых умоў ледавіковай эпохі.

Для пасялення краманьёнец выбіраў узвышаныя і цяжкадаступныя мясціны. Тагачаснага чалавека прываблівала блізкасць вады, багацце жывёльнага свету, сухі грунт для жылля. Яго цікавіла зручная для палявання мясцовасць.

Паселішчы людзей размяшчаліся пераважна на берагах буйных рэк — *Прыпяці, Дняпра, Сожа.* Месца пасялення першабытнага чалавека называюць ***стаянкай.***

Доўгі час гісторыкі не ведалі, як выглядала самае старажытнае жыллё, зробленае рукамі чалавека. Панавала думка, што ўсе старажытныя людзі жылі ў пячорах. Гэта не зусім так. На раўнінах няма ніякіх пячор. Тут людзям трэба было самім клапаціцца пра жыллё.

Цяпер рэшткі старажытнага жылля знойдзены на многіх стаянках у Еўропе і Азіі. На Беларусі такіх стаянак дзве.

Самая старажытная стаянка чалавека каменнага веку знаходзіцца на Прыпяці каля вёскі *Юравічы* Калінкавіцкага раёна на Гомельшчыне. Яна існавала **26 тыс. гадоў назад.**

У той час уся навакольная тэрыторыя была амаль бязлеснай. Таму тагачасныя людзі пры пабудове жылля выкарыстоўвалі буйныя косткі мамантаў, іх чэрапы, іклы.

У сярэдзіне жылля знаходзілася вогнішча, дзе гарэў агонь. Яно абкладвалася камянямі. Вогнішчы размяшчаліся і знадворку.

Другая стаянка адкрыта на беразе Сожа каля вёскі *Бердыж* Чачэрскага раёна. *(Знайдзіце дзве стаянкі на карце.)* У Бердыжы выяўлены рэшткі




Крамянёвыя прылады працы з Бердыжа: *а), б)* нажы; *в)* скрабок

двух паглыбленых у зямлю жыллёвых памяшканняў. Іх форма авальная, пасярэдзіне раскладвалася вогнішча. Жыллё належала родавай абшчыне.

Ніжнія часткі жылля людзі ўмацоўвалі чэрапамі і іншымі буйнымі косткамі жывёл. Жыллё пакрывалася шкурамі жывёл. Яно было падобнае на будан (шалаш). На Бердыжскай стаянцы людзі жылі **23 тыс. гадоў назад.**

**В. Побыт жыхароў.** Удасканаленне прылад працы спрыяла стварэнню запасаў ежы. Чалавек меў магчымасць больш працяглы час знаходзіцца на адным месцы. Умовы яго штодзённага жыцця паляпшаліся.

Чалавек сам навучыўся здабываць агонь. Мы ўжо ведаем адзін спосаб. Гэта з дапамогай трэння аднаго кавалка сухога дрэва аб другі. Агонь навучыліся атрымліваць таксама, ужываючы свідраванне. Людзі самі вынаходзілі разнастайныя спосабы выкарыстання агню.

Крок за крокам змяняліся ўмовы жыцця старажытнага жыхара Беларусі. Яму стала жыць крыху лепш, чым першым яе насельнікам. Калі раней да саракагадовага ўзросту дажываў толькі 1 чалавек са 100, то цяпер — 12. Але большасць людзей паміралі або гінулі, не пражыўшы 20 гадоў. Занадта небяспечнае было жыццё. Людзі гінулі заўчасна ад холаду, хвароб і няшчасных выпадкаў, ад ран, нанесеных дзікімі звярамі або ворагамі.

---

*Ва ўмовах ледавіковай эпохі чалавек вымушаны быў будаваць сабе жыллё. На тэрыторыі Беларусі найбольш старажытныя стаянкі выяўлены каля вёсак Юравічы і Бердыж у Гомельскай вобласці.*

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце даты першых стаянак на Беларусі. 2. Якое значэнне для старажытных жыхароў Беларусі мела валоданне агнём? Назавіце не менш за чатыры значэнні. 3. Уявіце, што вы некалькі гадзін правялі з першабытнымі людзьмі. Што вы ўбачылі на стаянцы? Апішыце вусна вашы назіранні. 4. Што

павінен быў ведаць старажытны чалавек, каб зрабіць скрабок і карыстацца гэтай прыладай? 5. Даведайцеся, ці знойдзены ў вашых мясцінах стаянкі людзей каменнага веку. 6. Запішыце і растлумачце паняцці: *краманьёнец, стаянка.*

## § 3. ЗАНЯТКІ СТАРАЖЫТНЫХ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ

*Успомніце: 1. Якую ролю адыгрывала паляванне ў жыцці самых старажытных людзей? 2. На якіх звяроў яны палявалі?*

**А. Віды гаспадарчай дзейнасці.** Для задавальнення сваіх патрэб чалавеку былі неабходны мяса, шкуры, косткі жывёл. Дзе ж іх узяць? У прыроды, у час палявання. ***Паляванне*** — гэта пошук і праследаванне дзікіх звяроў і птушак з мэтай іх здабычы.

З набліжэннем ледавіка многія цеплалюбівыя жывёлы вымерлі. На іх месца прыйшлі шарсцістыя маманты, бізоны (падобныя на зуброў), шарсцістыя насарогі, алені, мядзведзі і інш. Нашы продкі былі ўжо тады здольнымі паляваць на гэтых буйных жывёл.

Марай паляўнічых стаў мамант. Гэта выкапнёвы слон, рэшткі якога цяпер знаходзяць у глыбокіх



Паляванне старажытных людзей на мядзведзя

пластах зямлі. Ён быў вышынёй да трох метраў і меў закругленыя іклы-біўні.

**Сведчанне вучонага.** Мамант для чалавека — крыніца вялікай колькасці смачнага мяса. З костак маманта і яго магутных іклоў будавалі жыллё, якое накрывалі шкурамі. Косткі жывёл ішлі таксама на паліва. З іх выраблялі розныя прылады працы.

На стаянках Бердыж і Юравічы на Гомельшчыне вучоныя выявілі рэшткі 18 відаў жывёл. Сярод іх мамант, паўночны алень, шарсцісты насарог, зубр, конь, мядзведзь, пясец, воўк, заяц. *(Звярніце ўвагу на малюнкі выкапнёвых звяроў у падручніку.)*

Зброяй нашаму продку служылі завостраныя палкі, камяні, драўляныя дубіны, крамянёвыя востраканечнікі.

Пазней людзі сталі ўжываць кідальную колючую зброю ў выглядзе доўгай палкі з вострым наканечнікам. Сёння яе называюць *дзідай*, ці кап'ём. Тады ж пачалі выкарыстоўваць і невялікае кап'ё — *дроцік.* З такой зброяй паляванне было магчыма пры непасрэдным сутыкненні са зверам.

Людзі займаліся ***збіральніцтвам.*** Палкамі і вострымі камянямі выкопвалі карані і клубні, якія былі прыгодныя для ежы.

Асноўны від збіральніцтва на Беларусі — нарыхтоўка лясных пладоў: ягад, грыбоў, лясных яблыкаў і груш, арэхаў, бярозавага соку.

**Б. Спосабы палявання.** Прыёмы палявання былі разнастайнымі. Месцазнаходжанне звера выяўлялі па яго слядах. Добры вынік быў зімою, асабліва на першым снезе, а летам на вільготнай зямлі. *(Растлумачце чаму.)*

Найбольш пашыранай была аблава з загонам, якая бытуе ў наш час. У мінулым загоншчыкі гналі жывёл у дрыгву і глыбокія яры са стромкімі схіламі.

Паляванне вялося вялікімі групамі людзей. Ужываўся агонь для запалохвання звяроў. Загнаўшы магутнага звера ў балота або роў, людзі дабівалі яго там камянямі і дзідамі.



Паўночныя алені, якія вадзіліся ў вялікай колькасці на Беларусі і на якіх шмат палявалі ў тыя часы

На буйных жывёл выкарыстоўвалі ямы-лавушкі, або лоўчыя ямы. Звычайна іх выкопвалі на шляху статка мамантаў і іншых жывёл да вады.

Паляванне было заснавана на веданні нораваў, звычак і паводзін звяроў. Людзі заўважылі, што алень вельмі цікаўны. Паляўнічыя пачалі прываблiваць яго надзетымі на галаву рагамі. Так робяць дагэтуль паляўнічыя паўночных народаў.

**В. Раздзяленне працы.** Ведаючы ўмовы жыцця тагачаснага чалавека, можна зрабіць наступныя высновы:

**1.** Каб выжыць, не памерці з голаду, чалавек

павінен быў займацца паляваннем. Яно было справай мужчыны. Жанчына карміла дзіцё і несла яго на спіне. У такім стане яна не магла быць добрым памочнікам мужчыну на паляванні.

**2.** Жанчына даглядала дзяцей, вяла хатнюю гаспадарку, падтрымлівала агонь у ачагу, займалася збіральніцтвам і рабіла яшчэ многае іншае.

Дзеці ўжо з трох-, чатырохгадовага ўзросту збіралі зерне, плады, дапамагалі дарослым.

Старыя людзі перадавалі маладым свой жыццёвы вопыт, захоўвалі тагачасныя звычаі і абрады.

Такім чынам, мы бачым, што ў каменным веку існавала прыроднае ***раздзяленне працы*** паводле полу (паміж мужчынамі і жанчынамі) і паводле ўзросту (паміж дарослымі, дзецьмі і старымі).

* **Г. Чарговае выпрабаванне.** Чалавека на беларускіх землях чакала чарговае выпрабаванне. Адбылося асабліва моцнае пахаладанне 22—14 тыс. гадоў назад. На працягу некалькіх тысячагоддзяў не існавала ўмоў для жыцця чалавека. Людзі адышлі ў паўднёвыя раёны. Толькі з заканчэннем ледавіковай эпохі чалавек зноў у трэці раз з'явіўся ў Беларусі.

### Пытанні і заданні

**1.** Чаму менавіта паляванне было асноўным заняткам насельніцтва Беларусі ў каменным веку? **2.** Якімі былі спосабы палявання? **3.** На якіх звяроў палявалі? **4.** Складзіце апавяданне аб паляванні першабытных людзей. Пачніце яго прыкладна так: «Аднойчы зімой, калі на стаянцы не засталося ежы, мужчыны павінны былі накіравацца на паляванне. У хуткім часе паляўнічыя заўважылі на снезе сляды...» Пры гэтым выкарыстайце словы: *дзіда, звер, яма, агонь* і інш. **5.** Як вы мяркуеце, ці патрэбна было раздзяленне працы паміж старажытнымі людзьмі? Сваю думку абгрунтуйце. **6.** Выпішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: ***паляванне, збіральніцтва, раздзяленне працы***.

# Тэма 2. ЖЫЦЦЁ Ў ПАСЛЯЛЕДАВІКОВЫ ПЕРЫЯД

## § 4. ЗАСЯЛЕННЕ БЕЛАРУСІ

*Успомніце: 1. Які ўплыў мела пацяпленне на Зямлі на жыццё людзей у Еўропе? 2. Калі людзі пачалі выкарыстоўваць дзіду і дроцік?*

**А. Аселае жыццё.** Апошні ледавік адступіў з тэрыторыі нашай краіны 15—13 тыс. гадоў назад. Паступова клімат рабіўся больш цёплым. Былая ледзяная пустыня пакрылася рэкамі і азёрамі.

Шматлікімі статкамі блукалі па дрымучых лясах зубры, туры, ласі. На зялёных лугах пасвіліся табуны дзікіх коней. У паветры лямталі чароды птушак.

Прыродныя багацці Беларусі прывабілі старажытных людзей. У трэці раз рабіў чалавек спробу рассяліцца па далінах Дняпра, Сожа, Прыпяці. Нарэшце даліны рэк былі заселены плямёнамі паляўнічых, рыбаловаў і збіральнікаў.

Паляўнічыя плямёны паступова пераходзілі да ***аселага жыцця.*** Іх паселішчы размяшчаліся на берагах рэк, азёр ці на прыбярэжных пясчаных невялікіх пагорках — дзюнах.

Стаянкі былі невялікія і існавалі непрацяглы час. Такіх стаянак вядома на Беларусі каля 100. На іх людзі будавалі драўлянае жыллё — *буданы конусападобнай формы.*

**Б. Новыя вынаходніцтвы.** Узнікла неабходнасць ва ўдасканаленых прыладах працы. Для таго каб здабыць лася або аленя ў лясной чашчобе ці забіць хуткага зайца, асцярожную птушку, патрабаваліся новыя прылады палявання.

Вельмі зручнай прыладай для гэтага стаў *лук.* Стрэлы былі драўляныя. Яны мелі *каменны наканечнік.* Страляць з лука можна было на 80—100 метраў. Старажытныя людзі смела палявалі з ім на драпежных звяроў, на ляту білі гусей, качак, чапляў і іншых птушак.




Каменны век на Беларусі: *а)* найстаражытнейшыя стаянкі; *б)* старажытныя паселішчы; *в)* напрамкі засялення Беларусі; *г)* граніца апошняга ледавіка

У канцы каменнага веку часцей ужывалася *каменная сякера.* Самыя старадаўнія сякеры былі вельмі прымітыўныя. Бралі кавалак каменю і аббівалі яго да таго часу, пакуль не атрымлівалася нешта падобнае на клін. Тупым канцом яго ўстаўлялі ў расшчэпленую палку або проста прывязвалі да яе.

Пазней выраблялі ўжо больш дасканалыя сякеры. Аббіты камень шліфавалі на каменнай пліце, на якую падсыпалі мокры пясок.

Не адной каменнай сякерай абыходзіўся тады чалавек. У яго было ўжо нямала іншых каменных прылад. Людзі ведалі зерняцёрку. ***Зерняцёрка*** — вялікі плоскі камень, на якім жанчыны невялікім каменем расціралі цвёрдыя карані і зерне, раскалвалі арэхі, драбілі косці жывёл. Клубні і карані



Каменныя сякеры, якія прымацаваны да драўляных ручак

спачатку вымочвалі ў вадзе, а затым падпякалі на агнішчы.

* **В. Распаўсюджанне стаянак.** Клімат на тэрыторыі Беларусі 6—5 тыс. гадоў назад стаў больш цёплы. Мяккія зімы і цёплыя летнія месяцы спрыялі росту шыракалістых лясоў. Жывёльны свет у той час быў амаль такі ж, як і цяпер.

У Беларусі зараз вядома больш за 600 стаянак таго часу. Нярэдка яны размяшчаліся групамі блізка адна ад адной. Памеры іх былі невялікія: некалькі паўзямлянак будавалася на ўзвышаным беразе ракі або возера. Нямала стаянак адкрыта каля *Прыпяці*. Група стаянак выяўлена ля вёскі *Камень* Пінскага раёна ў сучасным Беларускім Палессі.



Цясла, з дапамогай якой выдзёўбвалі лодкі (чаўны)



Размол зярнят на зерняцёрцы



Арнаментаваны гаршчок з вострым дном канца каменнага веку

У лясах, балотах, рэках і азёрах заўсёды было дастаткова дзічыны і рыбы. У некаторых зручных месцах жыццё працягвалася шмат гадоў. Такой была стаянка каля вёскі *Асавец* у Бешанковіцкім раёне. *(Знайдзіце гэтыя вёскі на карце.)*

**Г. З'яўленне гліняната посуду.** Выраб гліняных пасудзін на Беларусі пачаўся звыш 6 тыс. гадоў назад. Да гэтага жыхары карысталіся драўляным посудам, які быў абмазаны глінай.

Аб вырабе гліняната посуду сведчаць яго абломкі, знойдзеныя на шматлікіх стаянках канца каменнага веку. Спачатку посуд быў грубы і нетрывалы. Яго выраблялі ў кожным паселішчы. Паверхня пасудзін старанна загладжвалася. Яны пакрываліся ўзорамі (арнаментам), прасушваліся на паветры, абпальваліся на адкрытым вогнішчы.

Гаршкі таго часу мелі вострае дно. Тады людзі не ведалі яшчэ сталоў. Посуд з вострым дном добра стаяў на земляной падлозе жылля і ў вогнішчы. Ён зручна ўстанаўліваўся ў пяску ў час вандраванняў.

Гліняны посуд значна *палепшыў умовы жыцця* чалавека. Цяпер ён мог варыць ежу і больш надзейна захоўваць харчовыя запасы. Посуд служыў і для піцця.

---

*Пасля адступлення ледавіка паляўнічыя плямёны паступова пераходзілі да аселага жыцця. Вынікам гэтага з'явілася распаўсюджанне гліняната посуду, які стаў для чалавека вельмі неабходным.*

**Пытанні і заданні**

1. Чаму пасляледавіковы перыяд называюць «часам лука і стралы»? 2. Пакажыце на карце важнейшыя напрамкі рассялення людзей у пасляледавіковы перыяд. 3. Для чаго першапачаткова выкарыстоўвалася зерняцёрка? 4. Якое значэнне мела вынаходніцтва гліняная посуду? 5. Як выглядалі найбольш старажытныя гліняныя пасудзіны? 6. Запішыце і растлумачце паняцці: *пасляледавіковы перыяд, зерняцёрка, аселае жыццё.*

## § 5. ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАШЫХ ПРОДКАЎ

*Успомніце: 1. Якія спосабы палявання існавалі ў ледавіковы перыяд на Беларусі? 2. Дзе і калі ўзнікла першае старажытнае земляробства?*

**А. Існаванне за кошт прыроды.** У каменным веку чалавек мог існаваць толькі дзякуючы прыродзе. Нашы далёкія продкі атрымлівалі ад яе ўсё неабходнае.

Насельніцтва Беларусі ў пасляледавіковы перыяд займалася паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Людзі, якім тады давялося жыць на беларускіх землях, не ведалі ні земляробства, ні жывёлагадоўлі.

Адзенне і абутак шылі са скуры жывёл.

Асаблівасцю каменнага веку было тое, што *чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе.* На Беларусі так было амаль да пачатку бронзавага веку.

Такі від гаспадаркі называецца ***спажывецкім***, або ***прысвойваючым***. Ён дапамагаў людзям выжыць і паступова ўзняцца на новую гістарычную ступень свайго развіцця.

**Б. Асобныя віды промыслаў.** ***Промыслы*** — гэта заняткі, здабыванне сродкаў існавання. Мы ўжо ведаем, што старажытныя людзі займаліся паляваннем і збіральніцтвам (§ 3, п. А).

Існаваў шэраг іншых промыслаў. Сярод іх *рыбалоўства, пляценне.*

Роля рыбалоўства ўзрасла неўзабаве ў пасляледавіковы перыяд. Клімат станавіўся больш цёплы




**Асноўныя і дапаможныя заняткі людзей у каменным веку, калі панавала прысвойваючая гаспадарка**

і вільготны. Прыродныя ўмовы Беларусі, асабліва Прыпяцкага Палесся, былі досыць спрыяльнымі для жыцця першабытных паляўнічых і рыбаловаў.

Члены родавых абшчын сяліліся на балоцістых і лясістых берагах рэк і азёр. Жыллё нагадвала буданы (шалашы).

У канцы каменнага веку рыбалоўства стала найбольш надзейнай крыніцай здабывання ежы. *Нашы далёкія продкі ведалі розныя спосабы лоўлі рыбы.* Яе маглі лавіць проста рукамі. Рыбу і ракаў лавілі ў норах, на мелях, у лужынах пасля спаду паводкавай вады.

Для рыбалоўства выкарыстоўвалі лодкі (чаўны). Яны выдзёўбваліся з суцэльнага ствала дубу ці хвоі.

Вясной, калі рыба ішла ў больш ціхія месцы на

Рыбалоўныя кручкі, якія зроблены з касцяных пласцінак, знойдзеныя пры раскопках стаянак у Беларусі



нераст (адкладанне ікры), яе білі гарпунамі з лодак. *Гарпун* — кідальная зброя для палявання на звяроў і рыб. Востры зубчасты наканечнік рабіўся з каменю ці косці і быў змацаваны з драўляным дзяржаннем.

Невялікія рэчкі перагароджвалі плятнямі з галінак. У плятні рабілася адтуліна для сеткі, у якую трапляла рыба.

У канцы каменнага веку для лоўлі рыбы выкарыстоўвалі *вуды*. Вучоныя знайшлі на стаянках самыя разнастайныя па форме і памерах рыбалоўныя кручкі. Яны выразаліся з тонкіх касцяных пласцінак.

Са старажытных часоў чалавеку быў вядомы мёд. Чалавек браў яго ў пчаліным гняздзе, якое выпадкова знаходзіў у дупле дрэва. Пры гэтым знішчалася пчаліная сям'я. Пазней чалавек навучыўся ахоўваць і даглядаць дзікіх пчол у выяўленых дуплах. Так узнікла ***бортніцтва.***

З дапамогай самалоўных прыстасаванняў сіла́ (пятлі) і сетак (перавесаў) лавілі птушак. Сеткі плялі з суканых нітак. Ніткі рабілі з лыка — маладой кары ліпы ці лазы, садранай доўгай вузкай паласой.

**В. Першабытныя шахцёры.** Непадалёку ад *Ваўкавыска*, там, дзе цяпер знаходзіцца пасёлак Красносельскі, 4 тыс. гадоў назад бераг ракі быў добра знаёмым месцам для многіх людзей. *Іх усіх вяла сюды патрэба ў якасным крэмені* — незаменным матэрыяле для вырабу прылад працы.



**Шахты на беразе ракі Рось у Ваўкавыскім раёне каля 4000 гадоў назад**

У гэтых месцах на невялікай глыбіні знаходзяцца радовішчы крэйды, у якіх сустракаюцца кавалкі якаснага крэменю.

Спачатку мясцовае насельніцтва збірала крэмень на паверхні. У канцы каменнага веку людзі перайшлі да яго здабычы ў крэйдавай тоўшчы.

Для гэтага капалі невялікія ямы. Затым ямы паглыбляліся і нагадвалі сабой прымітыўныя ***шахты***, падобныя да калодзежаў. Глыбіня шахты складала 3—5 метраў. Здабыты крэмень змяшчалі ў мяшок, які на вяроўцы выцягвалі наверх.

Праца вялася нескладанымі інструментамі — капалкамі, малаткамі-даўбешкамі, кіркамі.

З кавалкаў крэменю выраблялі сякеры. Яны распаўсюджваліся на тэрыторыі Панямоння.

У адной шахце знойдзены шкілет чалавека. Тут жа ляжала касцяная іголка для сшывання скураных мяшкоў. Каля ног стаяла невялікая гліняная пасудзіна.

Гэта было пахаванне першабытнага шахцёра, які тут памёр.

Па знойдзеным чэрапе вучоныя ўзнавілі знешні выгляд чалавека. Ён не адрозніваўся ад сучасных людзей.

---

***У каменным веку здаўна існавала спажывецкая гаспадарка. Чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе. Людзі займаліся паляваннем, збіральніцтвам, рыбнай лоўляй. Асноўныя прылады працы рабілі з крэменю.***

**Пытанні і заданні**

1. Які від гаспадаркі называюць спажывецкім (прысвойваючым)? 2. Чаму такі від гаспадаркі быў непазбежны і неабходны? 3. Якія спосабы лоўлі рыбы ведалі нашыя далёкія продкі? 4. Адкуль вучоныя даведаліся, што ў канцы каменнага веку рыбу лавілі вудамі? 5. Што такое *бортніцтва*? 6. Дзе знаходзяцца самыя старажытныя шахты на Беларусі? Што ў іх здабывалі? 7. Складзіце прыгодніцкае апавяданне «Старажытныя людзі на рыбалцы». 8. Запішыце і растлумачце паняцці: *спажывецкая гаспадарка, промыслы, бортніцтва, шахты.*

*Успомніце з «Гісторыі старажытнага свету»: 1. Якім было жыццё найстаражытнейшых людзей? 2. Што такое праабшчына, якую называюць таксама «першабытным чалавечым статкам»?*

**А. Родавая абшчына.** Краманьёнцы жылі родавымі абшчынамі. ***Родавая абшчына*** — гэта ячэйка (невялікая група) чалавечага грамадства. Яна налічвала прыкладна 50—70 чалавек.

Людзі, якія ўваходзілі ў родавую абшчыну, былі звязаны адзін з адным сваёй роднасцю, сваяцтвам. Усе яны былі блізкімі родзічамі.

*Чалавек ведаў, што ў адзіночку ён будзе бездапаможны і загіне.* У невялікай групе людзей — родавай абшчыне — існавала пачуццё згуртаванасці і ўзаемнай дапамогі.

Асаблівасцю абшчыны было сумеснае валоданне прыладамі працы. Людзі мелі *агульную маёмасць.*

Адметнай рысай роду з'яўляецца *раўнапраўнасць* усіх кроўных сваякоў. Найбольш важныя пытанні іх жыцця вырашаў агульны сход дарослых членаў роду.



Першабытныя людзі — неандэртальцы шукаюць месца, дзе спыніцца, каб заснаваць стаянку

Род выбіраў *старэйшыну* — самага вопытнага чалавека, які ўплываў на родзічаў. Старэйшына клапаціўся аб інтарэсах роду. Ён карыстаўся агульным даверам, і родавая абшчына выконвала яго загады.

Спрэчкі з-за парушэнняў правоў на тэрыторыю, якую займаў род, вырашаліся ваеннымі сутычкамі. Сутычкі былі невялікія, звычайна да першых параненых ці забітых. Потым пачыналіся перагаворы аб міры.

**Б. Аб'яднанне родаў у плямёны.** З павелічэннем колькасці насельніцтва некаторыя члены роду аддзяляліся і пераходзілі жыць на новыя месцы. Так утвараліся новыя роды.

Роды аб'ядноўваліся ў плямёны. Адбывалася гэта на тэрыторыі Беларусі 12—7 тыс. гадоў назад.

***Племя*** — трывалае аб'яднанне некалькіх родаў, якія звязаны агульнасцю паходжання. Яно ўзнікала на аснове кроўных сувязей. Мужчыны бралі шлюб унутры племені.

Роды аднаго племені размаўлялі на адной мове, мелі агульнае племяннное імя.

Найбольш важныя пытанні вырашаў агульны сход племені. Адбываліся нарады родавых старэйшын. Адзін са старэйшын быў кіраўніком племені.

**В. Утварэнне вялікіх груп плямён.** Прыкладна 6 тыс. гадоў назад на тэрыторыі Беларусі адбываўся значны прырост насельніцтва. Яго павелічэнне садзейнічала ўзнікненню новых супольнасцей людзей.

Такіх супольнасцей было чатыры. Устанавіць гэта археолагам дапамагло *падабенства прылад працы*, якія былі выяўлены пры раскопках стаянак людзей таго часу. Асаблівае значэнне меў арнамент на гліняных гаршках. У кожнай групы плямён ён быў асобы, адрозненні былі і ў формах пасудзін.

Адна вялікая група плямён *(днепра-данецкая)* пражывала ва Усходнім Палессі.

Другая група плямён *(верхнедняпроўская)* засяляла Усходнюю Беларусь у басейне Дняпра. *(Пакажыце гэту тэрыторыю на карце.)* Пасялішчы размя-




**Чатыры групы плямён у Беларусі каля 6000 гадоў назад: днепра-данецкая, верхнедняпроўская, нёманская, нарвенская**

шчаліся на пясчаных узгорках поймы Дняпра і Сожа.

Трэцяя група плямён *(нёманская)* рассялілася ў вярхоўі Прыпяці і Нёмана. Значныя археалагічныя раскопкі праводзіліся на стаянцы каля вёскі Камень у Пінскім раёне.

Чацвёртая група плямён *(нарвенская)* знаходзілася ў Паўночнай Беларусі. Назва паходзіць ад ракі Нарва (Эстонія). Нешматлікія стаянкі размяшчаліся па берагах азёр і рэк у Падзвінні. Пры іх даследаванні выяўлены каштоўныя творы першабытнага мастацтва (стаянкі каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна на Віцебшчыне). (§ 13, п. А.)

Паселішчы паўсюдна размяшчаліся на ўзвышшах ля вадаёмаў. Яны складаліся з наземных і ледзь паглыбленых у зямлю невялікіх драўляных




Спосаб выкарыстання крамянёвай прылады працы *(а)*; здабыча агню з дапамогай лучковай цецівы *(б)*

памяшканняў. Сярэдні памер жылля быў 3×3,5 (м).

Усё тагачаснае насельніцтва Беларусі займалася пераважна паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам. Разам з тым днепра-данецкія і нёманскія плямёны ўжо ведалі жывёлагадоўлю і земляробства.

---

*Суровая барацьба за існаванне прымушала людзей жыць сумесна — цесна з'яднанымі родамі. У іх усё было агульнае — прылады працы, жыллё, ежа. Такі лад у гісторыі называецца* ***першабытнаабшчынным****, ці родаплемянным. Павольна, пераадольваючы вельмі вялікія цяжкасці, ішоў чалавек уперад у сваім развіцці.*

**Пытанні і заданні**

1. Чаму першыя насельнікі Беларусі не маглі жыць паасобку? 2. Калі пачаўся пераход да родавай абшчыны? Ахарактарызуйце яе. Чым яна адрозніваецца ад першаабшчыны? 3. Хто распараджаўся маёмасцю ў родавай абшчыне? 4. Назавіце асноўныя прыметы племені. 5. Калі плямёны пачалі ўзнікаць на тэрыторыі Беларусі? 6. Якія групы плямён пра-

жывалі на беларускіх землях у апошніх тысячагоддзях каменнага веку? **7.** Пакажыце на карце месцы іх рассялення. **8.** Запішыце і растлумачце паняцці: *родавая абшчына, старэйшына, племя, першабытнаабшчынны лад.*

## ПАЎТАРАЛЬНА-АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ЎРОК ДА РАЗДЗЕЛА I[1]

Вы закончылі вывучэнне падзей, якія адбыліся на тэрыторыі нашай краіны ў каменным веку.

Вы даведаліся, што ўпершыню чалавек (неандэрталец) спрабаваў пранікнуць сюды **100—35 тыс. гадоў назад.** Больш дакладную дату гэтай падзеі даць немагчыма, таму што захавалася мала крыніц.

Асваенню тэрыторыі Беларусі чалавекам вельмі моцна перашкаджаў ледавік.

Другая спроба засялення Беларусі на гэты раз «новымі людзьмі» (краманьёнцамі) адбывалася **26—23 тыс. гадоў назад.** Рэшткі стаянак знойдзены ў Юравічах і Бердыжы на Гомельшчыне. Пры неспрыяльных для жыцця кліматычных умовах чалавек удасканальваў прылады працы. Ён навучыўся будаваць жыллё, паляваў рознымі спосабамі, займаўся іншымі відамі гаспадарчай дзейнасці.

У пасляледавіковы перыяд адбывалася засяленне далін буйных рэк Беларусі родавымі абшчынамі. Роды аб'ядноўваліся ў плямёны.

Былі вынайдзены лук і стрэлы, каменная сякера, пазней гліняны посуд. Гаспадарка заставалася спажывецкай, заснаванай на спажыванні гатовых дароў прыроды.

Увесь гэты час называецца першабытнаабшчынным ладам. *(Праверце, як вы засвоілі матэрыял. Папрацуйце з картамі, датамі, паняццямі.)*

---

[1] З а ў в а г а. Настаўнік ці вучні маюць магчымасць выбраць з кожнага пункта паўтаральна-абагульняючага ўрока пытанні ў залежнасці ад складанасці, цікаўнасці вучняў, саставу класа і часу, які адведзены на паўтарэнне.

**А. Работа з картамі**[1]

Пакажыце на карце:

1. Мяжу апошняга ледавіка, які спыніўся на тэрыторыі Беларусі.
2. Месца выяўлення першых слядоў чалавека на Беларусі (Абідавічы, Свяцілавічы).
3. Месцы першых стаянак чалавека каменнага веку (Юравічы, Бердыж).
4. Буйныя рэкі, уздоўж якіх сяліліся нашы продкі.
5. Асноўныя напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі.
6. Стаянкі апошніх тысячагоддзяў каменнага веку (Камень, Асавец).
7. Раёны Панямоння, Палесся, Верхняга Падняпроўя, Паазер'я, Прыпяці, Пасожжа. Якім абласцям сучаснай Беларусі яны адпавядаюць?
8. Месцы рассялення груп плямён у канцы каменнага веку.

Зрабіце вывад аб тым, як чалавек засяляў тэрыторыю Беларусі.

**Б. Работа з храналогіяй каменнага веку**

1. Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці даты і растлумачце іх змест:

100—35 тыс. гадоў назад, 12—7 тыс. гадоў назад, 23 тыс. гадоў назад, 35 тыс. гадоў назад, 26 тыс. гадоў назад, 22—14 тыс. гадоў назад.

2. Суаднясіце асноўныя даты вывучанага раздзела курса «Гісторыя Беларусі старажытных часоў» з датамі адпаведнага перыяду курса «Гісторыя старажытнага свету». Ці супадаюць яны? Калі не супадаюць, падумайце чаму.

---

[1] Заўвага. Заданні можна выконваць і на контурных картах. У гэтым выпадку вучні павінны не паказаць, а адзначыць на контурных картах месцы, якія пералічаны ў заданнях.



Крамянёвы серп, які зроблены каля 4000 гадоў назад (в. Камень Пінскага раёна)

**В. Паўтарэнне асноўных паняццяў**

Успомніце наступныя паняцці:

*каменны век, крэмень, скрэбла, неандэрталец, «чалавек разумны», «новыя людзі», востраканечнік, скрабок, краманьёнец, дзіда, паляванне, дроцік, збіральніцтва, яма-лавушка, раздзяленне працы, лук, каменная сякера, зерняцёрка, ганчарства, аселае жыццё, рыбалоўства, спажывецкая гаспадарка, промыслы, лодка, гарпун, лыка, бортніцтва, старэйшына, племя, сход племені, першабытнаабшчынны лад.*

Выпішыце названыя вышэй паняцці ў тры слупкі па ўзору:

| Прылады працы | Заняткі, тып гаспадаркі | Перыяды, грамадскае жыццё |
|---|---|---|

Заўвага. Гэты матэрыял можа быць таксама выкарыстаны для правядзення слоўнікавай (паняційнай) дыктоўкі.

**Г. Выканайце заданні**

**1.** Растлумачце, якія з'явы адыгралі адмоўную ролю ў жыцці найстаражытнейшых жыхароў Беларусі і чаму так было.

**2.** Раскажыце, якія каштоўныя здабыткі былі зроблены нашымі продкамі ў каменным веку. Рас-

тлумачце, у чым каштоўнасць гэтых адкрыццяў для наступных пакаленняў.

3. Карыстаючыся малюнкамі да § 1—6, паразважайце:

а) якімі былі заняткі старажытных жыхароў Беларусі? Чым гэтыя заняткі вызначаліся? Чаму гаспадарка таго часу магла быць толькі спажывецкай?

б) якія прычыны абумовілі ў старажытнасці пераход ад адной супольнасці да другой: ад праабшчыны да роду і племені?

**Д. Развіццё навыкаў і ўменняў разумовай працы**

1. Складзіце просты план аднаго з пунктаў наступных параграфаў: § 1, п. Б; § 2, п. Б; § 5, п. Б; § 6, п.Б. Выкарыстайце памятку «Як працаваць з падручнікам».

2. Складзіце апавяданне па аднаму з малюнкаў да § 1—6.

3. Пабудуйце лагічны ланцужок па тэме: «Супольнасці людзей каменнага веку». Праабшчына →

4. Знайдзіце агульныя рысы і адрозненні ў занятках і грамадскім жыцці насельніцтва Беларусі ў ледавіковы і пасляледавіковы перыяды. Зрабіце вывады (выкарыстайце памятку «Як вывучаць гісторыю»).

**Е. Гістарычнае краязнаўства**

Знайдзіце свой край (раён) на карце Беларусі. На падставе вывучанага матэрыялу адкажыце на пытанні:

1. З якога напрамку і прыблізна калі прыйшлі сюды людзі? *(Пакажыце на карце.)*

2. Якія існуюць сляды найбольш старажытных людзей у вашым краі?

3. Якія тут сяліліся групы плямён у канцы каменнага веку (§ 6, п. В)?

Зрабіце вывад аб сувязі старажытнай гісторыі вашага раёна ці вобласці з гісторыяй Беларусі.

## Раздзел II

# ЖЫХАРЫ БЕЛАРУСІ Ў БРОНЗАВЫМ І ЖАЛЕЗНЫМ ВЯКАХ (каля 2 тыс. гадоў да н. э.—500 год н. э.)





## Тэма 3. АД СПАЖЫВЕЦКАЙ ГАСПАДАРКІ ДА ВЫТВОРЧАЙ

### § 7. РОЛЯ МЕТАЛАЎ У ЖЫЦЦІ СТАРАЖЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ

*Успомніце: 1. Што такое металы? (Выкарыстайце веды, атрыманыя ў папярэдніх класах.) 2. Дзе і калі ўпершыню пачаўся выраб меднай зброі і прылад працы?*

**А. Выкарыстанне медзі і бронзы.** На тэрыторыі Беларусі вырабы з медзі і бронзы з'явіліся ў II тысячагоддзі да н. э., значна пазней, чым у краінах першых цывілізацый.

*У Беларусі не было радовішчаў медзі і волава,* сплаў якіх утварае бронзу. Адсутнасць уласнай сыравіны стрымлівала шырокае ўкараненне тут металічных вырабаў.

Медзь і бронза траплялі да нашых продкаў з Прыкарпацця і Каўказа. Паступова на тэрыторыі Беларусі ўзнікла бронзаліцейная справа. Бронза лёгка плавіцца пры нізкай тэмпературы (700 градусаў цяпла). Такая тэмпература дасягаецца ў звычайным вогнішчы.

Выкарыстанне медных і бронзавых прылад павысіла выніковасць працы людзей. Паспяхова замяняліся крамянёвыя прылады працы. З'явіліся медныя і бронзавыя нажы, наканечнікі дзідаў, шылы, сякеры, упрыгажэнні.

Аднак у бронзавым веку працягвалі ўжывацца і каменныя прылады. Яны нават дасягнулі сваёй дасканаласці. Пры іх вырабе яшчэ больш, чым раней, выкарыстоўваліся шліфоўка і свідраванне.

* **Гістарычная даведка.** Яшчэ ў ледавіковую эпоху чалавек пракручваў адтуліны ў некаторых прыладах працы і ўпрыгажэннях. Затым было адкрыта свідраванне з дапамогай трубчастай косткі, у якую насыпаўся пясок. Поспех свідравання павялічыўся пасля таго, як трубчастая костка прыводзілася ў рух лучковай цецівой (прыстасаванне накшталт лука). Яго цеціва абкручвалася вакол косткі (стрыжня), што надавала ёй вярчальны рух. Прыстасаванне ўжывалася найбольш шы-



Станок для свідравання адтулін у камені

рока ў бронзавым веку пры свідраванні адтулін у камені. ***Свідраваныя баявыя сякеры*** добра трымаліся на доўгай драўлянай ручцы.

У бронзавым веку з каменю працягвалі выраб-ляць многія рэчы. Толькі **каля 700 года да н. э.**, калі наступаў жалезны век, пачынаўся заняпад крамянёвых прылад працы.



Каменныя свідраваныя баявыя сякеры, якімі карысталіся нашы продкі 4000—3000 гадоў назад

**Б. Здабыча жалеза.** Адкрыццё жалеза адзначала пачатак велізарнага тэхнічнага перавароту ў гісторыі чалавецтва.

Жалезныя руды вельмі распаўсюджаны ў прыродзе. Узяць хоць бы Беларусь. У кожнай вобласці існуюць вёскі, у назве якіх ужываецца слова «руда» — Рудня, Рудзенка, Рудакова.

Руду можна знайсці на беразе ракі або возера, на балоце, пад дзірваном лугу. Яе дагэтуль так і называюць ***балотнай***, ці дзірвановай, ***рудой***. У балоце або возеры злучэнні жалеза асядаюць бурай каламуццю на дно, утвараючы руду.

Чаму ж так здарылася, што жалезная руда ёсць усюды, а людзі спачатку пачалі выкарыстоўваць больш рэдкія і менш трывалыя металы — медзь і бронзу?

Усё тлумачыцца даволі проста. Жалеза плавіцца пры вельмі высокай тэмпературы. Яна ў два разы вышэйшая за адпаведную тэмпературу плаўлення медзі. Атрымаць такую тэмпературу тагачасныя майстры не ўмелі.

Яны знайшлі спосаб атрымліваць жалеза і пры параўнаўча невысокай тэмпературы. Сабраную жалезную руду «варылі» (награвалі) у печах-домніцах.

Захаваліся рэшткі старажытнай домніцы каля вёскі Лабеншчыны непадалёку ад Заслаўя. Печ, зробленая з гліны, была невялікай, у дыяметры менш за метр. У ёй кавалкі руды спякаліся, утвараючы порыстую масу — ***крыцу***.

Калі печ астывала, крыцу даставалі. Потым у кузні яе зноў награвалі і плюшчылі цяжкімі молатамі. Так атрымлівалі даволі якаснае крычнае жалеза.

*** В. Плямёны ранняга жалезнага веку.** Тэрыторыю Беларусі ў раннім жалезным веку насялялі некалькі вялікіх груп плямён.

Адна група плямён жыла ў Паўднёвай Беларусі. Сёння гэтыя плямёны называюць ***мілаградскімі*** (ад вёскі Мілаграды Рэчыцкага раёна на Гомельшчыне). Гэтыя плямёны здабывалі і апрацоўвалі жале-




**Групы плямён ранняга жалезнага веку на Беларусі**

за, займаліся бронзаліцейнай вытворчасцю. Не выключана, што ў іх было патрыярхальнае рабства. Існавалі культы каня, каровы, мядзведзя, ваўка.

Праз некалькі стагоддзяў на тэрыторыі, дзе пражывалі мілаградцы, складвалася новая група плямён. Яе сучасная назва паходзіць ад сяла Зарубінцы Кіеўскай вобласці на Украіне. Прылады працы, рэчы побыту, упрыгажэнні ў зарубінецкіх плямён былі больш разнастайнымі, чым у мілаградцаў. Яны карысталіся жалезнымі клінападобнымі сякерамі, баявымі нажамі, дзідамі з жалезнымі наканечнікамі, шпорамі. З грэчаскіх гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я да іх трапляў дарагі гліняны посуд і мноства шкляных пацерак для маністаў.

Для свайго часу зарубінецкія плямёны стаялі на даволі высокім узроўні культурнага развіцця.

Ад зарубінцаў адставалі ў развіцці плямёны, якія жылі ў Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі. Яны на два-тры стагоддзі пазней пачалі выкарыстоўваць жалезныя вырабы. Адметнай рысай культуры гэтых плямён быў гліняны посуд. Яго знешняя паверхня пакрывалася штрыхамі. Адсюль назва: плямёны культуры ***штрыхаванай керамікі.***

На поўначы Беларусі ў гэты час жыла асобная група плямён. Іх называюць ***днепра-дзвінскімі плямёнамі*** таму, што яны жылі ў вярхоўях Дняпра і Заходняй Дзвіны.

Вучоныя прыйшлі да высновы, што плямёны культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскія




Рэчы, якімі карысталіся зарубінецкія плямёны каля 2000 гадоў назад: *а)* жалезныя наканечнікі дзідаў; *б)* спражка; *в)* рыбалоўны кручок; *г)* жалезны серп; *д)* драўлянае верацяно з гліняным праслiцам; *е)* жалезны нож з меднай ручкай



Жалезная сякера і сярпы плямён культуры штрыхаванай керамікі

належалі да балтаў. *Балты* — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў (§ 10, п. Г).

**Г. Вынікі адкрыцця жалеза.** Працаваць жалезнымі прыладамі было значна лягчэй, чым каменнымі і бронзавымі. Імі можна было больш якасна і хутка апрацоўваць дрэва, косць, шкуру.

З дапамогай жалезнай сякеры ачышчаліся ад лесу значныя дзялянкі для лядна-агнявой сістэмы земляробства (§ 8, п. Б).



Жалезная сякера (кельт) на драўлянай ручцы зарубінецкіх плямён

Пры дапамозе жалезных сякер узводзілі больш трывалыя, чым раней, жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Жалеза было асноўным матэрыялам для вырабу зброі — наканечнікаў стрэл і дзідаў, баявых сякер, нажоў ды шмат чаго іншага.

З'явіўся новы спосаб здабывання агню. Ударамі металічнага крэсіва аб крэмень высякаліся іскры.

---

*У раннім жалезным веку многія каменныя і бронзавыя прылады былі заменены жалезнымі. Жалезныя прылады працы, асабліва сякеры, былі неабходнай перадумовай для канчатковага пераходу да земляробства. Ствараліся ўмовы для накаплення багаццяў у руках асобных калектываў унутры родавай абшчыны, што прыводзіла да яе распаду.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Што стрымлівала ўкараненне медных і бронзавых вырабаў на Беларусі ў старажытныя часы? **2.** Чаму людзі пачалі спачатку выкарыстоўваць для вырабу прылад працы медзь і бронзу, а не жалеза, якое распаўсюджана паўсюдна? **3.** Ці магла бронза выцесніць каменныя вырабы на беларускай зямлі? Калі гэта ў сапраўднасці адбылося? **4.** Ці ёсць у вашым і суседніх раёнах вёскі, назвы якіх утварыліся ад слова «руда»? Аб чым сведчаць такія назвы? **5.** Запішыце і растлумачце даты: **каля II тысячагоддзя да н. э., каля 700 года да н. э.** **6.** Запішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: *свідраваныя баявыя сякеры, балотная руда, крыца, мілаградскія плямёны, плямёны культуры штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінскія плямёны, зарубінецкія плямёны.*

## § 8. ПЕРАХОД ДА ВЫТВОРЧАЙ ГАСПАДАРКІ

*Успомніце: 1. Якія віды гаспадарчай дзейнасці людзей існавалі ў каменным веку? 2. Якія тады выкарыстоўваліся спосабы палявання?*

**А. Узнікненне жывёлагадоўлі.** Старажытны чалавек доўгі час задавальняўся тым, што яму давала прырода. Аднак паляванне і збіральніцтва не маглі пракарміць вялікую колькасць людзей.




Дзікія продкі прыручаных чалавекам жывёл: *а)* дзікая авечка; *б)* дзікая каза; *в)* тур; *г)* дзікі кабан

Старажытныя людзі часта і падоўгу галадалі. У першую чаргу ад голаду паміралі дзеці і старыя. Таму людзі імкнуліся знайсці сабе больш устойлівыя крыніцы здабывання ежы.

Людзі пачалі прыручаць жывёл. Першым прыручылі сабаку. Спачатку яго мяса выкарыстоўвалі для ежы. Потым свойская жывёла стала надзейным сябрам і памочнікам паляўнічага. Сабака папярэджваў аб небяспецы і высочваў звяроў.

Часам паляўнічыя прыносілі з сабой маладых звяркоў, якіх даглядалі на стаянках. Пазней людзі заўважылі, што жывёлы пачалі размнажацца ў няволі.

Народжаныя на стаянках цяляты і ягняты станавіліся зусім свойскімі. Іх можна было паставіць паблізу паселішчаў і выкарыстоўваць у гаспадарчых патрэбах.

Людзі перайшлі да развядзення жывёл у хатніх умовах. Асабліва хутка асвойвалася ў няволі свіння. Лясы Беларусі тады былі багаты дзікамі. Маг-

чыма, свіння была першай пасля сабакі свойскай жывёлай.

З палявання ўзнікала жывёлагадоўля. Першымі пачалі пераходзіць да жывёлагадоўлі жыхары Паўднёвай Беларусі. Яны разводзілі пераважна буйную рагатую жывёлу, свіней і коней. Пераход да жывёлагадоўлі адбываўся за **3 тыс. гадоў да н. э.**

У бронзавым веку жывёлагадоўля становіцца вядучай галіной гаспадаркі жыхароў Беларусі. Жывёлагадоўля зрабіла чалавека больш незалежным ад навакольнага асяроддзя. Ён меў гатовыя запасы харчавання. Быкоў і коней чалавек стаў выкарыстоўваць як рабочую (цяглавую) сілу.

**Б. Першыя земляробы.** Земляробства з'явілася на тэрыторыі Беларусі амаль адначасова з жывёлагадоўляй. Яно спачатку стала вядома на Палессі.

Пра заняткі земляробства сведчаць адпаведныя прылады. Археолагі выявілі на паселішчах таго часу матыкі і сярпы.

Нашы продкі рыхтавалі пад пасевы невялікія ўчасткі ў поймах рэк. Апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай матык. Такое земляробства называецца ***матычным***.

Зусім іншым было ***лядна-агнявое*** земляробства. Ляда (падсека) — участак, на якім высякаўся лес. Высахлыя дрэвы спальваліся. У попел сеялі зерне і баранавалі поле кавалкам сукаватага дрэва. Та-



**Збор ураджаю дзікарослых культур з дапамогай касцянога сярпа з вострымі крамянёвымі ўкладышамі 4000 гадоў назад**



Апрацоўка зямлі з дапамогай матык

кая прылада называлася бараной-сукаваткай. Першыя два-тры гады збіралі добры ўраджай. Праз некалькі гадоў для пасеву патрэбна было рыхтаваць новы ўчастак.

Ураджай збажыны зжыналі сярпамі. У бронзавым веку ўжываліся крамянёвыя сярпы. Іх выраблялі з драўляных ці касцяных апраў, у якіх замацоўваліся крамянёвыя ўкладышы. Пазней з'явіліся жалезныя сярпы.



Барана-сукаватка *(па даных этнаграфіі)*



Драўлянае рала, якое знойдзена каля в. Капланавічы Клецкага раёна

Праца земляроба стала больш выніковай, калі пры апрацоўцы зямлі пачало выкарыстоўвацца драўлянае **ра́ла** і ўзнікла ***ворыўнае*** земляробства. Для ўзрыхлення (разворвання) глебы прымянялася рала, а потым саха і плуг.

Рала рабілася з дубовага ствала з сукам, які ўтвараў ральнік (паўзун). Такое рала знойдзена ў тарфяніку паблізу вёскі Капланавічы Клецкага раёна.

Драўлянымі раламі рана пачалі карыстацца на поўдні Беларусі, дзе глебы больш ўрадлівыя. Рала цягнуў вол ці конь.

Пры ворыўным земляробстве павялічвалася колькасць культурных раслін, расла іх ураджайнасць. Вырошчвалі *мяккую пшаніцу, ячмень, проса, гарох, бабы, віку, лён, каноплі.*

**В. Старажытная вытворчая гаспадарка.** На мяжы каменнага і бронзавага вякоў у Беларусі істотна змяніліся заняткі людзей і іх узаемаадносіны з прыродай.

Паляўнічыя, збіральнікі, рыбаловы карысталіся тым, што было ў прыродзе. Земляробы і жывёлаводы самі вырошчвалі тое, што потым маглі выкарыстаць для ежы: новыя пароды жывёл, выводзілі новыя гатункі раслін. Жыццё людзей цяпер менш залежала ад прыроды, а ў большай ступені ад іх




**Заняткі насельніцтва Беларусі жывёлагадоўляй і земляробствам у бронзавым і раннім жалезным вяках. Пераход ад спажывецкай гаспадаркі да вытворчай**

уласнай працы. Такая гаспадарка называецца ***вытворчай.***

*** Г. Прадзенне, ткацтва і іншыя хатнія промыслы.** Прадзенне і ткацтва цесна звязаны паміж сабой. Для прыгатавання тканін патрэбны ніткі. Іх рабілі з валокнаў крапівы, лёну, шэрсці.

Прадзівам і ткацтвам займалася жанчына.

Вертыкальны ткацкі станок *(рэканструкцыя)*



*Ткацтва* — гэта выраб тканін. На Беларусі яно стала вядома 5 тыс. гадоў назад.

Прыладай для скручвання ніткі ў прадзіве было *драўлянае верацяно.* На яго надзяваўся невялікі грузік. Ён завецца праслiца. Праслiца паляпшала хуткасць вярчэння верацяна.

Ткацкі станок быў вертыкальны. Ён уяўляў высокую драўляную раму. Пазней з'явіўся гарызантальны ткацкі станок. На Беларусі ён называўся *кросны.*

З тканін шылася адзенне. У каменным веку іголкі выраблялiся з касцей і рагоў жывёл, у бронзавым — з каляровых металаў, у жалезным — з жалеза.

Старажытныя людзі добра ведалі *пляценне* (§ 5, п. Б). З лыка плялі тканіну, якая нагадвала рагожу.

---

*З'яўленне вытворчай гаспадаркі было значным крокам уперад у развіцці грамадства. Жывёлагадоўля і земляробства забяспечвалі тагачаснае насельніцтва прадуктамі харчавання, некаторымі відамі сыравіны для хатніх промыслаў.*

**Пытанні і заданні**

1. Калі нашы продкі пачалі займацца жывёлагадоўляй? 2. Якія дзікія жывёлы на тэрыторыі Беларусі сталі свойскімі? 3. Назавіце спосабы старажытнага земляробства, якія выкарыстоўваліся ў той час на тэрыторыі Беларусі. Дайце ім характарыстыку. 4. Аб чым сведчыць драўлянае рала, знойдзенае на нашай зямлі? Карыстаючыся малюнкам, апішыце яго. 5. Што садзейнічала пераходу ад спажывецкай гаспадаркі

да вытворчай? Параўнайце іх паміж сабой. **6.** Запішыце і растлумачце дату: **3 тыс. гадоў да н. э. 7.** Выпішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: *матычнае, лядна-агнявое, ворыўнае земляробства, рала, вытворчая гаспадарка.*

## § 9. АД РОДАВАЙ ДА СУСЕДСКАЙ АБШЧЫНЫ

*Успомніце: 1. У чым заключалася прыроднае раздзяленне працы паміж мужчынамі і жанчынамі ў каменным веку? 2. Ці было ў родавай абшчыне прыгнечанне адных людзей другімі? Сваю думку абгрунтуйце.*

**А. Узрастанне ролі мужчынскай працы ў бронзавым веку.** На працягу многіх тысячагоддзяў каменнага веку мужчыны і жанчыны займалі амаль роўнае становішча ў здабыванні ежы. Пераход да жывёлагадоўлі і земляробства выклікаў важныя змяненні ў жыцці людзей.

У бронзавым веку жывёлагадоўля і лядна-агнявое земляробства з'яўляліся асноўнымі заняткамі мужчыны. Яго працай ствараліся пастаянныя харчовыя запасы.

Мужчынскай справай было таксама прыручэнне і догляд жывёл.

Значна папаўняў харчовыя запасы ўдзел у паля-



Высяканне дрэў на ўчастку для лядна-агнявога земляробства



Гліняныя гаршкі бронзавага веку

ванні і рыбалоўстве. Мужчынам неабходна было ахоўваць абшчыну ад набегаў іншых плямён.

Праца жанчыны заўсёды была неабходнай і вельмі карыснай для свайго роду. Яе абавязкам было абграванне жылля і гатаванне ежы. Не менш часу жанчына траціла на выраб адзення і абутку. Яна займалася збіральніцтвам дароў прыроды, зборам ураджаю і шмат іншым. Значную ўвагу аддавала жанчына догляду дзяцей.

Аднак клопаты жанчыны былі абмежаваны хатняй гаспадаркай. *Мужчынская ж праца ў параўнанні з жаночай вырашала далейшы лёс усіх суродзічаў.*

Цяпер мужчына, уступаючы ў шлюб, не пераходзіў у род жонкі, як было раней. Ён забіраў жонку да сябе. Мужчына быў зацікаўлены ў тым, каб перадаць маёмасць сваім дзецям, асабліва сынам. Роднасць пачала лічыцца па мужчынскай лініі. Утвараліся вялікія ***патрыярхальныя сем'і***.

**Б. Суседска-родавая абшчына.** Склад родавай абшчыны пачаў змяняцца. У бронзавым і асабліва жалезным вяках у абшчыну ўваходзілі не толькі родзічы, але і значная колькасць суседзяў. Насельніцтва суседніх родавых абшчын земляробаў і жывёлаводаў змешвалася.



Умацаванае паселішча (гарадзішча) патрыярхальнага роду каля в. Малышкі Вілейскага раёна *(рэканструкцыя)*

Абшчына мела рысы як родавыя, так і суседскія. Такую абшчыну называюць **суседска-родавай**. Ужываюць таксама назву *познародавая* абшчына.

Сем'і былой родавай абшчыны цяпер ужо былі на некалькіх блізка размешчаных паселішчах. Члены абшчыны супольна валодалі палямі, пашамі, лясамі і вадаёмамі.

Адначасова кожная сям'я распараджалася вынікамі сваёй працы. На чале суседска-родавай абшчыны стаяў *савет старэйшын*. У ім былі прадстаўнікі ад кожнага паселішча.

У абшчыне земляробаў і жывёлаводаў з'явіліся



Бронзавы наканечнік дзіды, які зроблены 4000 гадоў назад, знойдзены каля в. Рудня Шлягіна Веткаўскага раёна



Каменная арнаментаваная булава (жазло) бронзавага веку — прымета ўлады яе валадара

першыя прыметы расслаення на больш заможных і бедных абшчыннікаў.

**Гістарычная даведка.** Аб з'яўленні маёмаснай няроўнасці сведчаць пахавальныя помнікі таго часу. Пры раскопках у бедных пахаваннях знаходзяць адзін гаршчок ці адну прыладу працы. У іншых пахаваннях рэчаў зусім няма. Некаторыя ж магілы налічваюць дзесяткі знаходак. Сярод іх вельмі каштоўныя ў той час медныя, бронзавыя і бурштынавыя вырабы (§ 12, п. Г).

**В. Прыметы няроўнасці ў грамадстве.** Людзі вынаходзілі металічныя прылады працы, апрацоўвалі зямлю, разводзілі жывёлу. Кожны жадаў лепш забяспечыць свае патрэбы. І ніхто не ведаў, да якіх новых важных змен у жыцці грамадства гэта прывядзе.

Стваралiся *ўмовы для накаплення багаццяў* у руках асобных калектываў унутры родавай абшчыны. Гэта прыводзіла да выдзялення патрыярхальных сем'яў. Багацці пачалі нераўнамерна размяркоўвацца сярод іх. Напрыклад, у адных сем'яў было больш жывёлы, чым у другіх. Паміж багатымі і беднымі сем'ямі пачалі складвацца адносіны панавання і прыгнечання.

Усё часцей і часцей адбываліся сутычкі паміж



Гарадзішча ў в. Лукомль Чашніцкага раёна на беразе р. Лукомкі *(сучасны выгляд)*

асобнымі абшчынамі, родамі і плямёнамі. У час сутычак людзі імкнуліся захапіць як мага больш здабычы. Так узніклі войны.

Войны былі сродкам узбагачэння племянной знаці, правадыроў родаў і плямён, якія са слуг грамадства ператвараліся ў паноў над ім.

**Г. Будаўніцтва гарадзішчаў.** У раннім жалезным веку ўзнікла неабходнасць будаўніцтва ўмацаваных паселішчаў, так званых ***гарадзішчаў***.

Гарадзішчы ўмацоўваліся землянымі валамі, равамі, драўлянымі сценамі. Гэта рабілася з прычыны магчымага нападу суседзяў, якія маглі захапіць статкі жывёлы і іншую маёмасць роду.

На тэрыторыі Беларусі знаходзіцца каля 1000 гарадзішчаў. Размяшчаюцца яны часцей за ўсё на пагорках, якія абкружаны нізінамі, ярамі ці ручаямі.

З таго боку гарадзішча, дзе не было такіх прыродных перашкод, насыпалі вал або выкопвалі роў. Сустракаюцца гарадзішчы ў забалочанай роўнай мясцовасці, умацаваныя з усіх бакоў.

Звычайна плошча гарадзішча невялікая — ад чвэрці да палавіны гектара. Ёсць гарадзішчы ранняга жалезнага веку яшчэ меншыя. На Беларусі ў кожнай вобласці захаваліся старажытныя гарадзішчы. Найбольшая колькасць гарадзішчаў ранняга жалезнага веку выяўлена ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях.

---

*З развіццём жывёлагадоўлі і земляробства надзвычай узрасла роля мужчыны ў гаспадарчым жыцці абшчыны. Утвараліся патрыярхальныя сем'і. З'яўляліся прыметы маёмаснай няроўнасці ў грамадстве. Паміж асобнымі абшчынамі, родамі і плямёнамі адбываліся сутычкі і войны. Для абароны ў час нападзення будаваліся гарадзішчы.*

**Пытанні і заданні**

1. Падлічыце, за колькі стагоддзяў да нашай эры пачаўся на Беларусі ранні жалезны век. 2. Чаму ў бронзавым і раннім жалезным вяках у грамадстве ўзрастала роля мужчынскай працы? 3. Пра якую з'яву ў грамадскім жыцці сведчыць распаўсюджванне гарадзішчаў на Беларусі ў жалезным веку? 4. Даведайцеся, ці ёсць у вашым раёне старажытныя гарадзішчы. У якіх месцах яны знаходзяцца? Як іх называе мясцовае насельніцтва? 5. Выпішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: *патрыярхальная сям'я, суседска-родавая абшчына, гарадзішча.*

# Тэма 4. НАБЫТКІ КУЛЬТУРЫ НАШЫХ ПРОДКАЎ

## § 10. МОВА НАШЫХ ПРОДКАЎ

*Успомніце: 1. Хто такія арыі? 2. Калі яны праніклі ў Іран і Індыю?*

**А. Роднасныя мовы.** Найбуйнейшай у Еўропе групай народаў з'яўляюцца славяне. Усе славяне аб'яднаны агульнасцю паходжання і роднасцю моў. Да ўсходніх славян належаць беларусы, рускія, украінцы.

Мовы ўсіх славян складаюць асобную групу




Схема размяшчэння індаеўрапейцаў

*індаеўрапейскай сям'і моў*. Да індаеўрапейскай сям'і моў належаць мовы амаль усіх сучасных народаў Еўропы, уключаючы нямецкую, англійскую, французскую.

Цяжка сабе ўявіць, што ўсе мовы, на якіх размаўляюць народы Еўропы, а таксама Ірана, Індыі, з'яўляюцца сваяцкімі, што ўсе яны паходзяць ад адной прамовы. Але так яно адбылося.

**Сведчанне вучоных-мовазнаўцаў.** Кожны, хто вывучае замежныя мовы, не можа не звярнуць увагі на дзіўнае падабенства паміж асобнымі словамі. Так, беларускі назоўнік маці не толькі агульнаславянскае слова, але ўласціва і многім іншым мовам: па-нямецку муттэр, па-лацінску матэр, па-старажытнагрэчаскаму мэтэр і г. д. Славянскія мовы ўваходзяць у склад так званых індаеўрапейскіх моў, да якіх адносяцца таксама мовы балцкія, германскія і іншыя.

Гэта сведчыць пра тое, што большасць сучасных народаў Еўропы маюць агульныя карані свайго паходжання. Якія ж гэтыя карані?

**Б. Індаеўрапейцы.** Прыкладна 4,5 тыс. гадоў назад шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў рассяліліся на вялікай тэрыторыі Еўропы і Азіі, ад Волгі да Рэйна. Гэта былі індаеўрапейцы. Першапачаткова яны жылі ў Малой Азіі побач з Іранам.

Індаеўрапейскія плямёны таксама пранiклі на тэрыторыю Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і Цэнтральнай Еўропы. Пазней індаеўрапейцы змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. Адна іх група афармілася ў балтаў, другая — у славян, трэцяя — у германцаў.

Звыш 3 тыс. гадоў назад індаеўрапейцы дасягну-




Тэрыторыя рассялення славян каля 2000 гадоў назад

лі Індыі. У Іране і Індыі яны называліся *арыямі*.

Мова індаеўрапейцаў мела шмат гаворак. Далейшае развіццё гэтых гаворак прывяло да стварэння розных груп індаеўрапейскіх плямён і народаў.

Такім чынам, у глыбокай старажытнасці продкі шматлікіх народаў Еўропы і часткова Азіі жылі бліжэй адзін да аднаго. Іх лёс быў адзіным. Мовы таксама былі больш падобнымі, чым цяпер.

Але пастулова народы далёка разышліся. Яны змешваліся з іншымі плямёнамі. У выніку стварылася тая разнастайнасць народаў Еўропы, якую мы назіраем цяпер.

**В. Прарадзіма славян. Рассяленне славян у Еўропе.** *Прарадзімай славян*, месцам іх пачатковага пражывання вучоныя лічаць шырокі абшар. Ён ахоплівае вярхоўі рэк Одры (Одэра), Віслы, Днястра, Прыпяці і прасціраецца далей на ўсход да Дняпра і Дзясны. *(Знайдзіце на карце гэтыя рэкі.)*

Продкі славян (іх называюць *праславянамі*) распаўсюдзіліся на значныя прасторы Еўропы.

Міналі стагоддзі. У Еўропе ўтварылася некалькі груп старажытных славянскіх плямён. Тэрыторыя рассялення балтаў была таксама вялікай. Яна ахоплівала басейны Нёмана, Заходняй Дзвіны, Верхняга Падняпроўя, вярхоўяў Волгі і Акі.

**Г. Гісторыя, запісаная ў геаграфічных назвах.** Зямля не толькі захоўвае рэшткі старажытных паселішчаў. Яна сама з'яўляецца своеасаблівай кнігай, на старонках якой гісторыя насельніцтва запісана ў геаграфічных назвах.

Чалавек здаўна называў рэкі, азёры на сваёй мове. У назве коратка, выразна адзначалася асноўная прымета вадаёма. Калі на гэту тэрыторыю прыходзіла іншае насельніцтва, яно пераймала назву ракі ці возера ў папярэднікаў. Таму шматлікія назвы рэк на тэрыторыі Беларусі захавалі карані, якія ёсць у балцкіх (літоўскай і латышскай) мовах. Адсюль назвы *Волча, Гайна, Друць, Нача, Палата, Эса* і інш.

Возьмем для прыкладу назву ракі Эса, якая



Выгляд уязных варот у паселішча праслявян (Польшча)

ўпадае ў Лепельскае возера. Назва ўтворана на аснове балцкага тэрміна *«эсе́»*, што азначае «брод». Назва ракі Палата паходзіць ад слова *«пал»* — «балота», «лужа».

Вучоныя зрабілі вывад, што на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ў раннім жалезным веку жылі балцкія (лета-літоўскія) плямёны.

Славяне з'явіліся тут пазней. Яны выцеснілі

балтаў або змяшаліся з імі. Новае насельніцтва карысталася старымі назвамі рэк і азёр. Так вельмі старажытныя назвы дажылі да нашых дзён.

**Пытанні і заданні**

1. Да якой сям'і народаў належаць усе славянскія мовы, уключаючы беларускую? 2. На якой тэрыторыі рассяляліся індаеўрапейцы? 3. Якая тэрыторыя лічыцца прарадзімай славян? 4. На аснове чаго зрабілі вывад аб прыналежнасці старажытнага насельніцтва Беларусі да балтаў? 5. Выпішыце і растлумачце паняцці: *індаеўрапейская сям'я моў, прарадзіма славян.*

## § 11. НАРОДНЫЯ ВЕРАВАННІ І СВЯТЫ

*Успомніце: Якія вам вядомы беларускія легенды, міфы і паданні? (Выкарыстайце веды, здабытыя раней.)*

**А. Пакланенне з'явам прыроды на Беларусі.** Старажытнаму чалавеку свет у цэлым уяўляўся адушаўлёным. Наш продак верыў, што дрэвы маюць душу, валодаюць пачуццямі і могуць дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Па гэтай прычыне ён пакланяўся дрэвам, многім іншым з'явам прыроды.

Асабліва шанаваўся дуб. Яму прыносілі ў ахвяру жывёл, птушак, а часам рабоў. Лічылася, што такім чынам можна заахвоціць, угаварыць дрэва дапамагаць людзям у будучых справах. Звычайна пад вялікім дубам ставілі ідала Перуна. Таму і сам дуб лічыўся свяшчэнным.

Існаваў звычай пакланення вужам. *Звычай* — гэта правілы паводзін,



Знак Сонца, агню і дамашняга ачага — характэрны арнамент для індаеўрапейцаў на бронзавым упрыгажэнні з Лукомля Чашніцкага раёна

Вужыны цар з залатой каронай на галаве



якіх прытрымліваюцца людзі. У вужах бачылі пасланцоў добрых багоў. Таму да іх звярталіся з малітвамі (просьбамі) аб хуткім дажджы, добрым ураджаі, а часам аб простым чалавечым шчасці.

У беларусаў існуе шмат легенд пра ваўкоў. Яшчэ старажытнагрэчаскі гісторык Герадот запэўніваў, што людзі з плямён неўраў, якія жылі паблізу ракі Прыпяці, былі чараўнікамі. Кожны з іх ператвараўся хоць адзін раз у год на некалькі дзён у ваўка. Такі пярэварацень меў сваю назву — «ваўкалак».

На Беларусі і ў Летуве (Літве) быў вельмі шырока распаўсюджаны культ камянёў, пакланення ім. Некаторыя камяні нават мелі ўласныя імёны: «Кравец», «Змееў камень», «Чортаў ступень». Лічылася, што ўсе яны маюць магічную сілу, лечаць хворых.

**Б. Народныя абрады і святкаванні земляробаў.** Магутныя нязведаныя сілы прыроды здаўна выклікалі ў чалавека не толькі страх, але імкненне падпарадкаваць іх, прымусіць служыць сабе.

Каб забяспечыць высокі ўраджай, дабрабыт сям'і, захаваць жывёлу, выконваліся розныя тайныя абрады, спраўляліся святы.

Увесь год селянін жыў клопатам аб зямлі і ўраджаі. Стваралася гадавое кола народных свят і абрадаў. У ім не было ні пачатку, ні канца. За зімой ішла вясна са сваімі патрэбамі, потым лета, затым багатая на дары прыроды восень, зноў зіма і так бясконца. Ужо зімой людзі імкнуліся ствараць

умовы для будучага ўраджаю. Яны рыхтавалі насенне, коней, валоў.

Разгледзім найбольш важныя народныя святкаванні.

***Каляды*** — пачатак язычніцкага святкавання ў гонар зімовага сонцастаяння. *Сонцастаянне* — гэта той момант, калі дзень пачынае памяншацца ці, наадварот, павялічвацца. Паводле народнага выразу, «ад Каляд Сонца паварочваецца на лета».

*(Успомніце, чаму адбываецца змена вышыні Сонца, якая з 22 снежня да 22 чэрвеня ўзрастае, а затым змяншаецца.)*

Паводле вельмі старажытных поглядаў, гэта пачатак новага жыцця, аднаўлення прыроды.

У аснову Каляд пакладзена старажытная сялянская абраднасць. Яе прызначэннем з'яўлялася паскарэнне надыходу цяпла, атрыманне багатага ўраджаю ў новым гаспадарчым годзе.

На Каляды праводзілі ігрышчы. Танцавалі, гулялі, слухалі казкі, адгадвалі загадкі. Насілі «звязду» — рухомую шматпрамянёвую зорку. У язычнікаў яна абазначала свяціла, адраджэнне якога святкавалі. Спявалі абрадавыя песні. Вечарам моладзь хадзіла па вёсцы з віншаваннем. Усе сабраныя пачастункі дзялілі каляднікам пароўну.

***Масленіца*** — старажытнае свята, прысвечанае провадам зімы і сустрэчы вясны. Яно звязана з культам прыроды, ушанаваннем продкаў. На свята пяклі бліны, аладкі. Выконваліся абрады, якія павінны былі паскараць абуджэнне прыроды, магічна садзейнічаць ураджаю і дастатку селяніна.

У апошні дзень масленага тыдня быў звычай гукання вясны. Вадзілі карагод, спявалі веснавыя песні. Некаторыя песні напаміналі пра звычай куплі-продажу нявест. Асаблівасцю свята было выгукванне «Гу-у!».

**Гістарычная даведка.** На Беларусі быў пашыраны звычай ваджэння і пахавання «стралы». Асноўнымі дзеяннямі былі ваджэнне карагодаў, гульні, а таксама шанаванне «громавых стрэлак» — выпадкова знойдзеных каменных сякер і іншых



Гліняныя прасліцы для верацён з арнаментам, у якім адлюстравана Сонца (ад цэнтра адыходзяць прамені)

старажытных вырабаў. «Стрэлкі» абагатвараліся, іх насілі на целе. Абавязковай была песня «Ой, пушчу стралу па ўсяму сяпу...».

*Купалле* — найбольш папулярнае летняе свята. Яго гісторыя вельмі даўняя і пачынаецца з каменнага веку. Паходжанне купальскіх святкаванняў звязана з культам Сонца і раслін. Павер'і і вераванні, дзеянні і песні былі непасрэдна звязаны з гаспадарчымі клопатамі сялян.

Існавала легенда, паводле якой у купальскую ноч нібыта расцвітае папараць-кветка. Той, хто яе адшукае, можа авалодаць зямнымі скарбамі.

Распальвалася агнішча. Каля яго частаваліся абрадавай стравай. Моладзь пераскоквала цераз агонь. Ён лічыўся ачышчальным ад злых духаў. Купалле — свята моладзі і кахання.



Абрад здабывання «жывога» агню

**Сведчанне вучонага.** У нашых продкаў вельмі доўга быў распаўсюджаны культ агню. Агонь называлі «богам», «святым агнём».

Этнографы сабралі цікавыя даныя аб звычаі святога «жывога» агню на Беларусі. Звычай перадаваўся з роду ў род і дажыў да XIX стагоддзя.

Святы агонь, паводле народных вераванняў, мае ўласцівасць ахоўваць чалавека ад шматлікіх бедстваў.

Здабываць святы «жывы» агонь трэба было спосабам свідравання сухога дрэва. Рабілі гэта гуртам з дапамогай збудавання, якое было вышэйшае за рост чалавека. Бервяно круцілі некалькі чалавек з дапамогай вяроўкі. Атрыманы агонь называлі свяшчэнным. Яго ўрачыста пераносілі ў новую, толькі што збудаваную печ і старанна захоўвалі, каб ён не патух.

Калі на паселішчы з'яўляліся эпідэмічныя хваробы ці быў падзеж жывёлы, таксама здабывалі свяшчэнны агонь. Яго разносілі па канцах вуліцы і падтрымлівалі днём і ноччу, каб забараніць уваход непажаданым гасцям.

***Жніво*** — свята, якое мела свае разнастайныя звычаі і абрады. Сярод іх вылучаліся *дажынкі*, калі на полі зжыналіся апошнія снапы збожжа. З нязрэзаных сцяблін, якія засталіся, завівалі «бараду». Іх злучалі разам і зверху каля каласоў перавязвалі чырвонай і белай стужкамі.

Каласы ўкладвалі ў самы вялікі сноп і запляталі «ў касу». Са снапа выцягвалі вялікія каласы і завівалі вянок, які ўскладалі на галаву жнейкі. Пасля ішлі ў вёску і спявалі песні жніва.

**В. Абрадавыя песні.** *Абрад* — гэта сукупнасць дзеянняў, у якіх праяўляюцца вераванні людзей. Абрады былі немагчымымі без песень. Іх старадаўнія ўзоры дажылі да нашых дзён. Гэта песні калядныя, веснавыя, купальскія, восеньскія і іншыя.

Многа песень сямейна-абрадавых — радзінныя (хрэсьбінныя), вясельныя, пахавальныя.

У свята *Гуканне вясны* моладзь збіралася на ўзгорках за сялом або на дахах клецяў, пуняў. Тут спявалі песні, так званыя вяснянкі. У песнях было шмат веснавой сімволікі, напрыклад «замыканне зімы» і «адмыканне вясны». У найбольш старажытных песнях прысутнічае зварот да маці як старэйшыны роду:

Блаславі, маці,
Вясну адмыкаці,
Зіму замыкаці.

У песнях, прысвечаных Калядам, захаваліся сляды магіі (чараўніцтва), што быццам садзейнічала ўраджаю і дабрабыту ў сямейнай гаспадарцы.

*Абрадавыя песні — сапраўднае багацце духоўнай культуры беларускага народа.*

**Пытанні і заданні**

1. Чым вызначаўся культ прыроды ў старажытнасці? 2. Што агульнае ў паняццях *звычай* і *абрад*? 3. Якім з'явам прыроды пакланяўся старажытны чалавек (назавіце 3—4 прыклады). 4. Пералічыце народныя святы земляробства, якія вам вядомы. 5. Як вы разумееце народны выраз «ад Каляд Сонца паварочваецца на лета»? Што такое сонцастаянне? 6. Як нашы продкі святкавалі Купалле? 7. Як вы адносіцеся да захавання старых народных традыцый? Сваю думку абгрунтуйце. 8. Выпішыце і растлумачце паняцці: *культ камянёў, гуканне вясны.*

## § 12. БЫТАВЫЯ ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ

*Успомніце: 1. Што такое род і племя? 2. Калі адбываўся распад родавых абшчын? 3. Што такое суседска-родавая абшчына?*

**А. Шлюбна-сямейныя адносіны.** Сям'я — гэта група родзічаў, якія жывуць разам,— муж, жонка, бацькі з дзецьмі. Такое вызначэнне нашай сям'і цяпер.

У глыбокай старажытнасці было інакш. Сям'я, *шлюб* маюць сваю доўгую гісторыю. У родавай абшчыне маладому чалавеку можна было жаніцца толькі з дзяўчынай з другога роду. Мужчыны аднаго роду бралі нявест з другога роду, а сваіх маладых сваячак туды аддавалі замуж.

З распадам родавых абшчын распаўсюджваліся новыя звычаі. Пастулова ўсталёўвалася аднашлюбная сям'я. Яна больш трывала аб'ядноўвала мужа і жонку. *(Успомніце, што азначае паняцце «звычай».)*

Згодна з новым звычаем, становішча жонкі ў сям'і пагоршылася. У мужчыны заўсёды была перавага ў асабістых і маёмасных адносінах. Мужчына меў больш маёмасці, чым жанчына.

Багатай разнастайнымі звычаямі была сямейная абраднасць. Яна звязана з важнейшымі падзеямі ў жыцці чалавека: нараджэннем, шлюбам, смерцю.

**Б. Клопат аб дзецях.** Нараджэнне дзіцяці лічылася важнай падзеяй, а таму суправаджалася шэрагам цікавых абрадаў. *(Успомніце, што азначае паняцце «абрад».)* Перш за ўсё выконваўся ачышчальны абрад.

Народжанае немаўля патрэбна было ачысціць (пазбавіць) ад уплыву злых духаў. Для гэтага яго абмывалі вадой, пасля чаго дазвалялі іншым людзям мець зносіны з ім.

Вядома, што выхаванне пачынаецца з самага нараджэння і толькі яно пастуловаператварае жывую істоту ў чалавека. Заўжды было і будзе так, што першы і галоўны выхавацель — гэта маці, чалавек, які дае ўсім жыццё.

Усё гэта вельмі добра разумелі нашы продкі. Яны шчыра клапаціліся аб тым, каб дастойна перадаць немаўля на выхаванне маці.

Вось як гэта рабілі. Дзіця з пашанаю, як найвялікшую каштоўнасць, бралі на рукі і асцярожна



Гліняная статуэтка каня, якая зроблена 2000 гадоў назад *(знойдзена на Гарошкаўскім гарадзішчы Рэчыцкага раёна)*

клалі на парог хаты ці на патухлы ачаг. Пасля гэтага яго паднімалі, абносілі вакол жылля і ласкава цалавалі.

Наступным прадметам абраду была купель — ачышчальны абрад абмывання дзіцяці. (*Купель* — гэта выдзеўбаная з тоўстага бервяна пасудзіна, у якой славяне мыліся самі і купалі сваіх дзяцей.) Немаўля мылі ў купелі.

Галоўнай мэтай абраду была ахова жанчынай-маці яе маленькага дзіцяці ад уплыву злых духаў. Пасля гэтага абраду дзіця лічылася прынятым у склад сям'і.

Дзяўчынак працягвалі выхоўваць іх маці. Дзяўчынкі дапамагалі ў хатніх справах. Старэйшая па ўзросту назірала за малодшымі дзецьмі. З хлопчыкамі было інакш. Праз гады наставаў час вучыць іх мужчынскай справе: араць зямлю, секчы дровы, запрагаць каня і ездзіць на ім вярхом. Мужчына — гэта будучы гаспадар, карміцель сям'і, яе апора і надзея.

Хлопчык перадаваўся на выхаванне бацькі, што таксама суправаджалася абрадам. На ўрачыстым сямейным свяце бацька або іншы родзіч абстрыгаў у хлопчыка некалькі пасмаў на галаве. Гэта азначала, што хлопчык пераходзіў з-пад апекі маці на выхаванне да бацькі.

Абрад атрымаў у славян назву «пострыг». *(Самастойна растлумачце паходжанне гэтай назвы.)* Пасля пострыгу хлопчык пад наглядам бацькі ўпершыню садзіўся вярхом на каня. Для дзяцей гэта было сапраўдным святам. У такія моманты іх хваляванню і радасці не было канца.



Арнаментаваны гліняны посуд бронзавага веку з Паўднёвай Беларусі

**В. Вясельны абрад.** Гісторыя не даносіць да нас звестак аб тым, з якога ўзросту ў жалезным веку юнакі і дзяўчаты лічыліся дасягнуўшымі паўналецця. Толькі спецыяльныя прычоска ды вянок на галаве з'яўляліся прыметамі, што дзяўчына ўступае ў шлюбны ўзрост.

Уступленне ў шлюб лічылася надзвычай важнай падзеяй у жыцці маладых людзей. Шлюб паміж родзічамі забараняўся, бо лічыўся шкодным.

У тыя часы зарадзіліся такія віды шлюбу, як «умыканне» (выкраданне) і купля-продаж нявесты. Малады мужчына адпраўляўся здабываць сабе жонку з другога роду. Пазней гэты звычай быў заменены шлюбам па дамоўленасці. Выкуп — гэта плата за нявесту паводле дамоўленасці абодвух бакоў.

Пасланцы маладога (сваты) дамаўляліся з бацькам маладой аб шлюбе і памеры выкупу. Калі дасягалася згода, то праз некаторы час адбывалася вяселле.

Малады і маладая дарылі адзін аднаму падарункі. У славян асабліва жаданым быў яблык. Ён меў значэнне кахання, вернасці і ўрадлівасці. Звычай дарыць пярсцёнак прыйшоў да нашых продкаў пазней з Візантыйскай дзяржавы і захаваўся да нашага часу.

У час ***вяселля*** маладую ўсаджвалі на звярыную шкуру. У гэты момант гасцям раздавалі вясельны «калач» ***(каравай)***. Маладая развязвала мужу абутак. Гэта было прыметай таго, што яна дае згоду поўнасцю падпарадкавацца свайму суджанаму.

Вяселле з вельмі даўніх часоў суправаджалася карагодам, песнямі і рознымі маскарадамі. Усюды разносіліся ўрачыстыя гукі бубна і кранаючы душу напеў жалейкі. Вяселле ператваралася ў сапраўднае свята, якое запаміналася прысутным, асабліва жаніху і нявесце, на ўсё жыццё. Толькі людзі з адкрытай душой былі здольны на такое свята.

**Г. Пахавальныя абрады.** Звычай пахавання памёршага звязаны з узнікненнем пачаткаў рэлігійных вераванняў. У звычаі пахавання адлюстроўваўся клопат аб памёршым суродзічу. Па ўяўленню старажытных людзей, душа памёршага працягвае сваё існаванне і пасля смерці чалавека.

З аднаго боку, памёршага баяліся, ён выклікаў страх, з другога — яго імкнуліся задобрыць, улагодзіць, упрасіць не пакідаць родзічаў, дапамагаць ім.

Розныя плямёны прытрымліваліся розных пахавальных звычаяў. Найбольш распаўсюджанымі былі два абрады. Па першаму абраду цела памёршага змяшчалася ў яму ці, як кажуць, закопвалася ў зямлю (грунт).

Паводле другога абраду памёршага спальвалі на агні. Агонь лічылі свяшчэннай ачышчальнай сілай. Яму і аддавалі нябожчыка.

Старажытныя людзі верылі, быццам бы памёршаму «на тым свеце»



Пахаванне чалавека ў скурчаным стане з глінянымі гаршкамі і іншымі рэчамі бронзавага веку



Рэчы з багатага курганнага пахавання бронзавага веку каля в. Ходасавічы Рагачоўскага раёна: крамянёвыя наканечнікі стрэл, бронзавая сякера і наканечнік дзіды

неабходна ўсё, чым ён карыстаўся пры жыцці. Таму нябожчыку клалі яго рэчы, якія нібыта патрэбныя ў «замагільным жыцці».

Гэта былі ўпрыгажэнні, зброя, прылады працы і хатняга ўжытку.

У бронзавым і раннім жалезным вяках на тэрыторыі Беларусі існавалі два гэтыя звычаі. Яшчэ быў звычай насыпа́ць над магіламі памёршых курганы. Курган — гэта насып з пяску ці з іншага грунту. Сярэдняя вышыня кургана складала 1—2 метры. Былі курганы зусім малыя. Але вышыня асобных насыпаў дасягала 3—4 метраў.

*** Гістарычная даведка.** Вучоныя даследавалі курганны могільнік бронзавага веку каля вёскі Ходасавічы ў Рагачоўскім раёне на Гомельшчыне. Большасць пахаванняў былі ў ямах пад курганным насыпам. Цела памёршага змяшчалі ў яму ў скурчаным стане. Нябожчыка пасыпалі вохрай (прыродная фарба чырвонага колеру). Зверху яму насцілалі бярвеннем. З нябожчыкам у магілу клалі гліняныя пасудзіны з ядой, крамянёвыя прылады працы, медныя сякеры, наканечнікі стрэл, нажы, упрыгажэнні.
Такім чынам, да нас дайшлі рэчы, зробленыя 4 тыс. гадоў назад, якія шмат што расказалі аб жыцці сваіх гаспадароў. У адным з курганоў знайшлі каля 90 рэчаў. Сярод іх былі 27 крамянёвых наканечнікаў стрэл, 2 бурштынавыя падвескі. Побач з гэтым сустракаюцца пахаванні, у якіх рэчаў вельмі мала (дзве-тры) ці наогул іх няма. *(Зрабіце вывад, аб чым гэта можа сведчыць.)*

**Пытанні і заданні**

**1.** З якімі важнымі падзеямі ў сям'і была звязана старажытная сямейная абраднасць? **2.** Чаму ў нашых продкаў многа абрадаў звязана з нараджэннем дзяцей і іх выхаваннем? **3.** Якія якасці выхоўвалі нашы продкі ў хлопчыкаў і дзяўчынак? **4.** Падрыхтуйце кароткія вусныя апавяданні на тэмы: «Хлопчык вучыцца быць гаспадаром», «Дзяўчына рыхтуецца да вяселля». **5.** Якім быў звычай выкупу нявесты? **6.** Як выглядзеў пахавальны курган?* **7.** Якімі звесткамі папоўнілася гістарычная навука ў выніку раскопак курганоў каля вёскі Ходасавічы ў Рагачоўскім раёне? **8.** Запішыце ў сшытак і растлумачце наступныя паняцці: *шлюб, вяселле, каравай, карагод.*

## § 13. З'ЯЎЛЕННЕ МАСТАЦТВА

***Успомніце:* 1.** *Калі людзі пачалі займацца мастацкай дзейнасцю?* **2.** *У якіх краінах выяўлены малюнкі на сценах і столях пячор, зробленыя каля 30 тыс. гадоў назад?*

**А. Старажытная скульптура.** ***Скульптура*** — гэта від мастацтва, стварэнне аб'ёмнага вобраза. У Еўропе на шэрагу стаянак каменнага веку выяўлены статуэткі жанчын, якія зроблены каля 25 тыс. гадоў назад. Скульптурны вобраз чалавека або жывёлы называецца ***статуяй. Статуэтка*** — невялікая статуя.



Статуэтка жанчыны, зробленая з ікла маманта (каля 25 000 гадоў назад) *(злева)*. Статуэткі са стаянкі Асавец (каля 4000 гадоў назад) *(справа)*

Старажытная статуэтка жанчыны была знойдзена беларускімі вучонымі на стаянцы каля вёскі Елісеевічы на тэрыторыі Бранскай вобласці. Скульптурная выява мае вышыню 15 сантыметраў. Яна выразана з біўня маманта. У скульптурнай выяве жанчыны натуральна паказана фігура. Першабытныя людзі верылі, што такія статуэткі прынясуць ім поспех.

У канцы каменнага веку ў скульптурах больш увагі аддавалася твару. Пра гэта сведчаць дзве галавы статуэтак, выяўленых на стаянцы каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна (§ 4, п. Б).

Адна статуэтка драўляная. У ёй даволі дакладна адлюстраваны вобраз мужчыны таго часу. Аб суровым яго выглядзе гавораць глыбокія і нізкія вачаніцы і насупленасць твару. Другая выява выразана з рога. Яна дае ўяўленне аб мужчыне з выцягнутым

тварам, высокім ілбом і вострай барадой. Хутчэй за ўсё гэта вобразы міфічных герояў. Разам з тым у іх выявіліся характэрныя рысы тагачасных людзей.

Рабіліся статуэткі звяроў і птушак. Паляўнічым было карысна ведаць іх асаблівасці ў час палявання. У той жа вёсцы Асавец знойдзена статуэтка лася. Жывёліна паказана ў напружанай позе, гатовая да скачка.

У раннім жалезным веку рабілі фігуркі жывёл з гліны. Гліняныя статуэткі коней знаходзяць на гарадзішчы мілаградскіх плямён. Гэта былі культавыя вырабы для рэлігійных мэт. Яны сведчаць аб шанаванні прыручанага каня. *(Пакажыце на карце, дзе жылі мілаградскія плямёны.)*

**Б. Вытокі арнаменту**. У канцы каменнага і пачатку бронзавага веку дасягае росквіту арнаментаванне гліняных пасудзін. ***Арнамент*** — гэта нанесены на паверхню прадмета ўзор.

Надзвычай цікавыя малюнкі змешчаны на некаторых гліняных пасудзінах. На стаянцы каля вёскі




Міфалагічныя выявы: *а)* чалавек танцуе перад качкай; *б)* выява чалавека, нанесеная на косці



Арнамент на старажытным гліняным посудзе з Беларусі

Юравічы знойдзены кавалак пасудзіны з малюнкам чалавека, які танцуе перад качкай. Гэта нейкі міфалагічны эпізод.

У старажытныя часы арнаментаванне гліняных пасудзін мела магічнае значэнне. З распаўсюджаннем жывёлагадоўчых і земляробчых культаў звязана з'яўленне такіх арнаментаў, як круг, ромб, крыжападобныя фігуры. Гэтыя знакі былі сімваламі Сонца і іншых нябесных свяціл, плоднасці, вечнасці прыроды, яе кругавароту.

*** В. З'яўленне і ўдасканаленне ўпрыгажэнняў.** На першых вядомых нам стаянках людзей знойдзены падвескі — аздобы для адзення. Старажытныя людзі выраблялі падвескі з пласцінак біўня маманта. Знойдзены ўпрыгажэнні з зубоў ваўка, якія насілі на шыі.

Першабытны чалавек надаваў зубам жывёл чарадзейную сілу. Ён лічыў, што паляўнічы, на шыі якога красуюцца іклы мядзведзя, будзе дужы, як гэты звер. Аздоба з лісіных зубоў павінна была прыбавіць хітрасці яе ўладальніку.

У канцы каменнага веку насельніцтву Беларусі стала даступна новае рэчыва — ***бурштын.*** Трапляў ён да нашых продкаў шляхам абмену з берагоў

Бронзавая дыядэма з бурштынавымі падвескамі з пахавання (3500 гадоў назад)



Балтыйскага мора. З бурштыну вырабляліся падвескі, гузікі, пацеркі, кольцы на палец.

Упрыгажэнні насілі на шыі і запясці, нашывалі на вопратку. Адначасова яны адыгрывалі ролю амулетаў. Іх нашэнне, па тагачасных уяўленнях, засцерагала чалавека ад небяспекі, надавала яму моц у барацьбе за існаванне.

Асабліва любілі аздабляць сябе і вопратку жыхары Беларусі ў жалезным веку. У гэты час рабіліся бранзалеты ў выглядзе вялікага кольца, якое насілася вышэй кісці рукі.

Былі распаўсюджаны, асабліва ў зарубінецкіх плямён, металічныя ўпрыгажэнні — шпількі *(фібулы)* для зашпільвання верхняга адзення тыпу плашчоў-накідак. Вырабляліся шпількі з кавалкаў дроту. Іх знешняя паверхня часта аздаблялася ўзорам.

Прыгожа выглядалі бронзавыя жаночыя падвескі. Іх насілі, як каралі. Называюць падвескі ***лунніцамі***, таму што яны нагадваюць сярпок Месяца (Луны). У сярэдзіне кожнага вырабу былі невялікія паглыбленні. Яны запаўняліся шклопадобнай масай чырвонага колеру, якая назы-



Шпілька (фібула) з в. Чаплін Лоеўскага раёна (каля 2000 гадоў назад)

ваецца эмаллю. Найбольшую колькасць такіх лунніц знайшлі на паселішчы каля вёскі Адаменка ў Быхаўскім раёне.

**Г. Музычныя інструменты.** Старажытнейшыя людзі ўдарамі палак адна аб адну адбівалі рытм сваіх першых танцаў. Чалавек выдзёўбваў паглыбленне ў кавалку дрэва і абцягваў скурай. Так узнік ***бубен.*** Ён быў вядомы ў каменным веку ўсім плямёнам. Без яго не абыходзілася ні адна важная падзея.

Нашы продкі ведалі і іншыя музычныя інструменты. На стаянках каменнага веку выяўлены кавалкі трубчастых костак з прасвідраванымі адтулінамі. Гэта рэшткі духавых інструментаў. Яны былі падобныя на сучасныя беларускія дудкі, ці ***жалейкі.***

**Д. Міфалогія.** Пры слове ***«міфалогія»*** прыходзяць на памяць найперш антычныя багі і героі: Зеўс, Афіна, Геракл і інш. Гісторыя культуры розных народаў сведчыць, што не толькі старажытныя грэкі, а ўсе народы Зямлі стваралі свае міфічныя вобразы. Шкада, што дагэтуль застаецца мала каму вядома міфалогія старажытнейшых продкаў беларусаў.

Узорамі твораў пра далёкае мінулае беларускага народа, яго паходжанне з'яўляюцца міфалагічныя апавяданні пра волатаў і курганы-валатоўкі, у якіх нібыта пахаваны людзі незвычайна вялікія і дужыя.

На Беларусі былі шырока распаўсюджаны міфы пра дрэвы (дуб, бяроза), пра кветкі (папараць-кветка), пра паходжанне асобных рэк, азёр, балот. Беларусы, як і іншыя народы, у міфах імкнуліся растлумачыць навакольны свет (§ 11, п. А). Існавалі шматлікія паданні пра русалак, лесавікоў, дамавікоў.

Сёння наўрад ці хто-небудзь усур'ёз успрымае язычніцкіх бажкоў і іншых фантастычных істот. Яны страцілі рэлігійнае значэнне і засталіся ў народнай творчасці як персанажы народнай мастацкай фантазіі. Элементы міфалогіі зберагліся ў каз-

ках, замовах, купальскіх, вясельных песнях, пахавальных галашэннях. Міфы, няхай сабе самыя фантастычныя, дапамагаюць асэнсаваць гісторыю вельмі старажытнай народнай культуры.

---

*Міфалогія з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння ўзроўню грамадскага развіцця ў старажытныя часы, вераванняў і звычаяў нашых продкаў.*

**Пытанні і заданні**

1. Якое прызначэнне маглі мець жаночыя статуэткі ў каменным веку? 2. У чым вы бачыце асаблівасці старажытных упрыгажэнняў? 3. Якім аздобам чалавек надаваў цудадзейную сілу? 4. Што вы лічыце самым значным у старажытным мастацтве Беларусі? 5. Назавіце музычныя інструменты, якія былі вядомы нашым продкам у старажытнасці. З якіх матэрыялаў іх выраблялі? 6. Выпішыце ў сшытак і растлумачце паняцці: *скульптура, статуэтка, арнамент, бурштын, лунніца, бубен, жалейка, міфалогія.*

## ПАЎТАРАЛЬНА-АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ЎРОК ДА РАЗДЗЕЛА II

У II тысячагоддзі да н. э. на тэрыторыі Беларусі з'явіліся вырабы з медзі і бронзы. Пачынаўся век металаў. Развіваліся жывёлагадоўля і земляробства. Важнай падзеяй бронзавага веку быў пераход ад спажывецкай гаспадаркі да вытворчай. У гэты час працягвалася шырокае рассяленне індаеўрапейцаў.

У сувязі з новымі спосабамі гаспадарання ўзрастае роля мужчынскай працы. Надыходзяць змены ў грамадскім жыцці.

Узнікае маёмасная няроўнасць паміж асобнымі сем'ямі. На змену родавай абшчыне прыходзіць суседска-родавая.

Пачатак жалезнага веку звязаны з асваеннем людзьмі спосабаў атрымання жалеза і вырабу з яго розных рэчаў.

У раннім жалезным веку ўтвараюцца новыя групы плямён. Іх аб'ядноўваюць тып гаспадаркі, агульная тэрыторыя, традыцыі і звычаі. У гісторыі

Беларусі яны носяць умоўныя назвы: мілаградскія, зарубінецкія, днепра-дзвінскія плямёны, плямёны культуры штрыхаванай керамікі.

Нашы продкі маюць з іншымі славянскімі і балцкімі народамі агульныя карані паходжання ад індаеўрапейцаў.

Першабытны чалавек адчуваў страх перад многімі з'явамі прыроды (маланка, гром, стыхійныя бедствы) і не мог іх растлумачыць. Гэта садзейнічала ўзнікненню рэлігійных вераванняў, па сутнасці язычніцкіх.

Багатай звычаямі была сямейная абраднасць нашых продкаў. Яна шчыльна звязана з нараджэннем, шлюбам і смерцю чалавека.

*(Праверце, ці добра вы засвоілі матэрыял другога раздзела. Ад гэтага залежаць вашы поспехі ў вывучэнні наступнага сярэднявечнага перыяду гісторыі Беларусі ў 6-м класе.)*

**А. Работа з картамі**

Адзначце на карце (заданні трэба выконваць на контурных картах):

**1.** З якой часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі пачалося распаўсюджанне жывёлагадоўлі і земляробства?

**2.** Дзе прыкладна праходзілі межы рассялення мілаградскіх і днепра-дзвінскіх плямён?

**3.** У якіх абласцях сучаснай Беларусі выяўлена найбольшая колькасць гарадзішчаў ранняга жалезнага веку?

**4.** Дзе знаходзіцца прарадзіма славян?

**Б. Работа з храналогіяй**

**1.** Успомніце, калі пачаўся пераход да жывёлагадоўлі.

**2.** Калі пачаўся пераход да земляробства на Беларусі? Супадае гэта падзея па часе са з'яўленнем жывёлагадоўлі ці не супадае?

**3.** Успомніце асноўныя даты пачатку бронзавага і жалезнага вякоў на тэрыторыі Беларусі. Выпі-

шыце іх у храналагічнай паслядоўнасці. Якія важныя падзеі адбываліся раней, а якія пазней?

### В. Паўтарэнне асноўных паняццяў

**1.** Сябры, падзяліцеся пад кіраўніцтвам настаўніка на некалькі груп. Кожны ўдзельнік групы вызначае галоўныя паняцці з аднаго-двух параграфаў (па дамоўленасці), а затым правярае іх засваенне іншымі членамі групы.

**2.** Выпішыце асноўныя паняцці бронзавага і жалезнага вякоў у табліцу па прыметах (у кожным слупку павінна быць не менш за 7—8 паняццяў).

### Г. Выканайце заданні

**1.** Паразважайце над пытаннямі: якія падзеі і з'явы бронзавага і жалезнага вякоў мелі станоўчае, а якія адмоўнае значэнне? Напрыклад:

а) ці меў станоўчае значэнне пераход да вытворчай гаспадаркі?

б) станоўчае ці адмоўнае значэнне мела развіццё гандлю паміж плямёнамі?

в) што было станоўчым і што адмоўным у з'яўленні маёмаснай няроўнасці паміж сем'ямі і г. д.?

**2.** Карыстаючыся схемай да § 8, паспрабуйце даказаць, што з'яўленне вытворчай гаспадаркі было крокам наперад у развіцці грамадства.

**3.** Назавіце асноўныя прычыны ўзрастання ролі мужчынскай працы ў вытворчасці і грамадстве (не менш за тры).

**4.** Назавіце перавагі выкарыстання жалезных прылад працы ў параўнанні з каменнымі і бронзавымі (не менш за пяць).

**5.** Падумайце, дапамагала ці перашкаджала нашаму продку вера ў звышнатуральныя, боскія сілы.

**6.** Якімі каштоўнымі здабыткамі, вынайдзенымі нашымі продкамі ў бронзавым і раннім жалезным вяках, мы карыстаемся па сённяшні дзень? Аб чым гэта сведчыць:

а) аб нізкім узроўні нашага сучаснага развіцця;

б) аб вельмі высокім узроўні развіцця нашых продкаў;

в) аб паспяховай перадачы з пакалення ў пакаленне станоўчага вопыту нашых продкаў?

**7.** Абгрунтуйце выснову, што ўдасканаленне заняткаў і прылад працы прыводзіла да змен ва ўсім жыцці старажытных людзей.

### Д. Развіццё навыкаў і ўменняў разумовай працы

**1.** Параўнайце паміж сабой спажывецкі і вытворчы тыпы гаспадаркі. Зрабіце высновы (выкарыстайце парады дадатковага матэрыялу, змешчанага ў пачатку дапаможніка).

**2.** Паспрабуйце скласці план па адной з тэм, якія разглядаліся ў двух раздзелах: «Заняткі старажытных жыхароў Беларусі» (па матэрыялу § 3, 5, 7, 8) і «Супольнасці старажытных жыхароў Беларусі» (па матэрыялу § 6, 9).

**3.** Складзіце апавяданне аб прыгодах хлопчыка або дзяўчынкі ў часы бронзавага ці ранняга жалезнага веку. Дайце назву апавяданню. Звярніце ўвагу на заняткі людзей, прылады працы, грамадскія адносіны, вераванні і святы тагачаснага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі.

**4.** Да якога перыяду (каменны, бронзавы, жалезны вякі) гісторыі Беларусі можна аднесці ўзнікненне ткацтва, з'яўленне печаў-домніц, пераход да жывёлагадоўлі, распаўсюджанне ворыўнага земляробства, з'яўленне маёмаснай няроўнасці паміж людзьмі?

### Е. Гістарычнае краязнаўства

**1.** Даведайцеся, з якімі мясцінамі ў вашым краі (раёне, вобласці) звязаны цікавыя легенды і паданні. Якія яны даюць звесткі аб уяўленнях нашых продкаў пра навакольнае асяроддзе?

**2.** Апішыце адзін са старадаўніх звычаяў (абрадаў), якія захаваліся ў вашай мясцовасці. Паспрабуйце растлумачыць яго сэнс.

**3.** Звярніце ўвагу ў мясцовым краязнаўчым музеі на хатнія вырабы, якія аздоблены арнаментам. Выявіце сярод іх умоўныя выявы сонца і агню. Аб чым сведчыць наяўнасць гэтых знакаў?

**4.** Пагаварыце з людзьмі сталага ўзросту, даведайцеся з іх расказаў пра тое, якія захаваліся ў вашым краі абрады ўшанавання памяці продкаў.

**5.** Даведайцеся, якія старажытныя мастацкія вырабы былі знойдзены ў вашым краі. Апішыце іх. Адзначце:

а) з чаго яны зроблены;

б) ці былі на іх выявы людзей, звяроў і птушак;

в) зрабіце высновы аб мастацкіх уяўленнях, навыках і традыцыях продкаў.

**6.** Абгрунтуйце думку аб пераемнасці ў з'явах культуры (мастацтва) з пакалення ў пакаленне, ад продкаў да нашчадкаў.

## ВЫНІКОВА-АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ЎРОК ДА ЎСЯГО КУРСА

**І.** Удасканалім свае веды аб перыядах старажытнай гісторыі нашай краіны.

**1.** Археалагічныя перыяды («сістэма трох вякоў») у асноўным адпавядаюць агульнагістарычным: праабшчыне, родавай абшчыне і суседскародавай абшчыне.

Якія тры асноўныя перыяды вылучаюцца ў старажытнай гісторыі Беларусі з улікам матэрыялу, што служыў для вырабу прылад працы?

**2.** Акрамя таго, старажытная гісторыя Беларусі падзяляецца на вялікія перыяды ў залежнасці ад арганізацыі людзей у *форме той ці іншай супольнасці.*

Успомніце, якімі калектывамі жылі старажытныя насельнікі Беларусі. Чаму адбывалася змена адной супольнасці іншай?

**3.** У гісторыі Беларусі (як і іншых краін) можна прасачыць перыяды панавання спажывецкай гаспадаркі і гаспадаркі вытворчай.

Ахарактарызуйце спажывецкую і вытворчую гаспадаркі. Вызначце адметныя рысы адной і другой.

**II.** Гісторыя сведчыць, што пераход ад аднаго этапу развіцця да другога не адбываецца сам па сабе. У аснове гэтых змен ляжыць няспынная стваральная праца многіх пакаленняў людзей. Яны, змяняючы адно аднаго, перадаюць у спадчыну назапашаны вопыт папярэдніх пакаленняў. Кожны новы этап з'яўляецца больш высокай ступенню ў развіцці гаспадаркі і культуры, чым папярэдні.

**1.** Назавіце звязаныя з вынаходніцтвам новых прылад працы змены ў жыцці людзей. Дакажыце, што яны паляпшалі побыт пакаленняў.

**2.** Як са зменай прылад працы мяняліся заняткі людзей?

**3.** Якія прычыны абумовілі пераход да вытворчай гаспадаркі?

**4.** Чаму пасля ўзнікнення земляробства стала хутка расці насельніцтва кожнай вобласці?

**III.** Вы ўжо ведаеце, што чалавек — істота грамадская. Ён не можа жыць па-за грамадствам. Супольнае існаванне дапамагло чалавеку выжыць у цяжкіх умовах старажытнага часу.

**1.** Чаму нашы продкі гуртаваліся ў роды і плямёны? Што такое род, племя?

**2.** Што абмяркоўвалі на агульным сходзе племені (ці роду)? Якія рашэнні маглі быць прыняты?

**IV.** Калектыўная працоўная дзейнасць усебакова развівала чалавека. Ён пазнаваў навакольны свет, знаёміўся з уласцівасцямі рэчаў і з'яў. Шмат чаго наш продак не разумеў, не ведаў. Таму ён проста верыў у існаванне звышнатуральных сіл. У калектыўнай працы развіваліся мысленне, мова, зараджаліся мастацтва і міфалогія, узнікала рэлігія.

**1.** Знайдзіце ў навакольным жыцці адбіткі старадаўняга пакланення з'явам прыроды і духам.

**2.** Як вучоныя даведаліся аб існаванні ў старажытнасці рэлігійных вераванняў? У што верылі старажытныя людзі? Якіх багоў шанавалі?

3. Што было агульнае ў рэлігійных уяўленнях нашых продкаў і іншых народаў свету?

4. Аб якіх якасцях характару членаў роду маглі сведчыць прозвішчы «Лісіца», «Алень», «Мядзведзь» і іншыя?

5. Што такое міфы і міфалогія? Што вы ведаеце пра міфалогію беларусаў?

6. Даведайцеся, якія ў вашай мясцовасці існуюць легенды, паданні. Паспрабуйце вызначыць прычыны іх узнікнення і сапраўдны сэнс падзей, пакладзеных у аснову легенд.

7. Збярыце некалькі прымавак, прыказак, выслоўяў, у якіх ёсць адбітак старажытных рэлігійных уяўленняў.

V. Падвядзём некаторыя вынікі паўтарэння вывучанага матэрыялу па гісторыі Беларусі.

1. Даты: згадайце асноўныя даты вывучанага курса.

2. Паняцці: праверце, ці ведаеце вы асноўныя паняцці курса і іх значэнне (яны вылучаны чорным шрыфтам у «Спісе гістарычных паняццяў і новых слоў»).

## *ЗАКЛЮЧЭННЕ*

Юныя сябры! Вы закончылі вывучэнне падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў каменным, бронзавым і жалезным вяках. Гэта многія тысячагоддзі існавання і дзейнасці нашых продкаў. Першабытнае грамадства заклала аснову, на якой развівалася ўся далейшая культура чалавецтва.

Веды, набытыя вамі, дазваляюць зразумець, як развіваецца чалавечае грамадства.

1. Старажытная гісторыя — першая агульная ступень у гісторыі ўсіх народаў свету. Гэты перыяд быў самым працяглым у гісторыі чалавецтва. Старажытная гісторыя Беларусі — неад'емная частка сусветнай гісторыі.

2. Шэраг прылад працы, якія тады былі вынайдзены, існуюць (ці нядаўна існавалі) да нашага часу. Напрыклад, сякера, нож, матыка, саха, плуг.

Дагэтуль выкарыстоўваюцца лодка, човен, лыжы, вынайдзеныя нашымі продкамі. У тыя далёкія часы ўзніклі рэлігійныя культы, мастацтва (жывапіс, скульптура, музыка, фальклор) і нават танцы.

**3.** Развіццё народаў свету адбываецца нераўнамерна, з неаднолькавай хуткасцю. Вы ведаеце з усеагульнай гісторыі, што ў IV тысячагоддзі да н. э. утварыліся найстаражытнейшыя ў свеце дзяржавы ў даліне Ніла і Міжрэччы. У той час на тэрыторыі Беларусі працягваўся каменны век і росквіт родавага грамадства быў наперадзе.

Геаграфічнае асяроддзе — сукупнасць прыродных з'яў (клімат, глеба, багаты раслінны і жывёльны свет) спрыялі развіццю краін і народаў Старажытнага Усходу. Чым больш старажытны перыяд, тым большай была залежнасць людзей ад прыроды і геаграфічных умоў існавання.

**4.** Парадак жыцця найстаражытных людзей называецца першабытнаабшчынным ладам. Людзі сумесна працавалі, мелі агульную маёмасць і былі роўнымі паміж сабой. У бронзавым і асабліва жалезным вяках першабытны лад паступова пачаў слабець і распадацца. З'яўлялася маёмасная няроўнасць паміж асобнымі сем'ямі.

**5.** Асаблівасцю развіцця чалавецтва з'яўляецца паскарэнне ходу гісторыі. Каменны век працягваўся на тэрыторыі Беларусі некалькі дзесяткаў тысяч гадоў. Бронзавы і жалезны вякі былі ў многа разоў карацейшыя за каменны век.

У першабытным грамадстве каменныя востраканечнікі ці іншыя прылады працы нязначна змяняліся на працягу жыцця многіх дзесяткаў пакаленняў людзей (некалькі тысячагоддзяў). У наш час пры жыцці аднаго пакалення (40—50 гадоў) змяняецца многа відаў прылад працы і тэхніка апрацоўкі рознай сыравіны.

**6.** Кожны перыяд у гісторыі Беларусі (як і ў сусветнай гісторыі) непазбежна змяняецца іншым, больш высока развітым. Эпоха старажытнага грамадства змяняецца Сярэднявеччам (V—XV стагоддзі нашай эры).

**7.** Далёкае мінулае пакінула нам у спадчыну разнастайныя археалагічныя і гістарычныя помнікі. Найбольш вядомыя і прыметныя з іх — гарадзішчы, умацаваныя равамі і валамі, і пахавальныя курганы. Старажытныя паселішчы звычайна размяшчаліся на берагах рэк. На іх рэштках можна знайсці наканечнік стралы, каменную сякеру або крамянёвы скрабок. Старажытныя рэчы можаце знайсці вы самі, вашы бацькі ці знаёмыя. Калі вам пашанцуе іх выявіць, абавязкова прынясіце ў школу для наступнай перадачы ў бліжэйшы музей. Вучоныя падрабязна вывучаць знойдзеныя рэчы і дзякуючы вам напішуць яшчэ адзін радок ці нават старонку ў гісторыю вашага краю.

Зберагаць гістарычныя помнікі — значыць выхоўваць у сабе павагу і любоў да сваёй Бацькаўшчыны. Няхай цікавасць да гісторыі захаваецца ў вас назаўсёды.

Мы, аўтары падручніка, развітваемся з вамі. Аднак ненадоўга. Апякунка гісторыі — багіня Кліо — рыхтуе вам у 6-м класе новую сустрэчу з гісторыяй Беларусі сярэдніх вякоў.

# МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ЧЫТАННЯ





## У ГІСТОРЫЯ, ЯКУЮ НЕЛЬГА ЧЫТАЦЬ БЕЗ РЫДЛЁЎКІ

Аднойчы перад самым канцом урока гісторыі вучаніца нашай школы Ніна Лёля працягнула мне нейкі загорнуты ў паперу прадмет і спытала:

— Георгій Васільевіч, паглядзіце, калі ласка, што гэта можа быць? Учора знайшла на ўзараным полі, недалёка ад вёскі.

Я разгарнуў паперу і ўбачыў цяжкі шэры камень. Прадаўгаваты, завостраны з аднаго боку, ён цьмяна пабліскваў гранямі.

Цікавая знаходка. Без сумнення, гэта сапраўдная каменная сякера, якой карысталіся старажытныя людзі.

Як сякера апынулася ў зямлі, дзе няма ніякіх прыкмет старажытнага паселішча?

Мне ўявілася, якое здарэнне тады магло адбыцца.

...Чалавек ішоў павольна, прыслухоўваючыся, часта спыняўся.

Галінкі раз-пораз чапляліся за скуру, накінутую на плечы, ціха шаргацелі ззаду. Толькі гэтыя ледзь улоўныя гукі ды яшчэ патрэскванне сухіх галінак, што трапляліся пад нагу, парушалі цішыню.

Як быццам нішто не гаварыла аб небяспецы, але паляўнічы адчуваў нейкую няпэўнасць, страх. З таго часу як у сумятні палявання ён згубіў сваю сякеру, рука адчувала нязвыклую лёгкасць. І гэта напамінала чалавеку аб тым, што ён абяззброены і не зможа абараніцца, калі хто-небудзь нападзе.

Дарогу перагарадзіў яр. У час апошняга ліўня тут бушаваў паток, разбураючы берагі, падмываючы карэнні дрэў. Цяпер навакол было ціха, спакойна.

Адчуўшы смагу, чалавек накіраваўся ўніз яра, дзе блішчэла вада. У нязручным месцы, каб утрымацца і не ўпасці, ён схапіўся за выступ адхону і адчуў у руцэ нейкі жаўлак. Забыўшыся на ваду, чалавек пачаў разглядаць знаходку. Камень па

колеру і выгляду быў яму знаёмы. Такія камяні яго супляменнікі і сам ён шукалі ўздоўж берагоў ракі.

Жаўтавата-карычневыя жаўлакі са светлай, амаль белай паверхняй знаходзіліся звычайна ў прыродных адкладаннях на значнай глыбіні. Гэта быў крэмень, з якога зручна было вырабляць сякеры і іншыя прылады працы.

Чалавек уважліва агледзеў адхон. Хутка ў яго руках было некалькі розных камянёў. Ён выбраў «мяккі», больш зручны для апрацоўкі жаўлак.

Вечарамі ля вогнішча чалавек цярпліва аббіваў гэты камень, вастрыў, раўняў грані. Вядома, шкада, што згубілася старая сякера. Але затое ён зробіць яшчэ лепшую. У яго для гэтага ёсць вопыт. Новая сякера будзе добра сячы, будзе цудоўнай зброяй на паляванні...

Званок перарваў мае думкі. Вучні стоўпіліся вакол стала. Усім хацелася паглядзець на сякеру, якая дайшла да нас з надта старажытных часоў.

Хто здзіўляўся акуратнасці апрацоўкі, хто прыкідваў, як карысталіся сякерай. І тут раптам пачуўся чыйсьці голас:

— Ат, знайшлі забаўку! Камень як камень! Што ў ім цікавага?

— А хаця б тое, што гэтая сякера — адна з самых старажытных прылад, зробленых чалавекам, і належыць яна да ўсяго таго багацця, якім мы зараз валодаем,— адказаў я.

Старажытныя прадметы — гэта рэчавыя крыніцы, якія дапамагаюць нам вывучаць далёкае мінулае чалавецтва, бо першая пісьменнасць з'явілася ўсяго якія-небудзь 5—6 тыс. гадоў назад (калі лічыць ад з'яўлення старажытнейшай пісьменнасці, што была ў Егіпце і Міжрэччы). А чалавек з'явіўся некалькі мільёнаў гадоў назад.

Як жа пранікнуць у цемру гэтага беспісьменнага існавання чалавецтва? Як узнавіць тое, што згубілася ў далях часу?

Вось тут і прыходзяць нямыя сведкі дзейнасці людзей — прадметы, якія рабіў і якімі карыстаўся чалавек на ўсіх этапах свайго жыцця.

Вам, мабыць, даводзілася чуць калі-небудзь такі выраз палеантолагаў-вучоных, якія займаюцца даследаваннем вымерлых жывёл: «Дайце нам костку, і мы адновім па ёй усю жывёліну».

З такім жа правам археолаг можа сказаць: «Дайце мне рэч, зробленную чалавекам, і я скажу вам, якім быў гэты чалавек, на якой ступені развіцця ён знаходзіўся».

Кожная зробленая чалавекам рэч нясе на сабе сляды майстэрства таго, хто яе рабіў, вопыт, назапашаны многімі пакаленнямі людзей, веды, набытыя ўсім грамадствам.

Узяць хаця б гэтую каменную сякеру. Аб чым расказвае яна нам?

Працаваць ёй было значна цяжэй, чым жалезнай,— гэта кожнаму зразумела. Значыць, людзі, якія рабілі такія сякеры, не ведалі чорнага металу. Аднак зрабіць сякеру з каменю таксама не проста. А быў жа і такі час, калі нашы продкі наогул не ведалі ніякіх сякер. Так што з'яўленне гэтай прылады працы азначала гіганцкі крок уперад у жыцці людзей, у іх барацьбе за існаванне. З такой сякерай ужо можна было будаваць хаціны, ссякаць вялікія дрэвы, рабіць чаўны, хадзіць на паляванне.

Вунь колькі сказала толькі адна сякера. Вось чаму старажытныя рэчы так цікавяць навукоўцаў.

Навука, якая вывучае мінулае чалавецтва па старажытных помніках, па рэчавых крыніцах, знойдзеных у зямлі, называецца археалогіяй. Само слова «археалогія» ў перакладзе на нашу мову азначае «навука аб старажытнасці». Археалогія належыць да гістарычных навук. Аб ёй вобразна кажуць, што гэта гісторыя, узброеная рыдлёўкай.

Навуковая задача археалогіі заключаецца ў тым, каб на падставе крыніц, якія яна вывучае, як мага больш поўна ўзнавіць карціну далёкага мінулага чалавецтва.

## (У) СЯРОД ДЗІКІХ АЎСТРАЛІЙЦАЎ

Адным з першых еўрапейцаў, хто блізка, на ўласным вопыце даведаўся пра жыццё дзікіх плямён, быў англічанін Вільям Баклі ў пачатку XIX стагоддзя. Ён пражыў сярод абарыгенаў (карэнных жыхароў) Аўстраліі 32 гады і вярнуўся ў цывілізаваны свет ужо ў сталым узросце. Яго падрабязны шматдзённы аповед быў запісаны і надрукаваны.

Абарыгены Аўстраліі нічога не ведалі аб земляробстве, і ў іх не было хатняй жывёлы, калі не лічыць паўдзікага сабакі дзінга. Усе прылады працы яны рабілі з каменю, ракавін, касцей і дрэва. Гэтымі грубымі інструментамі яны выраблялі паляўнічую зброю, бранзалеты і паясы, плялі мяшкі і сумкі, вілі вяроўкі. Агонь здабывалі трэннем адной аб адну дзвюх палак.

Кожны год качавалі абарыгены ў пошуках ежы. Палявалі на жывёл і птушак, лавілі рыбу ў рэках і азёрах, выкопвалі карані і цыбуліны раслін, збіралі ягады, лісце, лічынкі насякомых, спусташалі птушыныя гнёзды, адбіралі мёд у пчол.

Там, дзе ежы было шмат, абарыгены разбівалі лагер, затрымліваючыся на адным месцы на дватры дні, а то і на некалькі месяцаў. Пры доўгіх прыпынках будавалі трывалыя хаціны-буданы (шалашы) з жэрдак, галля, камянёў, зямлі, торфу.

Пасудзін для прыгатавання ежы ў аўстралійцаў не было. Кожная аўстралійская сям'я мела ў сваім распараджэнні так званую зерняцёрку — вялікі плоскі камень, на якім жанчыны з дапамогай другога каменю расціралі цвёрдыя карані і зерне, раскolвалі арэхі, трушчылі косткі жывёл. Карані, клубні, семя папярэдне вымочвалі ў вадзе, падпякалі на кастры, а затым расціралі. Змей скручвалі кальцом і запякалі ў попеле. Дробных жывёл, птушак, вусеніц і слімакоў смажылі на вуглях. Буйную дзічыну рассякалі на часткі і гатавалі на



Старажытны спосаб здабывання агню, які яшчэ нядаўна ўжываўся некаторымі плямёнамі

распаленых камянях, закідваючы зверху кавалкамі кары і пяском.

Калі прыродныя запасы ежы вычэрпваліся, людзі рухаліся далей, захапіўшы ўвесь няхітры скарб з сабой. Мужчыны неслі каменныя сякеры, дзіды

(коп'і), крывыя кідальныя паліцы — бумерангі, палкі для здабывання агню; жанчыны — ночвы з кары, посуд для вады з сушаных гарбузоў; мяшкі і сумкі, сплеценыя з раслінных валокнаў; зерняцёркі. Жанчыны пераносілі і маленькіх дзяцей.

Адзіным адзеннем дарослых служылі накінутыя на плечы і падвязаныя спераду каля шыі шкуры кенгуру ці дзінга.

Кожная абшчына, гэта значыць група людзей, якія жывуць сумесна, складалася з пэўнага ліку сем'яў. Паміж абшчынамі звычайна панаваў мір. Здаралася, што яны варагавалі, і зрэдку справа нават даходзіла да ўзброеных сутычак. Але часцей абшчыны запрашалі адна адну ў госці, спраўляючы час ад часу шумлівыя сумесныя святкаванні, разам палявалі і лавілі рыбу, абменьваліся ежай і вырабамі; члены суседніх абшчын уступалі ў шлюбы і г. д.

## (У) КРЫНІЦА ВЕДАЎ

## ПРА ДЗЯЦІНСТВА ЧАЛАВЕЦТВА

Мы ўжо ведаем, што вучоныя, якія даследавалі жыццё культурна адсталых народаў, выявілі значнае падабенства ў спосабах вядзення гаспадаркі, у грамадскім жыцці і ў рэлігіі народаў, якія аддзелены адзін ад аднаго морамі і акіянамі, горамі і пустынямі.

Шматлікія сучасныя звычаі, абрады і вераванні культурна адсталых народаў на здзіўленне нагадваюць звычаі, абрады і вераванні, пра якія ўпамінаецца ў міфах, легендах і гістарычных паданнях цывілізаваных народаў.

Уся справа ў тым, што развіццё вытворчасці і грамадскіх адносін у розных народаў падпарадкоўваецца адным і тым жа адзіным для ўсяго чалавецтва гістарычным законам. Аднак гаспадарка і культура ў адных народаў развіваюцца хутчэй, а ў другіх — больш павольна.

Там, дзе прыродныя ўмовы былі больш спрыяльнымі, а людзей было больш, развіццё вытворчасці

ішло хутчэй. І наадварот, там, дзе прыродныя ўмовы былі асабліва цяжкімі і людзей жыло параўнальна мала, вытворчасць развівалася больш марудна.

Вось чаму найбольш адсталыя народы жывуць у трапічных джунглях, пустынях, на поўначы Канады ці там, дзе насельніцтва на працягу тысячагоддзяў было ізалявана ад іншых народаў, як гэта здарылася, напрыклад, з абарыгенамі Аўстраліі.

Таму «дзікуны» XIX стагоддзя могуць служыць своеасаблівай крыніцай нашых ведаў пра далёкае мінулае чалавецтва. На самай справе некалі нашы прашчуры жылі таксама або амаль таксама, як яны.

## §1 ВЯЛІКАЕ АБЛЕДЗЯНЕННЕ

На Зямлі адбылося моцнае пахаладанне і звязанае з ім абледзяненне вельмі вялікіх тэрыторый. Адсюль назва — *ледавіковы перыяд*. Але такая назва не зусім дакладная, бо абледзяненні здараліся і раней.

У пачатку так званага чацвярцічнага перыяду жывёлы і расліны амаль нічым не адрозніваліся ад сваіх папярэднікаў. Клімат быў яшчэ даволі мяккім.

Праходзілі тысячагоддзі. Лета станавілася карацейшым і больш халодным, а зімы падоўжваліся. У гарах снег не паспяваў раставаць, злежваўся і ператвараўся ў лёд. Ледзяныя масы павольна спаўзалі са схілаў вяршынь. На Зямлі пачалося нябачанае па маштабах абледзяненне. Яго рэшткі знаходзяць амаль на ўсіх кантынентах — у Еўропе, Азіі, Амерыцы, Аўстраліі, Антарктыдзе.

Настаў час, калі велічэзны ледзяны панцыр пакрыў большую частку Еўропы. Пад ім апынулася і тэрыторыя Беларусі.

Затым пацяплела. Ледзяное покрыва пачало раставаць, і яго граніца паступова адсоўвалася да поўначы. Урэшце, Еўропа поўнасцю вызвалілася ад ільду.

На працягу апошняга мільёна гадоў чатыры разы суровыя ледавіковыя эпохі змяняліся цёплымі міжледавікоўямі, клімат якіх амаль не адрозніваўся ад нашага. Паўднёвыя граніцы кожнага ледавіка не былі аднолькавымі. Толькі адзін раз яны дасягнулі Кіева і Варонежа. У астатніх выпадках ледавікі спыняліся на тэрыторыі Беларусі...

Чаму ж узнікаюць абледзяненні? Адны вучоныя лічаць, што пахаладанне адбываецца з-за памяншэння ўтрымання вуглекіслаты ў атмасферы. Другія звязваюць абледзяненне з гораўтварэннем: чым больш гор, тым больш ледавікоў. Трэція мяркуюць, што назапашванне ледавіковых мас залежыць ад палажэння полюсаў (Зямлі): куды змяшчаецца полюс, там і ўзнікаюць ільды. Многія тлумачаць гэтую загадку змяненнем колькасці цяпла, якое пасылае Сонца на нашу планету.

Вось колькі існуе розных думак аб прычынах абледзяненняў. А тут пералічаны яшчэ не ўсе.

## §1 ПАЛЯЎНІЧЫЯ-КАЧЭЎНІКІ КАМЕННАГА ВЕКУ

Паколькі продкі чалавека былі разумнымі і прадбачлівымі, ім удалося выжыць у суровых умовах ледавіковых перыядаў. Яны ўдасканальвалі тэхніку вырабу прылад працы, карысталіся агнём, шылі адзенне, знаходзілі сховішчы, сталі больш удачлівымі паляўнічымі і збіральнікамі. Жылі яны невялікімі вандроўнымі (качавымі) групамі, увесь час перасоўваючыся ў пошуках ежы і толькі зрэдку затрымліваючыся ў месцах, дзе знаходзілі больш раслін ці жывёл, каб паляваць.

***Неандэрталец.*** Апошні ледавіковы перыяд пачаўся каля 70 тысяч гадоў назад, і на яго ранніх стадыях у Еўропе і некаторых абласцях Азіі жылі істоты, якіх называюць «неандэртальцамі». Гэты перыяд закончыўся прыкладна 40 тысяч гадоў назад.

Хоць неандэртальцы выглядалі інакш, чым сучасныя людзі, асабліва з-за свайго нізкага лба, мозг



Схема развіцця чалавека, у якой вучоныя вылучаюць шэраг істот: рамапітэк, аўстралапітэк (3,5 млн гадоў назад), чалавек умелы (1,5 млн гадоў назад), чалавек прамаходзячы (500 тыс. гадоў назад), чалавек разумны (неандэрталец) (200 тыс. гадоў назад), чалавек разумны разумны (сучасны чалавек)

іх быў такога ж памеру. Яны вялі больш «прагрэсіўны» вобраз жыцця ў параўнанні са старажытнымі людзьмі. Неандэртальцы палявалі, жылі ў пячорах і карысталіся разнастайнымі каменнымі прыладамі. Падобна нам, яны хавалі сваіх памёршых. Не выключана, што ў іх ужо складаліся ўласныя ўяўленні аб жыцці пасля смерці, таму што ў магіле неандэртальца побач з целам ляжалі кветкі.

***З'яўленне сучаснага чалавека*** (чалавек разумны разумны). Прыкладна каля 100 тысяч гадоў таму першыя сучасныя людзі з'явіліся ў Паўднёвай Афрыцы. Нашчадкі гэтых людзей, якія ўжо не адрозніваліся ад нас, перасяліліся ў Еўропу і выцеснілі неандэртальцаў прыблізна 35 тысяч гадоў назад.

***Малюнкі і скульптура.*** Першыя з вядомых нам малюнкаў былі створаны краманьёнцамі. Сцены пячор упрыгожваліся малюнкамі жывёл — аленяў, бізонаў і коней. Людзей малявалі рэдка. Сустракаюцца зрэдку выявы людзей у масках жывёл, з аленевымі рагамі і ў звярыных шкурах. Не выключана, што гэта сцэнкі паляўнічых рытуалаў... Малюнкі рабілі прыроднымі каляровымі фарбамі. Іх атрымлівалі, расціраючы мінералы і расліны.



Выявы бізонаў (дзікіх быкоў) і іншых жывёл у пячоры Альтаміра (Іспанія, каля 20 000 гадоў назад)

Хоць пячорны жывапіс ёсць у розных месцах, шмат асабліва прыгожых малюнкаў знойдзена на паўднёвым захадзе Францыі і ў Паўночнай Іспаніі.

Паляўнічыя-збіральнікі ўмелі выразаць з каменю, косці, аленевых рагоў фігуркі людзей і жывёл. Прызначэнне гэтых статуэтак невядома, але мастацтва першабытных людзей уражвае сваёй вытанчанай прыгажосцю.

## §1 КРЭМЕНЬ

Гэта амаль адзіная горная парода на Беларусі, якая пры разбіванні дае вострыя рэжучыя грані. Крэмень вельмі моцны і цвёрды. Да нядаўняга часу ім рэзалі нават шкло. Такія карысныя якасці крэменю заўважылі яшчэ ў самай сівой старажытнасці. З таго часу на працягу соцень тысяч гадоў крэмень



Крамянёвы нож-клінок са стаянкі каля в. Юравічы (26 000 гадоў назад)

быў незаменным матэрыялам для вырабу прылад працы. І толькі ў раннім жалезным веку яго выцесніў метал.

## §2 БЕРДЫЖ

На мысе паміж берагам ракі і неглыбокім ярам прымасціліся два будыны. Буданы авальныя. Аснова іх сцен выкладзена чарапамі і іншымі буйнымі косткамі мамантаў. Жэрдкі і звязаныя паміж сабой мамантавыя рэбры ўтвараюць каркас страхі, накрытай шкурамі вялікіх жывёлін. Шкуры ўнізе замацаваны камянямі, каб не знесла бурамі.

Брудна і няўтульна навокал. Шмат смецця, патрушчаных і абгрызеных костак.

З прырэчнага боку буданоў чарнеюць уваходы — як пралезці сагнутаму чалавеку. Давайце ж зазірнём туды... Якраз насупраць уваходу размешчана амаль патухлае вогнішча, толькі тлее некалькі вугалёў. За вогнішчам з даху звісаюць шкуры паўночных аленяў і бізонаў, якія дзеляць будан на два памяшканні. У прыцемку можна разгледзець лежакі на касцяных вымастках, пакрытыя мяккімі шкурамі. На адным лежаку — стары. Ён раз-пораз кашляе: хворы. Каля ўваходу прыстаў-

лена некалькі дзідаў (коп'яў), збоку ляжаць скураныя торбы, пад жэрдкамі даху — пукі сушаных сцяблін, карані ядомых раслін.

Каля буданоў у вечнай мерзлаце выкапаны ямы — мясныя кладоўкі. Яны прыкрыты мамантавымі чарапамі, лапаткамі, цяжкімі камянямі, каб да харчовых запасаў не змаглі дабрацца лісіцы і ваўкі. Але зараз у кладоўках пуста, толькі патыхае з іх холадам.

## §3 ПАЛЯВАННЕ

У аблоўна-загонным паляванні ўдзельнічалі ўсе працаздольныя мужчыны племені, а магчыма і некалькі суседскіх кроўна-роднасных плямён. У якасці загоншчыкаў маглі прыцягвацца падлеткі і маладыя жанчыны. Статак мамантаў заганялі ў дрыгву ці спадзістыя кручы глыбокіх адхонаў. Звар'яце-







Крамянёвыя наканечнікі стрэл *(а)*; крамянёвыя сярпы бронзавага веку *(б)*



Нашы продкі, канешне ж, лавілі ракаў, і ў вялікай колькасці

лых ад страху і пакалечаных пры падзенні жывёл дабівалі дубінамі, камянямі, дзідамі...

З вынаходствам дроціка з урэзанымі ў касцяны наканечнік вострымі крамянёвымі шыпамі, якія ўтрымлівалі гэтае лёгкае кідальнае кап'ё ў тулаве жывёлы, намецілася ўстойлівая тэндэнцыя да індывідуальнага палявання. Цяпер толькі некалькі і на-

ват адзін чалавек мог з засады каля вадапою забіць звера з параўнаўча бяспечнай адлегласці ў 20—30 метраў.

## §3 ЗБІРАЛЬНІЦТВА ДАРОЎ ПРЫРОДЫ

Гэта магло быць у любое тысячагоддзе каменнага веку... дзе-небудзь на Беларускім Паазер'і. Вясною, калі ўсё навакол зелянела, выпраўляліся за першым шчаўем. Ішлі ў харч маладая крапіва, дзікая цыбуля, карані вадзяной лілеі, мноства іншых раслін. Вясною быў самы час і для збору птушыных яек. Затым прыходзіла лета і выспявалі ягады. Спачатку суніцы, потым чарніцы, маліны, брусніцы, восенню — журавіны. Ягады можна было не толькі есці свежымі, а і сушыць на зіму.

Пасля цёплых дажджоў пачыналіся грыбы. Раслі яны ажно да позняй восені, і ўвесь гэты час не заціхалі чалавечыя галасы ў лесе.

У канцы лета наступаў збор арэхаў. Людзі ішлі і ў дубнякі, разганяючы дзікоў,— паспелі жалуды. Вывараныя жалуды гублялі гаркату. Іх можна было затым перацерці на муку, змяшаць з арэхамі ці яшчэ з чым і спячы праснакі.

## §3 ПРЫГАТАВАННЕ ЕЖЫ

Неандэртальцы, верагодна, смажылі мяса на плоскіх камянях. Спачатку яны разводзілі на камянях вогнішча, каб камяні добра напаліліся.

Калі камяні моцна награваліся, дровы і вуголле адграбалі палкай убок і на гарачыя камяні кідалі кавалкі мяса. Жар, які зыходзіў з камянёў, паступова смажыў мяса. Гэта рабіла яго больш мяккім, і пеpажоўваць яго было лягчэй.

## §3 ЯК РАБІЛІ АДЗЕННЕ

Каб зрабіць адзенне са звярынай шкуры, трэба было спачатку выдаліць праслой тлушчу з яе ўнутранага боку. Для гэтага шкуру расцягвалі, прыбівалі да зямлі калочкамі і ачышчалі яе каменнымі скрабкамі.

Верагодна, шкуру высушвалі над агнём, каб надаць ёй мяккасць і гнуткасць. Затым рабілі дзіркі па краях шкуры завостраным каменным свярдзёлкам. Хутчэй за ўсё чалавек заварочваўся ў выробленыя скуры і прадзяваў скрозь дзіркі скураныя раменьчыкі, як быццам зашнуроўваючы адзенне. Магчыма, таксама абмотвалі кавалкамі скур ногі.

Даведка. У беларускай мове слова «скура» азначае апрацаваную чалавекам шкуру жывёлы.

## §4 ПЕРАДАЧА ВОПЫТУ

Мова першабытных людзей была яшчэ неразвітой. Таму асноўнай формай навучання ў статку (праабшчыне) было навучанне прыкладам. Збіраю-



Так аббівалі крэмень і выраблялі з яго прылады працы

чыся ў палаючага вогнішча, падлеткі ўважліва сачылі за тым, як дарослыя аббіваюць кавалкі каменю, абпальваюць дубіны, рэжуць косць, распрацоўваюць тушы забітых жывёл, падтрымліваюць агонь у ачагу.

Так, у штодзённых адносінах старэйшых і малодшых адбывалася перадача працоўных навыкаў і вопыту з пакалення ў пакаленне. Разам з ускладненнем грамадскай і працоўнай дзейнасці ўдасканальвалася і членараздзельная мова — новы, намнога больш дасканалы сродак навучання, перадачы набытага вопыту, ведаў.

## §4 СЭНС ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ

У першабытным грамадстве існавала строгая сістэма выхавання. Дзецям прывіваліся такія рысы, у якіх было зацікаўлена грамадства. Сэнс выхавання зводзіўся да наступных норм: павага да старэйшых і безагаворачнае падпарадкаванне ім, павага да жанчыны, гатоўнасць да ахвяры ў інтарэсах роду і племені, мужнасць і сціпласць, любоў да сваіх дзяцей.

Парушальнікаў існуючых правіл грамадства жорстка карала, звычайна смерцю...

У першабытных народаў існавала так званае табу. Табу — гэта рэлігійная забарона рабіць пэўныя дзеянні (выкарыстоўваць нейкія прадметы, вымаўляць асобныя словы і г. д.). Парушэнне гэтай забароны, паводле існуючых забабонаў, караецца звышнатуральнымі таямнічымі сіламі.

## §5 ЗДАБЫВАЛЬНІКІ КРЭМЕНЮ

Па беразе рэчкі ідзе група людзей, апранутых у звярыныя шкуры. У руках некаторых незвычайныя прылады. На сякеры яны не падобны. Хутчэй за ўсё гэтыя абпілаваныя ласіныя рогі нагадваюць кіркі.

Людзі ідуць, уважліва аглядаюць рачны абрыў. Вось яны адыходзяць ад берага і спыняюцца, скідваюць паклажу з плеч. Па ўсяму відаць, яны добра ведаюць гэта месца. Тут, на беразе ракі Рось, якая ўпадае ў Нёман, на паверхню зямлі выступае пласт крэйды. Няўжо за ёй прыйшлі сюды здалёк гэтыя падарожнікі?

А яны, збіраючыся, відаць, прабыць тут не адзін дзень, узяліся абсталёўваць стаянку. Адны пачалі ставіць будан, другія пайшлі збіраць галлё для вогнішча. Потым асцярожна дасталі з кошыка гліняную пасудзіну, дзе ў попеле тлела некалькі вугольчыкаў. Высыпаўшы прысак з пасудзіны на сухое месца, паклалі на яго сухі мох, тонкія галіначкі. Неўзабаве ля будана гарэла вялікае вогнішча.

Уладкаваўшыся, людзі пачалі работу. Рукамі садралі дзірван, адграблі пясок, і вось ужо сям-там забялелася крэйда. У ход пайшлі кіркі. Нялёгка дзяўбці цвёрдую, зляжалую крэйду такімі прымітыўнымі прыладамі. Але настойлівасць бярэ сваё. Падмяняючы адзін аднаго, белыя ад крэйды землякопы паглыблялі яму.

Калі на зямлю апусціўся змрок, стомленыя людзі сабраліся каля будана. Павячэраўшы сушанай рыбай, яны ляглі спаць.

Раніцай работа закіпела зноў. Цяпер у цесны калодзеж спускаліся па двое землякопаў. Пачаргова дзяўблі яны кіркай крэйду.

Ужо некалькі разоў змяняліся землякопы. Куча крэйды каля ямы няўхільна расла. І раптам знізу пачуўся радасны покліч. Усе сабраліся вакол ямы, імкнучыся разгледзець знаходку. Ухапіўшыся за вяроўку, дружна выцягнулі кошык наверх. У ім ляжаў даволі вялікі светла-карычневы камень.

Крэмень! Вось па што прыйшлі сюды гэтыя людзі. Сапраўды, калі хочаш знайсці крэмень, то шукай яго ў пластах крэйды. Што ж, яны добра ведалі, дзе шукаць. Хоць камення ўсюды шмат, але для вырабу розных прылад найбольш падыходзіць

толькі адзін — крэмень. Прычым не той, што іншы раз трапляецца пад ногі — высушаны, пацямнелы ад сонца, а вось такі, «светлы», сыры, толькі што выкапаны. Яго лёгка і зручна апрацоўваць.

Двое майстроў узяліся за работу. Узяўшы прынесеныя з сабой спецыяльныя каменныя адбойнікі, яны лоўкімі і трапнымі ўдарамі адколвалі ад крэменю прадаўгаватыя адшчэпы і тонкія шырокія пласціны.

Пакуль што майстры-каменячосы завіхаліся над каменем, у яме знайшлі яшчэ некалькі кавалкаў крэменю. Потым зноў пайшла крэйда.

Дзень за днём дзяўблі цвёрды пласт старажытныя шахцёры. За гэты час зламалася не адна кірка, ужо і запасы ежы значна паменшалі. Няўжо давядзецца прыпыніць работу і адпраўляцца ўсім на паляванне? Але тут ім пашанцавала ў другі раз. На глыбіні ў пяць метраў зноў пачалі сустракацца кавалкі крэменю.

Калі яны ўсе былі выбраны, шахцёры пачалі падкопваць сценкі, дастаючы з-пад нізу ўсё новыя і новыя жаўлакі. Неўзабаве ўтварылася прасторная камера, каля пяці метраў у дыяметры.

У адным баку кавалкі крэменю траплялiся асабліва часта. Шахцёры пачалі капаць там, але хутка былі вымушаны спыніць работу. Нават у поўдзень, калі сонца стаіць ледзь не над самай галавой, на дне глыбокай ямы мала што разгледзіш. У гэтым закутку зусім нічога не было відаць.

У шахту скінулі пару бярэмкаў галля, некалькі палаючых галавешак. Вогнішча асвяціла месца работы.

Амаль чатыры метры ўбок прайшлі шахцёры, выбіраючы крэмень. Добра давялося папрацаваць, затое яны знайшлі столькі каштоўнага каменю, колькі маглі панесці з сабой.

Скончыўшы апрацоўваць здабыты крэмень, людзі пакінулі сваю стаянку і шахту і рушылі ў далёкую дарогу дамоў. Праз некаторы час, узышоўшы на ўзгорак, яны азірнуліся на свой будан, што здаваўся адсюль маленькай цёмнай плямкай, і ўба-

чылі групу людзей, якія ішлі ад лесу да берага рэчкі. І яны за крэменем прыйшлі! Ну што ж, можа, і ім пашанцуе, і яны вернуцца дамоў з багатай здабычай.

Чатыры тысячы гадоў назад берагі ракі Рось, непадалёк ад Ваўкавыска, там, дзе цяпер стаіць пасёлак Краснасельскі, быў добра знаёмы для многіх людзей з самых дальніх родаў і плямёнаў. І ўсіх вяла сюды патрэба ў крэмені — незаменным матэрыяле для вырабу прылад працы, без якіх старажытныя людзі ўжо не маглі абысціся.

У наш час шахты старажытных здабывальнікаў крэменю былі знойдзены выпадкова пры распрацоўцы крэйдавых кар'ераў. Даследчыкі падлічылі, што тут прабіта каля тысячы шахт. Усе яны зараз засыпаны зямлёй, пяском. Некаторыя шахты археолагі расчысцілі. Цяпер у іх можна спусціцца, пабачыць сляды на крэйдзе, якія засталіся ад касцяных кірак, сажу ад вогнішчаў, якія палілі тут жа першабытныя шахцёры. Як важныя гістарычныя помнікі шахты ўзяты пад ахову дзяржавы.

Непадалёку ад шахт раскапаны рэшткі майстэрань, у якіх апрацоўваўся крэмень. Тут знойдзена нямала адшчэпаў і загатовак сякер. Вучоным удалося вызначыць месцы, дзе былі часовыя стойбішчы шахцёраў.

У адной шахце быў знойдзены шкілет чалавека. Тут жа ляжала касцяная іголка, каля ног стаяла гліняная пасудзіна з плоскім дном, упрыгожаная касымі насечкамі, якія ўтварылі арнамент у выглядзе елачкі. Відаць, гэта пахаванне шахцёра, які выпадкова памёр тут, далёка ад роднай стаянкі.

Шахты каля пасёлка Краснасельскі сведчаць, што ў старажытнасці на тэрыторыі Беларусі вяліся буйныя распрацоўкі крэменю. Гэта самыя старажытныя шахты, вядомыя ва Усходняй Еўропе.

## §6 ГУРТОК І ЯГО ВАЖАК

Гурток складаўся з 25—30 асоб. Тут былі і жанчыны з дзецьмі на руках і на карку, і падлеткі, і мужчыны рознага ўзросту, і ў тым ліку адзін стары.

Яны жылі яшчэ таксама, як усе іншыя жывёлы: вандравалі з месца на месца, шукаючы корму.

Адны выграбалі рукамі нейкія карэнні, другія шукалі на дрэвах плады, трэція стараліся злавіць і знайсці што-небудзь жывое: чарвяка, жука і гэтак далей. Нялёгка пасвіцца такім чынам. І ніводным словам яны яшчэ не перакінуліся паміж сабой.

Можа, яны нямыя?

Не, не нямыя яны, а проста не ўмеюць яшчэ гаварыць...

Праўда, некалькі слоў, калі можна так назваць некаторыя іхнія гукі, яны ведалі. Напрыклад, яны добра ведалі слова «га», якое звычайна вымаўляў важак, калі даваў знак ісці далей ці папярэджваў аб небяспецы, ці наогул хацеў звярнуць увагу сваіх сяброў на якую-небудзь з'яву...

Сярод гуртка вызначаўся адзін мужчына трохі вышэйшага росту, відаць, дужэйшы за іншых і нават, здавалася, нібы з твару разумнейшы. Гэта быў правадыр, важак гуртка.

Ніхто яго, вядома, не выбіраў, не прызначаў. Склалася яно само сабой, калі ён у бядзе першы кідаўся на ворага, калі ён першы заўважаў небяспеку, папярэджваў аб ёй, калі ён клапаціўся аб усім гуртку. У такія мінуты кожны яму быў удзячны, слухаўся яго,— і, такім чынам, ён зрабіўся важаком.

Гуртkoўцы заўсёды трымаліся адзін аднаго. Толькі такім чынам яны ўсе і змаглі існаваць. І ў гэтым была будучая перавага над моцным зверам.

## §6 ПРААБШЧЫНА І РОД

Формай грамадскіх адносін у неандэртальцаў быў статак (праабшчына). Першабытным чалавечым статкам мы называем групу людзей, якія аб'яднаны агульным працэсам здабычы ежы. Ніякіх роднасных адрозненняў у статку не было. Іншымі словамі, ніхто не мог сказаць, чый ён сын, хто даводзіцца яму братам, хто дзядзькам, хто пляменнікам. Хоць у статку ўсе былі родзічамі, але роднасці яны не ведалі.

Род, ці родавая абшчына,— гэта таксама група людзей, якая аб'яднана агульным працэсам здабывання ежы, але ў ёй ужо адрозніваюцца ступені роднасці. На першых этапах развіцця родавага ладу роднасць лічылася толькі па жаночай лініі. Чалавек ведаў сваю маці, сваю бабку, сваю прабабку, але не ведаў, хто яго бацька, дзед і прадзед. Такі род мы называем мацярынскім.

## §6 АПАВЯДАННІ ПРА ВЫХАВАННЕ

Побыт старажытных людзей добра ілюструюць прыклады, якія ўзяты з жыцця плямён Аўстраліі і Акіяніі, асабліва апавяданні пра выхаванне дзяцей.

Дзяцей тут рана прывучаюць дапамагаць у гаспадарцы. Смешна бачыць, як дзіцё паўтара ці двух гадоў цягне да вогнішча вялікае палена, а затым бяжыць да маці пассаць грудзі... Да 8 гадоў дзяўчынка абганяе ў працы двух дарослых еўрапейцаў... Дзеці тут мала гуляюць. Гульня хлопчыкаў заключаецца ў кіданні палак накшталт дзідаў (коп'яў), у стральбе з лука, і, як толькі яны робяць невялікія поспехі, яны прымяняюць іх у практычным жыцці. Можна бачыць хлопчыкаў, вельмі невялікіх, якія праводзяць цэлыя часы каля мора, намагаючыся трапіць з лука ў якую-небудзь рыбу. Тое ж здараецца і з дзяўчынкамі.



Дзеці вучацца страляць з лука

У плямён, якія жывуць у Паўднёвай Афрыцы, існуе такі звычай: кожны юнак, які дасягнуў 15 гадоў, каб быць прызнаным дарослым і воінам, павінен даказаць, што ён можа доўгі час жыць у адзіноце. Цела юнака размалёўваюць белай фарбай, да-

юць яму шчыт і дроцік (кароткую дзіду) і гавораць, што ён будзе забіты, калі хто-небудзь пабачыць ці зловіць яго, пакуль не злезе фарба. І юнак ідзе ў джунглі, дзе на працягу месяца, пакуль на ім трымаецца фарба, хаваецца ад людзей. Каб не памерці з голаду, даводзіцца забіваць жывёл, рабіць адзенне, здабываць агонь, шукаць ядомыя расліны, абараняць сваё жыццё ад дзікіх звяроў. Праз месяц, калі яго цела з белага зноў стане чорным, ён вяртаецца ў вёску. Яму ўрачыста прысвойваецца званне воіна, таму што ён даказаў, што можа здабываць сабе ежу.

## §6 АПОШНІ ЛЕДАВІК

З тых пор, як знік апошні еўрапейскі ледавік, прайшло зусім нямнога часу — 10 тысяч гадоў. Але рэшткі мінулых халодных эпох дзе-нідзе захаваліся і дагэтуль. Гэта ледзяное покрыва Антарктыды, Грэнландыі і астравоў Паўночнага Ледавітага акіяна...

Калі апошні ледавік пакінуў межы Усходне-Еўрапейскай раўніны, па ўсёй Беларусі ўжо раслі сасновыя і бярозавыя лясы.

У іх вадзіліся тыя ж звяры, якія насяляюць лясы і цяпер. А маманты, шарсцістыя насарогі і вялікарогія алені вымерлі.

У той час утварыліся апошнія буйныя рэкі на нашай тэрыторыі — Заходняя Дзвіна і Нёман. У параўнанні з імі Прыпяць, Днепр, Бярэзіна і Сож — дзяды. Яны неслі свае воды ў Чорнае мора яшчэ тады, калі каля паўночных меж Беларусі яшчэ стаялі ледавікі.

Расталі «астравы» льдоў, якія захаваліся дзе-нідзе. На іх месцы ўзніклі азёры. А ў паніжэннях з-за вялікай колькасці вады ўтварыліся вялізныя балоты.

За некалькі тысячагоддзяў, якія аддзяляюць нас ад апошняга ледавіковага перыяду, прырода Беларусі набыла добра знаёмае нам аблічча.

## §7 БРОНЗАВЫ ВЕК ВЫЗНАЧАЮЦЬ ПАЦЕРКІ

Ніхто з жыхароў вёскі Юркавічы Веткаўскага раёна на Гомельшчыне нават і не здагадваўся, што хаваецца на выспе, якую яны называюць Стрэліца. Для іх было нечаканасцю, што археолагі тут, на абкружаным заліўным лугам невялікім узвышшы, пачалі весці раскопкі. «Ну што тут можна знайсці?» — дзівіліся яны.

А ў даследчыкаў неўзабаве з'явілася мноства знаходак. У культурным слоі неалітычнага паселішча былі сустрэты крамянёвыя нажы, скрэблы, наканечнікі стрэл і коп'яў, сякеры і вялікая колькасць чарапкоў посуду, упрыгожанага адбіткамі «грэбеня» і неглыбокімі ямкамі.

Калі плошча раскопак была павялічана, дык тут ужо здзівіліся нават самі археолагі. Пад культурным слоем стаянкі пачалі сустракацца вырабы з медзі і бронзы.

Бронзавыя рэчы ў каменным веку? Як гэта магло здарыцца?

Даследчыкі пачалі ўважліва даследаваць стаянку, і неўзабаве ўсё, як кажуць, стала на сваё месца. Аказваецца, гэтая самая Стрэліца падабалася не толькі людзям каменнага веку. У бронзавым веку тут таксама ўзнікла паселішча і, па ўсяму відаць, немалое. А на месцы былой неалітычнай стаянкі людзі бронзавага веку хавалі сваіх сародзічаў.

У адпаведнасці са звычаем цела нябожчыка спальвалі на вялікім вогнішчы. Потым прах апускалі ў неглыбокую яму. Туды ж клалі сякеру, посуд, зброю, словам, усё тое, што належала нябожчыку і магло спатрэбіцца на тым свеце. Так дайшлі да нас многія рэчы, якія шмат расказвалі аб жыцці сваіх былых гаспадароў.

У адной магіле разам з крамянёвым нажом і шасцю крамянёвымі наканечнікамі стрэл ляжала каменная булава з прасвідраванай адтулінай для ручкі. Такія булавы з'яўляюцца адзнакай улады старэйшыны роду.

Разам з каменнымі вырабамі ў некаторых магілах былі знойдзены рэчы, зробленыя з медзі. Меднымі былі нож і бранзалет. У чатырох пахаваных былі выяўлены медныя дыядэмы — дарагія жаночыя ўпрыгажэнні.

І ўсё ж, калі ў людзей, што жылі на Стрэліцы, з'явіліся металічныя рэчы? Чатыры ці тры тысячы гадоў назад? Адказалі на гэтае пытанне пацеркі.

У пахаванні разам з глінянай пласкадоннай пасудзінай і крамянёвым наканечнікам стралы былі знойдзены егіпецкія пацеркі — круглая шкляная, зялёнага колеру, і белая фаянсавая. Якраз такія фаянсавыя пацеркі, зробленыя з гліны, да якой дабаўлялі іншыя рэчывы, выраблялі́ся ў Егіпце ў 1580—1450 гадах да нашай эры. Яны былі распаўсюджаны на Балканах, на тэрыторыі Заходняй Еўропы і нават у Англіі. На тэрыторыі Усходняй Еўропы егіпецкія фаянсавыя пацеркі знойдзены на Каўказе, у Паўночным Прычарнамор'і, на тэрыторыі Заходняй Украіны. Пацеркі трапілі з далёкага Егіпта амаль тры з паловай тысячы гадоў назад.

Зразумела, што ў Стрэліцу пацеркі не маглі трапіць раней 1580 года да нашай эры, калі іх толькі пачалі вырабляць у Егіпце. Значыць, і медныя рэчы, знойдзеныя ў магілах, з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў другім тысячагоддзі да нашай эры.

Ну як жа трапіла сюды медзь, з якой зроблены нажы, дыядэмы, бранзалеты? Спецыяльнае вывучэнне паказала, што яны прыкарпацкага паходжання. Відаць, гэта медзь была выменена ў людзей, якія жылі на захадзе сучаснай Украіны.

Яшчэ не так даўно даследчыкі лічылі, што на тэрыторыі Беларусі не было бронзавага веку і людзі тут ад каменнага веку перайшлі ў жалезны век. Як цяпер высветлілася, Беларусь не была выключэннем у агульным ходзе гістарычнага развіцця.

На працягу ўсяго бронзавага веку з металам паспяхова сапернічаў камень. Па-ранейшаму з крэменю выраблялі нажы, наканечнікі стрэл і коп'яў.

Вельмі распаўсюджанымі былі баявыя каменныя сякеры. Майстры, якія рабілі іх для воінаў, трацілі нямала часу і намаганняў, але затое зброя атрымлівалася надзіва прыгожай.

Такія сякеры нярэдка знаходзяць на тэрыторыі Беларусі. Яны зроблены з шаравата-зялёнага каменю, формай нагадваюць вастраносую лодачку. Адтуліна прасвідравана невялікая — баявыя сякеры насаджваліся на тонкія доўгія ручкі. Сякеры апрацаваны настолькі акуратна, адпаліраваны да такога бляску, што проста не верыцца, як такую рэч маглі зрабіць больш за тры тысячагоддзі назад уручную.

У бронзавым веку адбыліся важныя змяненні ў гаспадарчым і грамадскім жыцці людзей. Значна ўзрасла роля жывёлагадоўлі, земляробства. Жывёлагадоўля зрабілася асноўнай крыніцай атрымання мяса.

Адбылося аддзяленне пастухоўскіх плямён. Гэта было першае вялікае раздзяленне працы ў грамадстве.

Пачаў развівацца абмен паміж плямёнамі. У некаторых плямёнах збіраліся багацці, што з'яўлялася прычынай для гвалту і ваенных нападаў аднаго племені на другое. Стары мацярынскі род з яго роўнасцю паміж жанчынамі і мужчынамі ператварыўся ў род бацькоўскі, або патрыярхат. На чале яго становіцца мужчына.

## §7 ПЛЯМЁНЫ БРОНЗАВАГА ВЕКУ

У бронзавым веку тэрыторыю Беларусі насялялі некалькі груп плямён. У пачатку II тысячагоддзя да н. э. у Падняпроўі і на ніжняй Прыпяці з'явіліся сярэднедняпроўскія плямёны. Яны прыйшлі з сярэдняга Дняпра (з Кіеўшчыны).

На значнай частцы Панямоння размяшчалася прыбалтыйская група плямён.

На поўначы ў гэты час існавала паўночнабеларуская група плямён.

Крыху пазней у басейне Прыпяці і на значнай




**Групы плямён бронзавага веку на Беларусі: 1 — паўночнабеларуская; 2 — сярэднедняпроўская; 3 — прыбалтыйская; 4 — шнуравой керамікі Палесся; 5 — тшцінецкая**

частцы Панямоння распаўсюдзілася тшцінецкая група плямён (назва ад горада Тшцінец у Польшчы).

## §8 ПАСЕЛІШЧА

Вёска (паселішча) складалася з пары дзесяткаў паўзямлянак з нізкімі плеценымі з лазы сценамі, якія пакрываліся зверху двухсхільнымі чаратовымі стрэхамі. Стрэхі трымаліся на слупах, укапаных па кутах паўзямлянкі. Шчыліны пад стрэхамі і ў сценах былі закладзены мохам, замазаны глінай. У паўзямлянкі можна было трапіць праз нізкія праёмы-дзверы, завешаныя скурамі. Побач было



Матыкі з каменю і рога, якімі карысталіся на тэрыторыі Беларусі 4500—4000 гадоў назад

нешта накшталт плеценых з саломы дзвярэй для халоднага часу.

Каля хацін — жардзяныя выгарады. Мяркуючы па слядах, у іх ноччу трымалі жывёлу. Там-сям на калах сохлі свежапамытыя пласкадонныя гліняныя гаршкі і збаны. Такі посуд захоўваўся і пад невялікімі павецямі, напоўнены рознымі каранямі, арэхамі, зернем.

На першы погляд жытлы былі бязладна раскіданы па схіле. Але, калі прыгледзецца, можна было заўважыць, што большасць іх ціснулася да берага. Ад кожнай будыніны адыходзілі ўтаптаныя сцежкі, якія зліваліся ў адну шырокую, што перасякала ўсё паселішча. З усходняга боку яна вяла да вузкай затокі пад дрэвамі, дзе знаходзіліся чаўны-даўбёнкі. Заходні канец сцяжынкі-вуліцы выводзіў за вёску і раздвойваўся. Менш пратаптаны шлях зварочваў да яшчэ нязжатага поля.

Уся вёска была акружана плеценым з тоўстых сукоў плотам. Вастраколіны тырчэлі вышэй чалавечага росту. Праз такі плот-агароджу не пералезе ні звер, ні чалавек.

Каля краю вёскі, побач з агароджай стаялі вялікаватыя будыніны з рэдкаплеценымі сценамі

без глінянай абмазкі. У адной з іх былі развешаны рыбацкія сеткі, іншыя снасці, кошыкі з лазы і саломы і розныя драўляныя вырабы, запасы лыка, цэлыя і бітыя гаршкі, словам, гэта былі і кладоўкі, і, мусіць, сховішчы для корму жывёле на зіму.

## §11 ЗВЫЧАЙ АБНАЎЛЕННЯ АГНЮ НА ПАЛЕССІ

Штогод перад Купаллем ва ўсіх хатах тушылі агонь. Затым усе без выключэння мыліся, апраналі святочнае белае адзенне і са спевамі ішлі ў лес.

На паляне кожны кідаў у выгарыну ад леташняга вогнішча прынесенае з дому паліва — адслужыўшыя свой век драўляныя граблі, расколатыя начоўкі, кавалкі дошак, пагрызеныя мышамі сявенькі, старыя брылі, стаптаныя лапці. Усё непрыдатнае да ўжытку. Не адставалі ад старэйшых і дзеці.

Старэйшына пачынаў высякаць агонь, шморгаючы ясеневым кавалкам на бялёсай паверхні ствала дуплістай вярбы, якая выбегла на паляну.

Заспявалі жанчыны. Як толькі загучала песня, твары мужчын застылі ва ўрачыстай напружанасці. Нараджэнне агню з халоднага дрэва не ўкладвалася ў свядомасці людзей, а ўсё невядомае і таямнічае не толькі здзіўляе, але і палохае. Усе ўважліва сачылі за кожным рухам старога. Яго рукі з упартасцю рухаліся ўзад і ўперад. Ад поту зліпліся валасы, узмокла на спіне кашуля, а стары ўсё пілаваў і пілаваў, ды журботна гучала песня-заклінанне:

У дрэве ясені-вярбе
Агонь жыве, агонь жыве.
Выйдзі, вогнік малады,
Каб не зналі мы бяды,
Каб шчаслівымі былі.
Чуеш, дамавік гукае:
— А гу-гу-гу, агонь,
У-у-у-у, жывы!

Раптам песня абрывалася, натоўп калыхнуўся і падаўся ўперад: з-пад рук старэйшыны паказаўся

белаваты дымок, а на абвугленай паверхні разагрэтай трэннем драўніны замігцела сіненькая кропачка ледзь бачнага агеньчыка. Стары хуценька паднёс да яго танюткія берасцяныя пялёсткі. Агеньчык праскочыў на бяросту і вясёлым матыльком затрапятаў чырвонымі крылцамі.

Неўзабаве сярод паляны шугала і гуло, раскідваючы ва ўсе бакі іскры, вялізнае вогнішча.

— Жывы агонь! Зніч! — радасныя воклічы скаланулі лес, і дзесьці ў гушчару адгукнулася працяжнае рэха: «Зніч! Зні-іч!»

Як толькі сонца пачало схіляцца да захаду, людзі сталі паволі разыходзіцца. Дадому яны вярталіся з новым агнём. Жанкі неслі запаленыя ад вогнішча лучынкі, клапатліва прыкрываючы зіхатлівыя язычкі полымя далонямі.

## §12 ПОМНІКІ ЛЯ ВЁСКІ ЧАПЛІН

Гарадзішча — не адзіны старажытны помнік каля вёскі Чаплін Лоеўскага раёна. Побач знаходзілася неўмацаванае адкрытае паселішча. Мы прайшлі гэты здзірванелы ўчастак і спыніліся там, дзе археолагі нядаўна вывучалі грунтавы, зусім непрыкметны на паверхні могільнік. Ён належаў да ранняга жалезнага веку.

Адкрылі могільнік выпадкова сяляне. Капалі яны паблізу канаву. На глыбіні ў паўметра былі зусім цэлыя гліняныя гаршкі. У іх знаходзіліся перапаленыя косці.

Пра адкапаныя гаршкі стала вядома археолагам. З гэтага фактычна і пачаліся навуковыя даследаванні ў Чапліне.

Хутка высветлілася, што гэта тыповы могільнік жалезнага веку рубяжа нашай эры. Ён належаў тым людзям, якія жылі на гарадзішчы і паселішчы.

Памёршага спальвалі, а рэшткі, што заставаліся, зграбалі ў кучу і змяшчалі ў неглыбокіх, крыху падоўжаных ямах.

На дно такой ямы змяшчаліся рэшткі спаленага на агні нябожчыка. Зверху клалі розныя рэчы: упрыгажэнні, прылады працы, наканечнікі дзідаў. Побач з касцямі на дно ямы ставілі гліняны посуд — гаршкі і міскі.

Чаплінскі могільнік даў выключна шмат розных старажытных рэчаў. Яны дазволілі, перш за ўсё, дакладна датаваць помнік.

Сярод знаходак бронзавыя шпількі (археолагі называюць іх «фібуламі») для верхняй вопраткі. Выраблялíся яны з кавалка дроту. Форма іх увесь час мянялася. Менавіта таму такія шпількі, нібы манеты, дапамагаюць вызначыць, у які час адбылося пахаванне.

Чаплінскі могільнік даў магчымасць падрабязна вывучыць пахавальныя звычаі, якія існавалі звыш 2000 гадоў назад.

## §13 МІФЫ НАРОДАЎ СВЕТУ

У старажытныя часы людзі складалі розныя гісторыі, каб растлумачыць таямнічыя і незразумелыя ім з'явы, як, напрыклад, гром і маланка. Гэтыя гісторыі называюцца міфамі.

Многія міфы старажытных грэкаў былі звязаны з іх багамі. Яны думалі, што багі часта з'яўляліся на Зямлю ў выглядзе людзей. Цар багоў Зеўс громам пужаў сваіх ворагаў.

### *Як узнік свет? Паўночнаамерыканскі міф*

Калі верыць гэтаму міфу, дык свет стварыў воран. Ён кідаў камяні ў акіян, каб стварыць сушу. Потым ён стварыў дрэвы і траву, рыб, птушак і жывёл. І нарэшце, з кавалкаў гліны і дрэва ён зрабіў мужчын і жанчын.

### *Скандынаўскі міф*

Паводле старажытнага міфа, цэнтрам Сусвету было велічэзнае дрэва Ас Ігдрасіль. Дзевяць начэй аднавокі бог Одзін, магутны мудрэц і шаман, вісеў уніз галавой на гэтым дрэве і пазнаў руны — таямніцу мудрасці.

### *Беларуская міфалогія*

***Сонца.*** Стварыў Бог свет і загадаў Сонцу свяціць на добрае ўсё і на ліхое. А яно — адмовілася слугаваць ліхому і паскардзілася, што яму цяжка свяціць аднолькава дабру і злу.

Раззлаваўся Бог і пакараў за непаслухмянства Сонца. Загадаў яму свяціць толькі ўдзень, а ўночы, калі гуляюць ліхія, адпачываць.

***Гарцук.*** Гарцукі — чорныя духі. Беларусы вераць, што ў вялікіх гарах жывуць духі, падначаленыя Перуну. У час усходу і заходу сонца гуляюць па гарах як дзеці; у поўдзень стралою носяцца яны на конях па палях і лясах, а ноччу ў выглядзе розных драпежных птушак лятаюць у паветры па даручэнні Перуна. Гарцукоў, кажуць, вялікае мноства: усе яны па чарзе знаходзяцца на службе ў Перуна; возяць па небе грамавы жарон, на якім раз'язджае Пярун з вогненным лукам. Гарцукі ўтвараюць вятры, буры, віхуры і іншыя разбуральныя з'явы прыроды.

***Кузьма-Дзям'ян.*** Былі калісь кавалі. І быў тады змей, які еў людзей. І бачаць кавалі Кузьма і Дзям'ян, што ўжо скора людаед да іх дабярэцца. Вырашылі яны зрабіць «зялезную саху». Выкавалі яе, а змею сказалі, каб ён пралізаў дзверы і ўсунуў туды язык, «дык мы табе сядам на язык, ты нас і з'ясі». Але кавалі абхітрылі змея, схапілі яго за язык кляшчамі ды запраглі ў саху. «Як запраглі яго, дык аралі яны на ім лес, аралі яны луг, аралі яны поле, аралі ўсё і не давалі піць, пакуль не прыараліся к Няпру».

***Гара-гарадзішча Змяёўка.*** Аднойчы людзі заха-

целі засыпаць зямлёй забітага перуном страшыдла — змея. Але як яны ні стараліся гэта зрабіць, зямля праз ноч аказвалася раскіданай. Тады вырашылі запрэгчы ў стары лапаць чорнага пеўня і вазіць зямлю на ім. Зямлю прывозілі тройчы, і нарэшце яе хапіла для таго, каб цалкам засыпаць змея. Насыпаная гара пачала называцца Змяёўкай.

Даследчыкі тлумачаць, што ў старажытнай міфалогіі і каменная сякера, і певень з'яўляюцца якраз атрыбутамі Грамавержца, што змагаецца са сваім праціўнікам Змеем.

***Вужовы кароль.*** Жыў калісьці на нашай зямлі вужовы кароль. Хадзіў ён па-чалавечы, падпіраючыся хвастом, нібы кійком. І не было яму роўнага сярод усіх вужоў. На галаве ў караля ззяла бліскучая залатая карона, а свістаў ён такім валатавым посвістам, ажно водгулле разлягалася па Беларусі.

У даўніну людзі сябравалі з вужамі. Давалі ім прытулак, кармілі хлебам і малаком. Нікога не кусаў вуж, поўзаў па хаце, як сапраўдны гаспадар. Прысядуць людзі папалуднаваць — і ён тут як тут, цягнецца пыскаю да ежы. Здаралася, хтосьці з дзяцей не вытрымліваў, біў вужаку лыжкаю па галаве. Вуж пакрыўджана сыкаў, адпаўзаў на хвіліну і з другога боку сунуўся да міскі.

Даўней людзі верылі: калі з імі побач вуж — будзе шчасце і дастатак у хаце. А калі ён паміраў, то вельмі смуткавалі і рабілі з вужовага тлушчу свечку на ліхі дзень. Надыдзе бяда — селянін запальваў свечку. Святло ад яе разлівалася на ўсёй зямлі. Трапляла ў самыя глыбокія і цёмныя норы. Тады ўсе вужы спяшаліся на дапамогу добрым людзям. А наперадзе іх ішоў сам кароль з залатою каронаю на галаве.

І бяда адступала.

***Лёля (Ляля)***. Гэта багіня вясны. Беларусы ўяўляюць яе ў выглядзе маладзенькай, прыгожай, стройнай, высокай дзяўчыны. Святкаванне яе бывае напярэдадні Юр'я... Выбраўшы са свайго ася-

роддзя сяброўку, якая б выражала ўяўленне іх пра Лёлю, карагод беларусак адзявае яе ў доўгую, белую сукенку, перавязвае ёй шыю, рукі і стан рознай зелянінаю, а на галаву кладзе вянок з розных веснавых кветак. Дзяўчыну-Лёлю саджаюць на дзярновую лаву. На ёй з аднаго боку пастаўлены гладыш з малаком, сыр, масла, яйкі, смятана і тварог, а з другога — хлеб. Ля ног Лёлі кладуць вянкі адпаведна колькасці дзяўчат з карагода. Узяўшыся за рукі, яны танцуюць вакол Лёлі і пяюць у пахвалу ёй песню... Лёля раздае ўсім дзяўчатам па чарзе малако, сыр і г. д., пакуль, нарэшце, нічога не застаецца. Пасля гэтага дзяўчаты зноў пачынаюць танцаваць вакол Лёлі... Лёля бярэ вянкі і кідае па адным на тых, хто танцуе, пакуль усе дзяўчаты не схопяць па вянку...

## МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОТЫ[1]

### Гэта цікава ведаць

***Неразмаўляючыя продкі.*** Самыя старажытныя людзі не ўмелі размаўляць. Яны толькі выкрыквалі нейкія асэнсаваныя гукі ці простыя словы, якія дапамагалі ім мець зносіны з супляменнікамі.

***Без валасянога покрыва.*** Чалавек у адрозненне ад чалавекападобных малпаў не мае густога валасянога покрыва. Аднак вучоным не вядома, калі і чаму людзі яго страцілі і сталі «голымі».

***Першыя каменныя прылады.*** Для чаго іх пачаў рабіць чалавек? Вучоныя мяркуюць, што каменныя прылады спачатку выкарыстоўваліся для таго, каб дапамагчы старэйшым членам групы. Калі ў іх псаваліся ці выпадалі зубы і ім цяжка было перажоўваць ежу, прылады з каменю дапамагалі раздрабляць яе.

***Як знайшлі Бердыжскую стаянку.*** Беларускі вучоны Канстанцін Міхайлавіч Палікарповіч усё жыццё прысвяціў пошукам і вывучэнню першабытных помнікаў... Гэта здарылася ранняй восенню 1926 года. Канстанцін Міхайлавіч ішоў правым берагам Сожа. Затрымаўся каля крыніцы, што выцякае з вусця Паўночнага яра ля в. Падлужжа Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці. На камені побач сядзеў пастух. Паразмаўлялі аб справах, аб ураджаі, аб тым, ці няма ў акрузе цікавых знаходак... І раптам позірк вучонага спыніўся на «валуне», на якім сядзеў пастух. Гэта быў велізарны чэрап маманта, увесь залеплены зямлёй, з вачніцамі, забітымі глінай, бясформенны і зусім, на першы погляд, не адпавядаў таму, чым

---

[1] Матэрыял можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы і правядзенні ранішнікаў, фестываляў, конкурсаў-віктарын і іншых мерапрыемстваў на тэмы: «Старажытная гісторыя Беларусі ў датах і падзеях», «Духоўная культура нашых продкаў», «Таямнічае і відавочнае ў міфах Бацькаўшчыны», «Археалагічныя помнікі нашага краю», «Старажытная гісторыя ў літаратурных вобразах» і інш.

з'яўляўся. Беглы агляд схілу ракі паказаў, што гэта невыпадковая знаходка... Пастух пацвердзіў: «Так, костак тут шмат. Па вясне вадой заўсёды вымывае».

У першым жа шурфе, закладзеным на вяршыні схілу, крэмень і косткі былі знойдзены таксама. Доўгачаканае вельмі старажытнае паселішча! Значыць, чалавек жыў на тэрыторыі Беларусі спрадвеку. Стаянку назвалі Бердыжскай па вёсцы Бердыж, размешчанай адсюль за тры кіламетры.

***І ў Мінску былі мамантьі...*** На тэрыторыі сучаснага горада Мінска неаднаразова знаходзілі косці дагістарычных жывёл. Так, у 1929 г. на перакрыжаванні вуліц Слясарнай і Пуліхава на левым беразе Свіслачы пры будаўніцтве калодзежа на глыбіні 6 метраў былі выяўлены косці маманта. Прайшло амаль 50 гадоў... І вось новая знаходка. На перакрыжаванні вуліцы Харкаўскай і праспекта Пушкіна пры пракладцы водаправода на глыбіні 1,5 метра знойдзены бівень (ікал), які належаў маладому маманту. Знаходкі будаўнікоў пацвярджаюць выснову вучоных аб шырокім распаўсюджанні мамантаў у далёкім мінулым на тэрыторыі Беларусі.

***Чаму ўзніклі танцы.*** Танцы ўзніклі з імкнення людзей нешта адсвяткаваць ці ўславіць багоў. Першабытныя людзі танцавалі таксама, каб выказаць свае пачуцці або рытуальнымі танцамі дапамагчы расці ўраджаю, прынесці поспех у бойцы.

***Дзе праходзілі першыя дарогі.*** Яшчэ 5 тысяч гадоў назад дарог не існавала. Хуткасць перамяшчэння людзей залежала толькі ад іх уласнай хуткасці... Першыя дарогі праходзілі ўздоўж звярыных сцежак.

***Матыка і рала.*** Сучасныя даследчыкі правялі цікавы вопыт. Былі зроблены мадэлі старажытнай матыкі і драўлянага рала. Кожнай з прылад трэба было апрацаваць участак аднаго і таго ж памеру. У рала запраглі каня. Было ўстаноўлена, што апрацаваць участак з дапамогай рала і каня можна ў 50 разоў хутчэй, чым матыкай.



Лясны тарпан (конь), прыручаны чалавекам

***Тарпаны на Беларусі.*** У бронзавым і раннім жалезным вяках у нашых лясах вадзіліся дзікія коні — тарпаны. На старажытных паселішчах у Беларусі знойдзены косці гэтай жывёлы. Лясныя тарпаны былі меншых памераў, чым сучасныя коні. Яны мелі дужы склад цела, шэрую (мышыную) масць, чорныя грыву і хвост. Дзікі конь амаль знік у лясах да пачатку XX стагоддзя. У наш час тарпанападобныя коні завезены з Польшчы ў Белавежскую пушчу.

***Расы чалавека.*** У свеце шмат розных народаў. Людзі падзяляюцца на расы, якія ўзніклі яшчэ ў каменным веку: негроідную (чорную), еўрапеоідную (белую), мангалоідную (жоўтую).



Паляўнічыя сочаць за звярамі

У прадстаўнікоў розных рас розныя твары і склад цела. Тлумачыцца гэта тым, што ў такім абліччы людзям лягчэй было выжыць у той частцы света, дзе яны знаходзіліся.

Чорная скура, напэўна, дапамагала абараніць людзей ад сонца ў гарачых, сухіх месцах.

Людзі, якія жывуць у краінах з пахмурным надвор'ем, мелі бледную скуру. Гэта дапамагала ім атрымаць неабходныя вітаміны ад сонца.

У людзей, якія заўсёды жылі ва ўмовах холаду і марозу, вочы паступова звузіліся, абараняючыся ад холаду.

***Моўныя сем'і.*** У свеце налічваецца некалькі

тысяч розных моў і гаворак. Многія з іх паходзяць ад адной мовы. Калі якая-небудзь мова мае роднасць з іншай, то яна адносіцца да адной і той жа моўнай сям'і... Некаторыя ўсходнія мовы, такія, як, напрыклад, японская, зусім непадобныя на іншыя.

Як адбывалася распаўсюджванне моў? Калі групы людзей перасяляліся з адной часткі свету ў другую, то яны прыносілі з сабой і сваю мову. Ім даводзілася прыдумваць новыя словы для незнаёмых прадметаў, якіх яны ніколі раней не бачылі.

З цягам часу яны паступова пачалі выгаворваць старыя словы некалькі іначай. Паступова мова так моцна змянялася, што станавілася новай мовай.

## Палёт скрозь стагоддзі

Нам так хочацца паглядзець, як жылі калісьці нашы продкі — далёкія і блізкія!

На чым ляцець у мінулае? Як туды трапіць? Ці не звярнуцца нам да старога, выпрабаванага спосабу цудоўных падарожжаў — да кіліма-самалёта? Нашы продкі любілі лятаць на ім у сваіх казках. Дапусцім, што ў нас ёсць кілім-самалёт.

І вось мы ўжо ляцім. Ляцім... насустрач мінуламу. Вецер свішча ў вушах. Зоркі над намі і зоркі пад намі. Гады пралятаюць, як мінуты... Кілім-самалёт ідзе на зніжэнне. Няўжо мы на Беларусі?

***Маманты купаюцца ў Бярэзіне.*** Так, гэта Беларусь. Але такая, якой яна была дзесяткі тысяч гадоў назад, і характар мясцовасці пад намі мала нагадвае прывычныя абрысы, знаёмыя нам па сучасных картах.

Але прыгледзьцеся добра. Далёка ўнізе працягнуліся светлымі стужкамі рэкі. Вы пазнаяце іх? Нешта падобнае прыгадваецца.

Вось як быццам Дняпро і Прыпяць, Бярэзіна і Сож. А вось і Нёман, і Заходняя Дзвіна. Яны цякуць у тых жа напрамках, што і цяпер. Дняпро нясе свае воды ў Чорнае мора, Нёман і Дзвіна ў Балтыйскае. У параўнанні з Дняпром і Прыпяццю



Статак мамантаў

гэта яшчэ зусім маладыя рэкі. Але ўсе яны, і старыя, і маладыя, выглядаюць значна шырэй і магутней за цяперашнія...

Мы падлятаем бліжэй.

Цяпер нам добра відаць, што да ракі спускаецца з узвышша статак мамантаў, вялізных калматых сланоў.

Вы, зразумела, адразу пазналі гэтых карычневых волатаў. Кожны з іх не менш за тры з паловай метры ў вышыню.

Па дарозе да ракі маманты рвуць хобатамі і засоўваюць у рот пучкі густой і высокай травы, абрываюць і пяражоўваюць галінкі лазы, маладых елак, асінак і бярозак.

Каля матак мітусяцца нязграбныя малыя. Яны то адбягаюць убок, то адстаюць, то подбегам даганяюць дарослых.

Вось усе маманты падышлі да ракі і п'юць. Некаторыя з іх увайшлі ў ваду па самае бруха. Яны набіраюць ваду ў хобат і паліваюць сабе гарбатыя спіны, некаторыя купаюцца. З вады тырчаць толькі

галовы з вялікімі і доўгімі, загнутымі ўгару біўнямі...

Маманты купаюцца ў Бярэзіне! Хіба не дзіўнае відовішча?

Вось яны перапраравіліся цераз раку і выйшлі на другі бераг. Бярэзіна ў гэтым месцы хоць і шырокая, але не вельмі глыбокая, а маманты добра плаваюць.

***Здабыча першабытных паляўнічых.*** Цяпер маманты ідуць чарадою па сцежцы, пратаптанай у густым хмызняку... Куды ж прывядзе нас гэтая сцежка?

Глядзіце, яма!

Пасярод сцежкі выкапана глыбокая яма. Вакол ляжыць раскіданае сухое галлё і спарахнелыя калоды, яловыя галіны і шышкі, шматкі травы і моху.

Спынім наш кілім. Ён жа можа вісець у паветры нерухома на патрэбнай вышыні, зусім як сучасны верталёт.

На зямлі каля ямы ляжаць усюды косці, і малыя, і вялікія. Усе яны старанна абгрызены, ачышчаны ад мяса, нібы адпаліраваныя.

На дне ямы тырчыць тоўсты завостраны кол, чорны ад засохлай крыві. Ляжаць рэшткі нейкай вялікай тушы.

Што ж тут адбылося? Хто ж гэта ўваліўся ў яму і загінуў, працяты калом?

А гэта што? Цяпер усё зразумела.

Яму выкапалі людзі. На зямлі відаць сляды іх босых ног.

Вунь і зламанае кап'ё ляжыць — дрэўка з абчасанай палкі, наканечнік з каменю.

Людзі выкапалі яму пасярод сцежкі для таго, каб злавіць буйнога звера — мамантa, зубра ці насарога. Зверху яны замаскіравалі яму жэрдкамі, галлём, травой і мохам.

Вось нейкая буйная жывёліна і праваліліся ў яму, стала здабычай першабытных паляўнічых.

Людзі разабралі тушу і цяпер, мабыць, кормяцца ёю. Яны прыходзяць сюды, да ямы, і бяруць

рацца, назапашвацца. Праца чалавека не была такой складанай, як цяпер. Таму на вучэнне адводзілася ў людзей нямнога часу. І ўсё ж вучыцца трэба было і тады.

Каб высачыць звера, каб вырабіць шкуру, каб пабудаваць хаціну, каб зрабіць каменны нож — для гэтага патрэбна было ўменне, патрэбна было майстэрства.

А адкуль бярэцца ўменне? Чалавек не нараджаецца майстрам, ён майстэрству вучыцца. Вось тут і бачна, як далёка пайшоў чалавек ад жывёлы...

Канешне, і жывёлы нейкія навыкі ці звычкі пераймаюць у бацькоў. Але ні аб якой школе тут гаварыць нельга.

Іншая справа — чалавек. Ён сам робіць свае прылады. Ён не нараджаецца з гэтым уменнем. Значыць, і ўменне валодаць прыладамі ён атрымлівае не па спадчыне ад бацькі з маці, а ад настаўнікаў і старэйшых па працы...

Людзі не нараджаюцца з гатовымі навыкамі. Яны вучацца і вучацца, і кожнае пакаленне дабаўляе нешта ад сябе ў агульную кладоўку чалавечага вопыту. Вопыт усё расце і расце.

Чалавецтва ўсё далей адсоўвае граніцы свайго няведання.



Апрацоўка глебы ралам



Спосаб лепкі гаршка з гліны



Апрацоўка крэменю

Школа-тысячагодка — школа працы — зрабіла чалавека тым, што ён ёсць, дала яму і навуку, і тэхніку, і мастацтва, дала яму ўсю культуру.

У школу-тысячагодку чалавек паступіў яшчэ ў каменным веку. Старыя, вопытныя паляўнічыя абучалі юнакоў цяжкаму мастацтву палявання: вучылі іх разбірацца ў слядах, якія звер пакідае на зямлі, паказвалі, як трэба падысці да звера, каб яго не спужаць.

У наш час паляванне таксама патрабуе ўмення. І ўсё ж цяпер лягчэй быць паляўнічым хаця б таму, што паляўнічым не даводзіцца самім рабіць сваю зброю. А ў каменным веку паляўнічыя самі рабілі свае даўбенькі, нажы, наканечнікі для рагацін. Тут стары майстар шмат чаму мог навучыць маладога.

Для жаночай працы таксама патрэбны навыкі. Жанчыне даводзілася быць адразу і хатняй гаспадыняй, і архітэктарам, і дрывасекам, і шаўцом, і ганчаром.

У кожнай чалавечай ардзе (родавай абшчыне) былі старыя, спрактыкаваныя мужчыны і жанчыны, якія перадавалі маладым вопыт свайго шматгадовага працоўнага жыцця.

## Вераванні першабытнага чалавека

Назіраючы змену дня і ночы, пораў года, жыццё раслін і жывёл і многае іншае, першабытны чалавек не мог зразумець гэтыя з'явы. Незразумелыя і грозныя з'явы прыроды, хваробы, смерць замацоўвалі ў свядомасці нашых далёкіх продкаў трывогу і жах. Пастутова ў людзей пачалі нараджацца ўяўленні аб звышнатуральных сілах, быццам бы здольных выклікаць гэтыя з'явы. Гэта і было пачаткам рэлігійных уяўленняў...

***Татэмізм.*** Адной з самых ранніх форм рэлігіі быў татэмізм — уяўленне, што ўсе члены аднаго роду паходзяць ад пэўнай жывёлы — татэма. Татэмам лічылася расліна ці які-небудзь прадмет. Людзі верылі, што яны непарыўна звязаны са сваім татэмам. Па іх уяўленню татэмная жывёла, калі яна таго пажадае, можа ператварыцца ў чалавека. Прычыну смерці бачылі ў ператварэнні чалавека ў татэма. Жывёла, якая лічылася татэмам, была свяшчэннай — яе забаранялася забіваць. З цягам часу татэмную жывёлу дазвалялася забіваць і есці, але галаву, сэрца і пячонку выкарыстоўваць у ежу забаранялася. Забіваючы татэма, людзі прасілі ў яго прабачэння ці імкнуліся ўскласці віну на другога. Перажыткі татэмізму сустракаюцца ў рэлігіях многіх народаў старажытнага Усходу. У старажытным Егіпце, напрыклад, шанавалі быка, шакала, казла, кракадзіла і іншых жывёл. З глыбокай старажытнасці і да сучаснасці ў Індыі свяшчэннымі жывёламі лічаць тыграў, малпаў, кароў... Калі аўстраліец належаў да татэма кенгуру, дык ён гаварыў аб гэтай жывёле: «Гэта мой брат». Род, які належаў да татэма лятучай мышы ці жабы, называлі родам Лятучай мышы, родам Жабы.

***Магія.*** Другой формай першабытнай рэлігіі была магія, ці вядзьмарства. Гэта была вера ў тое, што чалавек быццам можа ўздзейнічаць на прыроду рознымі «цудадзейнымі» прыёмамі і заклінаннямі. У пячоры Мантэспан, адкрытай у 1923 годзе на Пірэнеях, знойдзена вылепленая з гліны фігура



Выява бізона, прабітага стрэламі,— магічны вобраз, які павінен быў забяспечыць поспех на паляванні

Танцы і заклінанні, якія спрыялі, паводле ўяўленняў першабытных людзей, удачы на паляванні і ў іншых справах



мядзведзя без галавы. Фігура мае шмат круглых дзірак. Верагодна, гэта сляды дроцікаў. Вакол фігуры мядзведзя на глінянай падлозе захаваліся адбіткі босых чалавечых ног. Падобная знаходка была выяўлена ў пячоры ў Францыі. Там знойдзены дзве гліняныя скульптуры бізонаў (блізкіх да зуброў), а вакол іх бачны таксама адбіткі босых ног.

Вучоныя мяркуюць, што ў гэтых пячорах першабытныя паляўнічыя здзяйснялі магічныя танцы і заклінанні, каб заваражыць жывёл. Яны верылі, што заварожаная жывёла сама дазволіць забіць сябе. Такія ж магічныя абрады рабілі і паўночнаамерыканскія індзейцы... Напярэдадні палявання на бізонаў на працягу некалькіх дзён яны выконвалі магічныя скокі — «танец бізона». Удзельнікі танца, трымаючы ў руках зброю, надзявалі на сябе бізонавыя шкуры і маскі. Танец адлюстроўваў паляванне. Час ад часу адзін з танцораў рабіў выгляд, што ён падае, калі іншыя кідалі ў яго бок стрэлы ці дзіды. Калі такім чынам «забівалі» бізона, усе акружалі яго і, размахваючы нажамі, рабілі выгляд, быццам здымаюць з яго шкуру і дзеляць на часткі тушу.

***Анімізм.*** Паступова развівалася новая форма рэлігіі — культ прыроды... Чалавек стаў шанаваць сонца, зямлю, ваду, агонь. Усю прыроду чалавек у сваім уяўленні насяляў духамі. Гэта форма рэлігійных уяўленняў называецца анімізмам (ад лацінскага слова «анімус» — дух). Сон, непрытомнасць, смерць першабытныя людзі тлумачылі выхадам духа (душы) з цела. З анімізмам звязаны вера ў загробнае жыццё і культ продкаў. Аб гэтым гавораць пахаванні: разам з нябожчыкам у магілу клалі яго асабістыя рэчы — упрыгажэнні, зброю і запасы ежы. Па ўяўленню першабытных людзей гэтыя рэчы павінны служыць нябожчыку ў яго замагільным жыцці...

Словы «дух» ці «душа» ва ўяўленні першабытных людзей звязваліся з адушаўленнем усёй прыроды. Паступова развіваліся рэлігійныя ўяўленні аб

духах зямлі, сонца, грому, маланкі, расліннасці. Пазней на гэтай глебе ўзнік міф аб паміраючых і ўваскрасаючых багах.

## Міфы Беларусі

***Бялун.*** Нашым продкам гэта імя было добра вядома. «Пасябрыўся з Белуном» — народная прымаўка адзначае — разбагацеў.

Менавіта гэта (добрае) бажаство служыла за галоўнага, вярхоўнага бога. Мы прызвычаіліся да таго, што ў нашай міфалогіі самы галоўны — Пярун. Але ягоным бацькам падаецца Бялун. Калі ж тады з'явіўся Бялун?

Паводле паданняў, Бялун любіць прыходзіць на палеткі падчас жніва. Верагодна, ён упершыню «завітаў» да нашых далёкіх продкаў, калі яны пакінулі пастухоўскі лад жыцця і пачалі займацца земляробствам. Магчыма, гэта здарылася ў той час, калі нашы продкі ўваходзілі ў індаеўрапейскую сям'ю і называліся арыямі. Слова «белы» паходзіць ад старажытнаіндыйскага слова, якое мае значэнне «бляск, зіхаценне».

***Каза.*** На Каляды шчадроўнікі «вадзілі казу». Можна меркаваць, што ў старадаўні беларускі абрад калядавання яна трапіла невыпадкова.

Верагодна, самая першая «роля» казы — ахвяра. Прынамсі, такое меркаванне ўзнікла ў даследчыкаў пры знаёмстве з побытам і культурай першабытных земляробаў, што жылі за некалькі тысячагоддзяў да нашай эры ў міжрэччы Тыгра і Еўфрата ў Месапатаміі.

Цалкам верагодна, што «каза лупленая» — гэта згадка пра ахвяраванні нашых прашчураў таго часу, калі яны займаліся пастырствам, калі ў іх гаспадарцы пераважала жывёлагадоўля.

Але паступова, пераходзячы да земляробства, нашы продкі мянялі «функцыю» казы.

Паводле грэчаскага міфа, каза карміла сваім малаком галоўнага бога грэчаскага язычніцкага пантэона — Зеўса, які, калі вырас і стаў магут-

ным, зрабіў яе рог «рогам, з якога ўсяго многа». У Старажытнай Грэцыі таксама, пачынаючы з II тысячагоддзя да нашай эры, сярод простага люду быў распаўсюджаны культ Дыяніса — бога, які апекаваў раслліннасць. Яго ўяўлялі пераважна ў выглядзе казла. З-пад нагі (ці капыта) Дыяніса мог «пырснуць» струмень віна ці малака.

Падобную моц мае і каза, якую водзяць нашы беларускія шчадроўнікі:

Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць,
Дзе каза хвастом, там жыта кустом,
Дзе каза нагою, там жыта капою...

Вядома, сама каза такія чарадзействы зрабіць не магла. Яна, калі можна так сказаць, была нейчым увасабленнем, вестуном, верагодна, самага старэйшага бога нашых прашчураў — бога Рода. Толькі ён, апякун земляробства і расліннасці, мог забяспечыць сваім прыхільнікам багаты плён — «жыта капою».

***Ваўкалак (ваўкалака, пярэварацень)***, г. зн. чалавек, ператвораны кім-небудзь ці які ператварыўся сам сабою, па свайму жаданню ў ваўка.

Беларусы думаюць, што ў ваўкалака не ўсё цела пакрыта поўсцю, а толькі месцамі, так што дзенідзе відаць цела чалавечае. На думку беларусаў, ёсць два віды ваўкалакаў. Да першага адносяцца ваўкалакі-знахары, да другога — няшчасныя ахвяры, ператвораныя ў ваўкоў: першых вельмі баяцца, а другіх шкадуюць.

Паводле ўяўленняў беларусаў, ваўкалакі-знахары засвойваюць звярыныя звычкі, робяцца драпежнымі і крыважэрнымі, як і сапраўдныя ваўкі, нават больш драпежнымі, таму што яны не столькі нападаюць на хатнюю жывёлу і душаць яе, колькі на людзей, асабліва маладых і пераважна дзяцей, аднак не ядуць іх, а толькі высмоктваюць з іх кроў і мозг, як расамахі, думаючы тым амаладзіць сябе...

Зусім інакш глядзяць у Беларусі на ваўкалакаў другога віду, г. зн. на ахвяр знахарскіх ператва-

рэнняў. Кажуць, што гэтыя ваўкалакі зусім ручныя, як хатнія жывёлы,— выюць вельмі жаласна ці па-воўчы, ці па-сабачы, а часта глуха стогнуць, як цяжкахворыя людзі, таму што, нягледзячы на ператварэнне ў ваўкоў, яны не трацяць чалавечых пачуццяў і нават у некаторай ступені свядомасці. З выгляду гэтыя ваўкалакі — зусім як ваўкі, толькі большай часткаю бываюць аднавокія і нават сляпыя на абодва вокі.

У стане ператварэння бедныя ахвяры бываюць па некалькі дзён, месяцаў і нават гадоў, але ніколі — усё жыццё: гэтага, кажуць беларусы, не можа зрабіць знахарская моц.

***Нячысцікі ў нераце.*** Гэта здарылася ў Беларускім Паазер'і. Прыехалі небаракі рыбакі на возера.

Закінулі нерат і, ужо цягнучы яго, пачулі шоргат пад лёдам, сыканне і піск нейкі дзікі, нібыта там тысячы гадаў біліся між сабой. Агарнулі рыбакоў трывога і страх, мурашкі па целе пабеглі. Аднак, трымаючыся разам, не выпусцілі з рук нерат, цягнуць, надаючы адзін аднаму адвагі ды мяркуючы, што трапілася сціжма ўюноў. А як выцягнулі з вады ўвесь нерат — страх успомніць — поўная сецъ маленькіх нячысцікаў. Крый Божа такіх і ў сне бачыць! Былі там нячысцікі накшталт ракаў з чорнаю поўсцю, іншыя, як павукі, кожны з ката, іншыя падобныя да шчанюкоў, з нагамі незвычайнай даўжыні. Няможна апісаць усё гэтае страхоцце. Пацукі, яшчаркі, кажаны, краты поўзалі па лёдзе, качаліся па снезе з жахлівымі крыкамі, сыканнем і піскам. Даўмеліся рыбакі, што натрапілі на д'яблава кубло. Не маючы сілы глядзець на страшыдлаў, пакінулі нерат, а самі паўцякалі.

***Змееў камень.*** Непадалёку ад вёсак Коўтава і Гогалеўкі, пры старой дарозе, што вядзе ад Віркаў да Ігры, ляжыць Змееў камень, у якім ёсць акно і дзверы.

Старыя людзі расказваюць, што калісьці ў гэтым камені жыў аднагаловы змей. З выгляду — зусім як



Нячысцікі — фантастычныя істоты ў нераце

чалавек, нават гаварыць умеў па-чалавечы. І не было ў ваколіцы лепшага за яго краўца. Прынясуць людзі сукно, пададуць праз акно і просяць:

— Пашый, майстрок, абы надзець...

Змей такую абноўку справіць — на любое ігрышча не сорамна паказацца. За сярмягу грошы прыносілі. Змей не злаваўся, калі плацілі мала, усяго некалькі капейчын...

І сталася так, што змей-прыгажун закахаўся ў дзяўчыну. Яна жыла ў вёсцы Бузер'і. Доўга хавалася дзяўчына ад страшыдла. Але ўрэшце скарылася і пайшла за яго замуж. Шмат хто з людзей бачыў — абернецца змей у дугу і ляціць над Лукомльскім возерам. Упадзе на зямлю — абернецца ў чалавечае аблічча. І такі прыгажун...

Аднойчы пасвіла дзяўчына ў нядзельку свінні на полі. Прыляцеў да яе змей, сабраў свіней у адзін статак і кажа:

— Пагладзь мяне па галаве, а я адпачну. Ды пільнуй, каб навальнічную хмару не нацягнула...

Лёг і заснуў. Мінула некалькі гадзін, і раптам насунулася вялізная хмара. «Дакуль я буду слугаваць яму? — падумала дзяўчына.— Няхай спіць — пагляджу, што будзе...» — і не стала будзіць змея.

Бліснула маланка, загрукаў гром. І толькі ён пракаціўся па небе,— прачнуўся змей. Падхапіўся, як апараны, з зямлі і крычыць:

— Зжыла ты мяне са свету!

І з усяе сілы пляснуў яе па дзявочым твары. На ўсё жыццё памятка засталася, так і памерла, няшчасная, з чорнай пяцярнёй на шчацэ. А сам змей перакуліўся ў дугу і паляцеў праз возера да сваёй каменнай хаціны.

Далёка не адляцеў — смальнуў па пярэваратню пярун. Так смальнуў, аж навокал усё затрэслася. А змею — хоць бы што. Калі змей быў пасярэдзіне возера, яшчэ мацней уперыў па ім пярун. І страшыдла, перакінутае ў дугу, шабультыхнула ў возера. Але ненадоўга, праз хвіліну-другую акрыяла: выхапілася з вады і далей ляціць.

Адзін стары чалавек з Бузер'я сваімі вачыма бачыў гэтае дзіва. Ён і падказаў людзям, што змей пераляцеў праз возера. Да каменнага жытла рукою падаць, калі па паганцу трэці раз пацэліў пярун. Тут і прыйшоў лятучаму гаду канец.

— Шукайце яго ў полі,— параіў дзецюкам стары.

Пакуль дзецюкі шукалі страшыдлу, тры дні і тры ночы не аціхаў дождж. Нарэшце знайшлі, закапалі гада ў зямлю. Дождж адразу спыніўся. Разышліся дзецюкі па хатах, а праз дзень з неба зноў лье, як з вядра. Прыбеглі на поле — ляжыць змей наверсе.

Мо тры ці чатыры разы закопвалі гада, а ён усё роўна выходзіў з-пад зямлі і кожны раз усё бліжэй аказваўся да свайго каменнага жытла. Бывалыя людзі казалі: каб пастаяла надвор'е, змей ажыў бы. Але тады якраз задажджыла — штодня грымелі навальніцы, паўсюль паднялася дужа вялікая вада.

Потым таму бузерскаму старому прыснілася, што трэба склікаць малых дзяцей і папрасіць іх насіць у прыполіках пясок на паганае страшыдла. На дапамогу малым прывялі жарабят з прывязанымі да шыі торбамі. Мо з тыдзень цягалі яны пясок і засыпалі-такі гада. Больш ён не паказваўся.

І да сённяшняга дня на змеевай магіле стаіць курган.

***Кадук.*** Гэта страшэнная пачвара. Ні чалавек, ні звер, але больш падобны на звера з вялізнай калматаю галавою і шырокаю, ледзь не да вушэй, пашчаю. Як выскаліцца, хочаш не хочаш, а спруцянееш: здаецца, праглыне цябе разам з касцьмі і вантробамі.

Людзі, злуючыся, часам кажуць: «Каб Кадук яго ўзяў!» Альбо: «Вазьмі яго Кадук»...

Кадук не заўсёды бярэ, бо мае сілу толькі ў ліхую хвіліну, што выпадае на ўсходзе сонца, у поўдзень і поўнач.

Напэўна людзей зусім не засталося б, каб гэтая пачвара магла прыходзіць, калі ёй уздумаецца. Кадук не мае ўлады над чалавекам, а чакае, пакуль хтосьці яго пакліча. І прыбягае ён у такі ліхі момант, калі, што ні папросіш,— усё збудзецца.

***Баба-Яга.*** Баба-Яга — злая чараўніца, якая робіць уночы рознае паскудства і пра якую гаво-

рыцца, што яна «ў ступе ездзіць, таўкачом паганяе, а памялом след замятае».

***Вадзянік.*** Вадзяніка просты народ уяўляе ці старым дзедам, у якога барада па калена, ці паўчалавекам, ці паўрыбаю. Вадзянік можа ператварыцца хоць у якую рыбіну. Пад вадою ў Вадзяніка ёсць цудоўны палац, з якога ён у пэўны час дня і ночы выходзіць на дно рэк і азёр, і тут у якім-небудзь віры альбо завадзі чакае здабычы. Ратаваць тапельца — гэта значыць адбіраць здабычу ў Вадзяніка, баяцца, каб не ўгнявіць дзядулю Вадзяніка. Купальшчыка Вадзянік часта хапае за ногі і стараецца яго заліць. Асабліва небяспечна купацца і лавіць рыбу, на думку сялян, апоўдні і апоўначы. Тапельніц Вадзянік ператварае ў русалак.

У багністых мясцінах, на думку народа, Вадзянік мае выгляд гарбатага і барадатага старога з нагамі і хвастом, як у каровы; небяспечна гуляць па лясным балоце ва ўладаннях гэтага Вадзяніка. Вадзянік паказваецца людзям то ў вадзе, то паблізу вады, то ў выглядзе шэрай пачвары на карачках.

Вадзянікі далёка ад свайго месца жыхарства не адыходзяць, людзей палохаюць гучным рогатам і моцным пляскannем у далоні, з таго, хто заблудзіць, яны смяюцца.

***Вазіла.*** Вазіла — конскі апякун. Беларусы ўяўляюць яго ў чалавечым абліччы з конскімі вушамі і капытамі, у чалавечым адзенні... Кожны гаспадар мае свайго Вазілу, які клапоціцца пра размнажэнне коней і засцерагае ад хвароб і прыпадкаў. Вазіла, кажуць, большую частку жыве ў конскіх хлявах, а таксама заўсёды прысутнічае на начлегах, калі коні пасуцца вялікімі табунамі... Пастухі... звычайна забіваюць на месцы начлегу вялізны шэст і надзяваюць на яго конскі чэрап, спадзеючыся, што гэта сімвалічная выява Вазілы выратуе табун ад усіх магчымых небяспек.

Беларусы асабліва паважаюць Вазілу за тое, што ён нібыта ноччу прывозіць на сабе нейкую асаблівую траву і падмешвае яе ў корм коням, ад якой тыя дужэюць і растуць...

у рэчцы, у якім-небудзь глыбокім віры. На бераг русалкі выходзяць рэдка, а калі і вылазяць, то далёка ад вады не адыходзяць. Яны заманьваюць да сябе падарожных мужчын, якіх больш за ўсё прываблiваюць прыгажосцю, і стараюцца заказытаць. Ад няма чаго рабіць русалкі смяюцца з рыбакоў: блытаюць іх сеткі, выцягваюць нерат на бераг...

***Чур.*** Чур — бажаство родавае, продак, роданачальнік, які і пасля смерці «радзее» свайму роду і ахоўвае яго членаў ад усялякай нячыстай сілы. Таксама азначае — правесці рысу вугалем, крэйдаю ці чым-небудзь іншым на зямлі ці на падлозе, за якую, згодна з павер'ем, ніякая нячыстая сіла не можа перайсці... Чур, відаць, лічыўся ахоўнікам родавых уладанняў, ён не дазваляў іншым духам пранікаць за рысу, за сваю мяжу...

«Чур мяне!» — гаворыць беларуская дзяўчына, калі да яе чапляецца які-небудзь нахабнік, гэта значыць — «не чапай мяне», уласна заклік да Чура, каб абараніў яе. «Чур табе на язык!» — «замаўчы», просьба, каб Чур прымусіў замаўчаць. «Чур маё!»; «Чур разам ці папалам!» — у гэтых выразах Чур з'яўляецца абаронцам правоў уласнасці. Вытворны дзеяслоў ад Чура — «чурацца» — значыць пазбягаць, выракацца, чужацца. Другая форма слова «чур» — гэта шчур, ад слова прашчур — роданачальнік, продак, што цалкам адпавядае міфу пра бога Чура.

***Ярыла.*** Гэта малады, прыгожы юнак, ён раз'язджае на белым кані... і ў белым плашчы; на галаве яго вянок, у руках каласы, ногі босыя. Ярыла — бог урадлівасці і кахання. У Юр'еў дзень Ярыла па загаду маці адмыкае вароты неба і на белым кані прыязджае на зямлю, а з яго ўзнікненнем пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты ж дзень упершыню выпускаюць скаціну ў поле. І ў наступныя дні, да канца красавіка, беларусы ўшаноўваюць Ярылу. Яшчэ нядаўна святкаванне яго суправаджалася карагодам, песнямі. Дзяўчаты выбіраюць самую прыгожую, прыбіраюць яе Ярылам і садзяць на белага каня. Ярылу акружаюць не

толькі дзяўчаты, а ўсе жыхары паселішча, старыя кіруюць карагодам, а ў кожнага з прысутных вянок са светлых кветак. Ярыла едзе па засеяных нівах, а карагод спявае песні, дзе паказана, як народ разумее Ярылу, як той спрыяе ўрадлівасці зямлі.

## Дзіцячы фальклор

Старажытнейшым відам народнай паэзіі з'яўляюцца заклічкі да сонца. Нашы славянскія продкі называлі сябе дзецьмі сонца. З цягам часу магічны сэнс заклічак быў страчаны, і яны зберагаліся толькі ў дзіцячым фальклоры.

### *Заклічкі да сонца*

Свяці, свяці, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
Пад хатаю седзячы,
Лусту хлеба дзяржачы...
Сонейка, сонца,
Выгляні ў аконца,
Пасвяці нам трошкі,
Дам табе гарошку.

### *Божая кароўка*

Божая кароўка,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода?
Пень ці калода?
Пагода — ляці,
Дождж — сядзі.
Божая кароўка,
Паляці на небка
Прынясі нам хлебка,
Чорнага і белага,
Толькі негарэлага.

## Этнаграфічныя даведкі

***Сёмуха.*** На Беларусі са старажытных часоў спраўлялі шмат вяселляў звычайна на свята, якое звалася Сёмуха. Яно адзначалася ў канцы вясны, перад пачаткам летніх палявых работ, 13 мая па старому стылю (пазнейшая назва «тройца»). Сёму-



Промыслы людзей

**Заданне да малюнка.** Адкажыце на пытанні: *Для чаго перагароджвалі невялікія рэкі? Колькі такіх перагародак на малюнку? Куды вязе на лодцы рыбак снасць — буч?* (Гл. «Этнаграфічныя даведкі».) *На каго палюе чалавек з лукам? Чаго чакае ў лодцы сабачка? Як лавілі птушак з дапамогай сетак?*

ха — старажытнае земляробчае свята. Вытокі свята ў родаплемянным грамадстве. У аснове свята быў культ зеляніны, шлюбу і продкаў. Перад святам прыбіралі і ўпрыгожвалі хату і двор галінкамі і дрэўцамі бярозы, клёну, рабіны, дубу. У суботу прыбіралі магілы.

Напярэдадні свята спраўлялі «дзяды» — памінальны абрад. У час свята «завівалі» бярозку, ладзілі гульні, карагоды, плялі вянкі, потым было агульнае частаванне. Спявалі сёмушныя (траецкія) песні пра каханне і шлюб.

Свята Сёмуха дагэтуль захоўвае рысы язычніцтва і земляробчага культу.

***Культ продкаў.*** Словы «культ продкаў» у дадзе-

ным выпадку азначаюць служэнне бажаству і звязаныя з гэтым абрады. Культ продкаў — гэта рэлігійнае шанаванне памерлых бацькоў і ўсіх родзічаў. Ён развіваўся ў нашых далёкіх продкаў як сямейны культ у часы распаду родавага ладу. Звязаны з першабытнымі вераваннямі і ўяўленнямі аб прашчурах як ахоўніках роду, нашчадкаў, усёй гаспадаркі.

Перажыткі і сляды культу продкаў захаваліся ў беларускіх святкаваннях, напрыклад Радаўніцы і іншых пахавальных абрадах і звычаях. З культам продкаў звязаны міфалагічны вобраз дамавіка як духа-ахоўніка хатняга ачага.

***Дзяды.*** Славяне, як і іншыя народы, з глыбокай старажытнасці шанавалі памяць пра сваіх родзічаў. Памінальны абрад, або рытуальная вячэра, у памяць памерлых родзічаў у беларусаў называецца «дзяды». Паходзіць ад язычніцкага звычаю трызны і звязаны з культам продкаў. Дзяды спраўлялі ў пэўныя дні, 3—4 і больш разоў на год, вясною і ўвосень. Галоўнымі былі дзяды змітраўскія (асяніны). Яны прыходзіліся на суботу перад Змітравым днём (26 кастрычніка). На дзяды гатавалі святочныя і абрадавыя стравы. Абавязковай была няцотная колькасць страў (7—13), у тым ліку куцця, бліны, клёцкі, яечня, мяса. Паводле звычаю, ад кожнай стравы адкладвалі ў асобны посуд ежу і пітво для нябожчыкаў.

***Буч*** — традыцыйная рыбалоўчая прылада, якая плялася з дубцоў і мела конусападобную форму. На Беларусі яшчэ былі назвы — *вярша* і *кош*. У бучы мелася адна лейкападобная перагародка (горла). Рыба пранікала ў буч праз лаз у горле, якое адначасова перашкаджала выходзіць ёй назад. З буча ўлоў вымалі праз адтуліну ў вузкім яго канцы, якую на час лоўлі закрывалі травой, сенам. У вадаёме буч устанаўлівалі пры дапамозе калкоў, часам сумесна з езамі.

***Ез*** — загарода на мелкаводных рэчках, якой перагароджвалі шлях рыбе. Будаваліся ў выглядзе частакольных платоў, плятнёў і інш. У адтулінах

загароды ставілі рыбалоўныя пасткі бучы і інш. Выкарыстоўвалі пераважна вясной, калі рыба са спадам вады вярталася з залітых лугоў і заток. Ез быў пашыраны на Беларусі з вельмі старажытных часоў.

З а д а н н е. На малюнку (с. 160) знайдзіце буч і ез.

### Карысныя парады юным аматарам археалогіі

Беларусь багатая на археалагічныя помнікі: стаянкі, гарадзішчы, селішчы, курганы. Яшчэ многія пакаленні археолагаў будуць старанна іх вывучаць...

Для чаго гэта патрэбна? Ці не ўсё роўна, як і дзе жыў чалавек каменнага веку, на якіх звяроў паляваў, як вырабляў свае прылады працы? Хіба ж нам у наш атамны век вучыцца ў першабытных людзей, як апрацоўваць камень, ці верыць забабонам, якія тады ўзнікалі.

Давайце ўявім сабе сучаснага чалавека, які не ведае, калі і дзе ён нарадзіўся, забыўся сваіх бацькоў, не ведае ніводнага блізкага родзіча, не памятае, чаму ён вучыўся, што ведаў, як жыў, чым займаўся. Горкі лёс такога чалавека. Гэткі лёс напаткаў бы ўсё чалавецтва, калі б яно забылася пра свой гістарычны вопыт, сваё мінулае.

Дваццатае стагоддзе з усім тым, што яно прынесла, падрыхтавана дзевятнаццатым, дзевятнаццатае — васемнаццатым, а ля вытокаў усёй гісторыі стаяць першабытныя людзі. Яны сваёй працай, сваім жыццём закладвалі асновы нашага сучаснага сусвету.

Археалогія нязмерна пашырыла гістарычны гарызонт. Дзякуючы археалагічным даследаванням стала вядома дагісторыя чалавецтва, якая яшчэ параўнальна нядаўна была кнігай за сям'ю пячаткамі...

Кожнае адкрыццё ў археалогіі — гэта вынік напружанай працы многіх даследчыкаў і тых, хто ім



**Вучні Заслаўскай сярэдняй школы ўдзельнічаюць у археалагічных раскопках (1968 г.)**

дапамагае. Першымі памочнікамі археолагаў з'яўляюцца краязнаўцы — настаўнікі і вучні мясцовых школ.

Цяжка пералічыць усе тыя археалагічныя помнікі, якія раскопваліся ў апошнія 70 гадоў у Беларусі, і колькі гарадскіх і сельскіх школ удзельнічала ў гэтым.

Кожны чалавек можа дапамагчы вучонаму-археолагу даследаваць археалагічны помнік. Гэта вельмі карысная для навукі справа. Але, на жаль, бываюць выпадкі, калі людзі праводзяць самастойныя раскопкі. Такая дзейнасць прыносіць шкоду і для навукі. Асабліва часта знішчаюцца такім чынам пахавальныя курганы.

Першае асноўнае правіла, якое павінен выконваць аматар-археолаг,— гэта ніколі не раскопваць самому ніякіх археалагічных помнікаў. Краязнаўцы, якія самавольна раскопваюць курганы, каб

здабыць некалькі старажытных прадметаў для школьнага краязнаўчага кутка, прыносяць шкоду археалогіі і сапраўднаму навуковаму вывучэнню гісторыі свайго роднага краю, бо помнік, які яны «раскапалі», назаўсёды загінуў для навукі.

У нашай краіне надаецца вялікая ўвага справе аховы гістарычных помнікаў. У 1966 годзе створана «Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры», асноўнай мэтай якога з'яўляецца ахова гэтых помнікаў, выкарыстанне іх у інтарэсах народа і навукі. Многія археалагічныя помнікі ўзяты на ўлік. Іх наўмыснае псаванне і знішчэнне караецца законам.

Чым жа займацца юным аматарам археалогіі, апрача аховы старажытных помнікаў? Яны могуць збіраць звесткі аб археалагічных помніках свайго сельсавета, раёна, горада. У час падарожжаў па роднаму краю карысна было б наведаць гарадзішчы, курганы, пра якія можна даведацца ў мясцовага насельніцтва, устанавіць іх дакладнае месцазнаходжанне. Кожны помнік трэба апісаць, сфатаграфаваць, змераць вышыню насыпаў, валоў, глыбіню і даўжыню равоў, сабраць рэчы, якія могуць аказацца на паверхні. Немалую карысць уяўляюць паданні, звязаныя з тым ці іншым археалагічным помнікам. Іх трэба падрабязна запісваць.

Неабходна ўважліва абследаваць месцы, дзе былі выпадкова знойдзены косці маманта. Магчыма, побач сустрэнуцца крамянёвыя адшчэпы ці прылады працы. Не выключана, што акажуцца і рэшткі першабытнай стаянкі. Аб усіх сваіх адкрыццях неабходна паведаміць у Нацыянальную Акадэмію навук.

У гістарычных кутках многіх школ можна ўбачыць каменныя сякеры і іншыя старажытныя рэчы, якія знайшлі і прынеслі школьнікі. Але далёка не заўсёды можна даведацца, дзе, калі і хто знайшоў тую ці іншую рэч. Такія знаходкі губляюць для навукі сваю каштоўнасць, перастаюць быць гістарычнымі крыніцамі. Адкуль можна даведацца, з якога месца рэч? Можа, яе прывёз хто ў школу за

Бронзавыя бранзалеты, якія ўжывалі праславянскія плямёны прыкладна 3000 гадоў назад, выпадкова знойдзеныя каля в. Здзітава Бярозаўскага раёна на Брэстчыне



сто ці трыста кіламетраў? Вось чаму на кожным прадмеце абавязкова трэба напісаць тушшу назву населенага пункта, дзе ён знойдзены. Звычайна ў школах кажуць: «Дык мы і так ведаем, якая рэч дзе знойдзена». Але не ўсё сваё жыццё вучні вучацца, а настаўнікі працуюць у гэтай школе. А рэчы, калі яны трапілі ў школьны гістарычны куток, павінны захоўвацца заўсёды.

Трэба завесці спецыяльны сшытак для рэгістрацыі экспанатаў. У ім кожная рэч павінна быць замалявана і падрабязна апісана: дзе (урочышча, вёска, раён), пры якіх умовах (на полі, на ўборцы бульбы, пры капанні калодзежа і г. д.), кім і калі яна знойдзена.

Асабліва сумны лёс звычайна бывае ў грашова-рэчавых скарбаў. Манеты разыходзяцца па руках, а гаршчок часцей за ўсё разбіваецца і выкідваецца. Між тым для навуковага даследавання мае значэнне кожная манета і кожная рэч, якія ў ім знаходзіліся.

Існуе справядлівы выраз: «Археалагічных помнікаў няма там, дзе іх не шукаюць». Калі вы, сябры, зацікавіцеся такімі помнікамі, дык абавязкова знойдзеце іх у сваім раёне, сельскім савеце і нават побач са школай. Шукайце і беражыце такія помнікі. Яны складаюць бессмяротны летапіс нашага народа.

Аб усіх вашых знаходках, аб помніках, якія вы адкрылі, аб пытаннях па старажытнай гісторыі Беларусі, якія ў вас узніклі, пішыце ў Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, які знаходзіцца ў Мінску.

**Да «Уводзін».** Гісторыя, якую нельга чытаць без рыдлёўкі (Штыхаў Г. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968. С. 3—7).

**Да «Уводзін».** Сярод дзікіх аўстралійцаў (Детская энциклопедия: В 9 т. М., 1967. Т. 8. С. 20, 21).

**Да «Уводзін».** Крыніца ведаў пра дзяцінства чалавецтва (Детская энциклопедия. Т. 8. С. 24).

**Да § 1.** Вялікае абледзяненне (Левков Э. В недрах земли белорусской. Мн., 1964. С. 45).

**Да § 1.** Паляўнічыя-качэўнікі каменнага веку (Олифант Маргарет. Древние цивилизации. М., 1994. С. 12—13).

**Да § 1.** Здабыванне агню (Властелин темного леса: Историко-приключенческие повести. М., 1994. С. 25).

**Да § 1.** Крэмень (Чарняўскі Міхась. З глыбінь тысячагоддзяў. Мн., 1978. С. 31).

**Да § 2.** Бердыж (Чарняўскі Міхась. Страла Расамахі. Мн., 1985. С. 18—19).

**Да § 3.** Паляванне (Терехин С. Ф. Охота в Белоруссии. Мн., 1986. С. 10).

**Да § 3.** Збіральніцтва дароў прыроды (Чарняўскі Міхась. Страла Расамахі. С. 26).

**Да § 3.** Прыгатаванне ежы (Маккорд Анна. Доисторическая жизнь. М., 1996. С. 87).

**Да § 3.** Як рабілі адзенне (Маккорд Анна. Там жа).

**Да § 4.** Перадача вопыту (Детская энциклопедия. Т. 8. С. 25—26).

**Да § 4.** Сэнс выхавання дзяцей (Зыбковец В. Ф. Человек без религии. М., 1967. С. 205, 217).

**Да § 5.** Здабывальнікі крэменю (Штыхаў Г. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968. С. 34—38).

**Да § 6.** Гурток і яго важак (Маўр Янка. Чалавек ідзе. Мн., 1989. С. 20—21, 40).

**Да § 6.** Праабшчына і род (Амальрик А. С., Монгайт А. Л. Что такое археология. М., 1966. С. 89).

**Да § 6.** Апавяданні пра выхаванне (Матюшин Г. М. Археология в школе. М., 1964. С. 92).

**Да § 6.** Апошні ледавік (Левков Э. В. В недрах земли белорусской. С. 45, 48).

**Да § 7.** Бронзавы век вызначаюць пацеркі (Штыхаў Г. Галасы далёкіх продкаў. С. 38—41).

**Да § 7.** Плямёны бронзавага веку (Чарняўскі Міхась. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Мн., 1981. С. 4, 5).

**Да § 8.** Паселішча (Чарняўскі Міхась. Вогнепаклоннікі. Мн., 1989. С. 49—51).

**Да § 11.** Звычай абнаўлення агню на Палессі (Цярохін С. Ф. Перунова цяпельца. Мн., 1993. С. 18—19).

**Да § 12.** Помнікі каля вёскі Чаплін (Штыхаў Г. Ажываюць сівыя стагоддзі. Мн., 1982. С. 15).

**Да § 13.** Міфы народаў свету (Эллиотт Д., Кинг К. Детская энциклопедия. М., 1996. С. 90, 91).

**Да § 13.** Беларуская міфалогія (Міфы Бацькаўшчыны /Укл. У. А. Васілевіч. Мн., 1994. С. 22, 47; Наша слова. 1995. № 12; Зайкоўскі Э. М. Першабытныя помнікі паўночнай Беларусі. Мн., 1990; Вужовы кароль: Беларускія легенды і паданні. Мн., 1996. С. 5, 109).

**Да «Матэрыяла для арганізацыі пазакласнай работы»:** Гэта цікава ведаць (урыўкі з розных публікацый, адапціраваныя Г. В. Штыхавым); Палёт скрозь стагоддзі (Вольскі Віталь. Кніга падарожжаў: Выбранае. Мн., 1971. С. 16—26); Школа-тысячагодка (Ильин М., Сегал Е. Как человек стал великаном: Пособ. для учащихся. М., 1994. С. 65—67; Вераванні першабытнага чалавека (Детская энциклопедия. Т. 8. С. 29, 30); Міфы Беларусі (Міфы Бацькаўшчыны/Укл. У. А. Васілевіч. С. 15—64; Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 104, 105; Заклятыя скарбы: Беларускія легенды і паданні. Мн., 1992. С. 12—14, 23, 24); Дзіцячы фальклор (Беларускі каляндар 1991 г./Пад рэд. А. Л. Петрашкевіча. Мн., 1991. С. 88, 91); Этнаграфічныя даведкі (Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 280, 461); Карысныя парады юным аматарам археалогіі (Штыхаў Георгій. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968. С. 101—105).

## СПІС ГІСТАРЫЧНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ І НОВЫХ СЛОЎ[1]


Абледзяненне 1
**Абрад** 11, 12
Аббіўка каменю У
Абрадавыя песні 11
Адсталыя народы У
Адшчэп крэменю 1
Арнамент 13
Археалагічны помнік У
**Археалогія** У
Арыі 10
Аселае жыццё 4
**Балты** 7, 10
**Бронзавы век** 7, 8
Бортніцтва 5
Бубен 13
Будан 2, 4
Бурштын 13
Вераванні 11
Верацяно 8
Верхнедняпроўская група плямён 6
Войны 9
Ворыўнае земляробства 8
Востраканечнік 1
**Вытворчая гаспадарка** 8
Вясельны абрад 12
Гарадзішча 9
Гарпун 5
Геаграфічныя назвы 10
Гістарычны помнік У
**Гісторыя Беларусі** У
Гліняны посуд 4
Громныя стрэлкі 11
Гуканне вясны 11
Дары прыроды 3
Днепра-данецкая група плямён 6
Днепра-дзвінскія плямёны 7
Дзіда (кап'ё) 1, 3
Дроцік 3
Дудка 13
**Жалезны век** У
Жалейка 12, 13
**Жывёлагадоўля** 8
Зарубінецкія плямёны 7
**Збіральніцтва** 3, 4
Звычай 11, 12
Зерняцёрка 4
**Індаеўрапейская сям'я моў** 10
**Індаеўрапейцы** 10
**Калектыўная ўласнасць** 6
Каляды 11
**Каменны век** 1
Краязнаўчы музей У
Краманьёнец 2, 6
Крэмень 1
Крыца 7
Культ камянёў 11
Культурны слой У
Купалле 11
Купель 12
Курган 12
Ледавік 1
**Ледавіковы перыяд** 1, 3
**Лета-літоўцы** 10
Лодка (човен) 5
Лук 4
Лунніца 13
Лыка 5
Ляда 8
**Лядна-агнявое земляробства** 8
Маёмасць 9
Мамант 3
Масленіца 11
Мастацтва 13
Мілаградскія плямёны 7
**Міфалогія** 13
Музей У
Музычныя інструменты 13
Нарвенская група плямён 6


[1] Заўвагі: а) выдзеленыя паняцці маюць светапоглядное значэнне, і вучні павінны не толькі іх ведаць, але і ўмець прымяняць; б) усе астатнія паняцці і новыя словы маюць тлумачальнае значэнне, і ад вучняў патрабуецца разуменне іх сэнсу; в) лічба, што стаіць побач, указвае нумар параграфа, а літара У — уводзіны.

Неандэрталец 1
Нёманская група плямён 6
Новыя людзі 2
Падсека 8
**Паляванне** 3
Папуасы У
**Пасляледавіковы перыяд** 4, 5
Патрыярхальная сям'я 9
Пахавальны абрад 12
Першабытнаабшчынны лад 6
Племя 6
Плямёны культуры штрыхаванай керамікі 7
**Племянная знаць** 9
Пляценне 5, 8
Пострыг 12
Праабшчына 6
Прадзенне 8
**Прарадзіма славян** 10
Праславяне 10
Праслiца для верацяна 8
Прашчуры У
Промыслы 5
Прылады працы 1
Радовішча крэменю 1
**Раздзяленне працы** 3
Рала 8
Ранні жалезны век 3, 7
Род 6
**Родавая абшчына** 6
Родаплемянны лад 6
Руда 7
Рыбалоўства 5
Свідраванне 7
Серп 8
Скрабок 1, 2
Скульптура 13
Скрэбла 1
**Славяне** 10
Старэйшына 6
Статуэтка 13
Стаянка 2, 4
Страла 4
**Спажывецкая гаспадарка** 5
Супольнасці людзей 6
**Суседска-родавая абшчына** 9
Сякера 4
Сям'я 9, 12
Ткацкі станок 8
Ткацтва 8
Тэрыторыя 1
Умыканне 12
**«Чалавек разумны»** 1, 2
Шарсцісты насарог 3
Шахты 5
Шахцёр 5
Шлюбна-сямейныя адносіны 12
**Этнаграфія** (этналогія) У
Эмаль 13
Яма-лавушка 3

# ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

**Штыхаў Г. В. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968.**

Расказваецца аб захапляючых пошуках і незвычайных знаходках беларускіх археолагаў, аб паселішчах, якія даўно зніклі, аб падзеях, што адбываліся калісьці на землях Беларусі.

**Штыхаў Г. В. Ажываюць сівыя стагоддзі. Мн., 1982.** Раздзел «Нямыя сведкі гісторыі».

Юны чытач пазнаёміцца са шматлікімі археалагічнымі раскопкамі помнікаў ранняга жалезнага веку, у якіх прымалі ўдзел многія школьнікі Беларусі, з тым, як цікава праходзілі паходы па роднаму краю.

**Васілевіч У. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.**

У кожнага народа спрадвеку вёўся свой каляндар. У ім з пакалення ў пакаленне перадаваліся мудрасць, вопыт жыццёвых назіранняў, веды. Сабраныя пад адной вокладкай у кнізе, яны гучаць, як сапраўдная народная паэма. Да нас быццам даносяцца галасы продкаў з глыбокай мінуўшчыны.

## КНІГІ ДА І РАЗДЗЕЛА

**Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мн., 1992.**

Кніга прысвечана мінуламу, сучаснаму і будучыні беларускіх камянёў-валуноў. Іх прынёс на тэрыторыю Беларусі ледавік з-за далёкага Балтыйскага мора. Валуны дапамагалі разгадаць розныя таямніцы прыроды. Ні ў аднаго славянскага народа не захавалася столькі легенд і паданняў пра валуны, як у беларусаў. У звычайных беларускіх камянях сышліся разам прырода, гісторыя і культура.

**Маўр Я. Чалавек ідзе. Мн., 1989.**

Аповесць напісана ў форме цікавай экскурсіі ў глыбіню вякоў, калі чалавек робіць першыя крокі на світанку сваёй гісторыі.

**Чарняўскі М. М. Страла Расамахі. Мн., 1985.**

Кніжка прызначана для юных чытачоў. У выглядзе кароткіх нарысаў расказваецца пра розныя здарэнні і падзеі з жыцця людзей каменнага веку: авалоданне агнём, паляванне, рыбалоўства, развіццё земляробства і жывёлагадоўлі. Нарысы напісаны на падставе археалагічных даследаванняў. Кніга мае цудоўныя ілюстрацыі.

**Чарняўскі М. М. З глыбінь тысячагоддзяў. Мн., 1976.**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццё чалавека на тэрыторыі Беларусі ў каменным веку, яго заняткі, побыт, вераванні, матэрыяльную культуру.

**Калечыц А. Г. Першыя людзі на зямлі Беларусі. Мн., 1997.** (Раздзел: «У гасцях у далёкіх продкаў».)

Дзе жылі першабытныя людзі, чым займаліся, якія мелі прылады працы, на якіх жывёл палявалі, чым харчаваліся

і на многія іншыя пытанні знойдзе адказ тут чытач. У кнізе шмат ілюстрацый.

**Караткевіч У. Зямля пад белымі крыламі: Нарыс. Мн., 1992.** (Раздзел «Праз дым стагоддзяў».)

Размова вядзецца пра прыроду нашай краіны, яе жывёльны і раслінны свет, пра фальклор і этнаграфію, пра сівую мінуўшчыну і сённяшні дзень.

### КНІГІ ДА II РАЗДЗЕЛА

**Ненадавец А. М. Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993.**

У кнізе прапануюцца артыкулы, прысвечаныя пакланенню людзей дрэвам і камяням, вужам і гадзюкам. Тут змешчаны аповеды пра Перуна і жывых прадвеснікаў лёсу: пеўня, зязюлю, крумкача і інш.

**Чарняўскі М. М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Мн., 1981.**

У кнізе на аснове археалагічных раскопак старажытных помнікаў апавядаецца пра першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі ў эпоху з'яўлення першых металаў, распаўсюджання земляробства і жывёлагадоўлі.

**Чарняўскі М. М. Вогнепаклоннікі. Мн., 1996.**

У папулярных нарысах расказваецца аб жыцці старажытных людзей, прыладах працы, земляробстве, жывёлагадоўлі, зараджэнні духоўнай культуры.

**Чарняўскі М. М. Старонкі гісторыі. Неўры, гуты, балты, славяне** (у навукова-папулярным выданні «Эўрыка») **М., 1992.**

У нарысе расказваецца пра археалагічныя культуры бронзавага і ранняга жалезнага вякоў на Беларусі, сувязі старажытнага насельніцтва Беларусі з жыхарамі іншых краін Еўропы, паходжанні назваў плямён на тэрыторыі нашай краіны.

**Фядосік А. С., Пятроўская Г. А. Народная спадчына. Мн., 1984.**

Кніга-зборнік казак, легенд, прымавак, песень беларусаў.

**Пятроўская Г. А. Жывая спадчына. Мн.,** 1988.

Расказваецца, як складаліся звычаі і абрады беларусаў, даецца апісанне народных свят і абрадаў гадавога кола (зіма, вясна, лета, восень) і сямейнай абраднасці.

**Дрэва кахання: Легенды, паданні, сказы/Склад. А. І. Гурскі. Мн., 1993.**

У зборнік увайшлі беларускія легенды, паданні, вусныя сказы, у якіх адлюстроўваюцца нацыянальныя рысы жыцця народа, яго светапогляд.

**Міфы Бацькаўшчыны/Склад. У. А. Васілевіч. Мн., 1994.**

У кнізе паказаны народныя ўяўленні аб старажытных багах, нячысціках, якімі насяляў калісьці беларус сваё жыллё, гаспадарчыя пабудовы, наваколле і ўвесь сусвет. Прыводзіцца шмат вобразаў самабытнай беларускай міфалогіі.

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ

| | |
|---|---|
| 100—35 тыс. гадоў назад | Першыя пранікненні неандэртальцаў («чалавек разумны») на тэрыторыю Беларусі |
| 26 тыс. гадоў назад | Стаянка каменнага веку каля в. Юравічы на Прыпяці (Калінкавіцкі раён) |
| 23 тыс. гадоў назад | Стаянка каля в. Бердыж на Сожы (Чачэрскі раён) |
| Каля 2000 г. да н. э. | Заканчэнне каменнага веку і пачатак бронзавага веку на Беларусі |
| Каля 700 г. да н. э.— 500 г. н. э. | Жалезны век на Беларусі |
| Каля 500 г. н. э. | Пачатак сярэдніх вякоў |

## ЗМЕСТ

Слова да вучняў . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Асаблівасці падручніка . . . . . . . . . . . . . 4
Як вывучаць гісторыю . . . . . . . . . . . . . 5
Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Раздзел I

КАМЕННЫ ВЕК НА БЕЛАРУСІ
(100 — 2 тыс. гадоў да н. э.)

Тэма 1. **Гэта было ў каменным веку** . . . . . . . 20

§ 1. Чалавек у ледавіковы перыяд . . . . . . . —
§ 2. Першыя стаянкі людзей і іх побыт . . . . . 23
§ 3. Заняткі старажытных жыхароў Беларусі . . 27

Тэма 2. **Жыццё ў пасляледавіковы перыяд** . . . . 31

§ 4. Засяленне Беларусі . . . . . . . . . . . —
§ 5. Гаспадарчая дзейнасць нашых продкаў . . 35
§ 6. Супольнасці людзей каменнага веку . . . . 40

*Паўтаральна-абагульняючы ўрок да раздзела I* . . . 44

Раздзел II

ЖЫХАРЫ БЕЛАРУСІ Ў БРОНЗАВЫМ
І ЖАЛЕЗНЫМ ВЯКАХ
(каля 2 тыс. гадоў да н. э.— 500 год н. э.)

Тэма 3. **Ад спажывецкай гаспадаркі да вытворчай** 49

§ 7. Роля металаў у жыцці старажытных людзей —
§ 8. Пераход да вытворчай гаспадаркі . . . . . 55
§ 9. Ад родавай да суседскай абшчыны . . . . . 62

Тэма 4. **Набыткі культуры нашых продкаў** . . . . . 67

§ 10. Мова нашых продкаў . . . . . . . . . . —

§ 11. Народныя вераванні і святы . . . . . . . . 72
§ 12. Бытавыя звычаі і абрады . . . . . . . . . 77
§ 13. З'яўленне мастацтва . . . . . . . . . . . 83

*Паўтаральна-абагульняючы ўрок да раздзела II* . . . . 89
*Выніковa-абагульняючы ўрок да ўсяго курса* . . . . . 93
Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . 95

**МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ЧЫТАННЯ** . . . . . . . . . . . 98

Матэрыял для арганізацыі пазакласнай работы . . . . 133
Выкарыстаная літаратура . . . . . . . . . . . 166
Спіс гістарычных паняццяў і новых слоў . . . . . . 168
Літаратура для пазакласнага чытання . . . . . . . 170
Асноўныя даты па гісторыі Беларусі старажытных часоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172

Вучэбнае выданне

**Штыхаў** Георгій Васільевіч
**Пляшэвіч** Уладзімір Канстанцінавіч
**Фядута** Валянціна Уладзіміраўна

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ**

Падручнік для 5 класа
агульнаадукацыйнай школы
з рускай і беларускай мовамі навучання

2-е выданне

Рэдактар *Л. А. Цімафеева.* Афармленне мастакоў *В. А. Макаранкі, Р. С. Фралова.* Мастацкія рэдактары *Р. С. Фралоў, Л. А. Дашкевіч.* Тэхнічныя рэдактары *С. І. Ліцкевіч, М. І. Чаплавоцкая.* Карэктары *В. С. Бабеня, С. Т. Асташэвіч.*

Падпісана ў друк з дыяпазітываў 07.03.2001. Папера афсетная № 1. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 11+ +0,25 форз. Умоўн. фарба-адбіт. 44,63. Ул.-выд. арк. 8,49+0,43 форз. Тыраж 99 500 экз. Заказ 642.

Падатковая льгота — Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98, ч. 1; 22.11.20.100.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 4 ад 08.09.2000. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа». 220600, Мінск, Чырвоная, 23.

# БРОНЗАВЫ ВЕК



# ЖАЛЕЗНЫ ВЕК



**Перыяд,**
**калі паяўляюцца**
**вырабы з медзі**
**і бронзы.**
**На Беларусі пачаўся**
**каля 2000—**
**1800 гадоў да н. э.**

**Перыяд у гісторыі**
**чалавецтва,**
**калі людзі**
**навучыліся**
**здабываць жалеза.**
**На Беларусі пачаўся**
**каля 700 года да н. э.**